

Калі паражэнне – не падстава для смутку...

СТАР. 2



“Палескія рабінзоны” зноў на экранах!

СТАР. 3



Незабыўныя подзвігі юных партызанаў

СТАР. 5

Родная газета на роднай мове
# ЗВЯЗДА
Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
24 МАЯ 2014 г. СУБОТА № 95 (27705) Кошт 1800 рублёў
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

# МАЛАДАЯ МОЦ КРАІНЫ

## Высокі ўзровень адукацыі і творчы патэнцыял асобы — нашы найважнейшыя каштоўнасці

**Аб гэтым кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка заявіў на сустрэчы з навучэнцамі — пераможцамі міжнародных прадметных алімпіяд, творчых конкурсаў і фестываляў, стыпендыятамі спецыяльных фондаў Прэзідэнта па сацыяльнай падтрымцы адораных навучэнцаў, студэнтаў і таленавітай моладзі, паведамляе БЕЛТА.**



Фота БЕЛТА.

«Вы ведаеце, якую мэтанакіраванасць трэба мець, каб у патрэбны момант сабрацца, выйсці наперад, перамагчы. І гэта ўменне не раз спатрэбіцца вам у жыцці, бо на вас ўскладаюцца самыя вялікія надзеі. У нашай краіне да маладых талентаў асаблівае стаўленне. Высокі ўзровень адукацыі, творчы патэнцыял асобы — нашы найважнейшыя каштоўнасці, — сказаў Прэзідэнт. — Менавіта па вашых поспехах судзяць аб тым, якія нацыянальныя навуковыя школы эфектыўна развіваюцца, у якіх сферах наша краіна мае высокі патэнцыял».

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што многія гады беларускія школьнікі стабільна займаюць вядучыя пазіцыі па матэматыцы, фізіцы, інфарматыцы, хіміі, біялогіі — па тых вучэбных прадметах, якія вызначаюць фундамент навукі. Так, за апошнія пяць гадоў навучэнцы з Беларусі сталі ўладальнікамі 27 медалёў рознай вартасці па матэматыцы, 23 — па фізіцы, 19 — па інфарматыцы, 16 — па хіміі, 12 — па біялогіі.

Паводле слоў Прэзідэнта, дзяржпраграма па падтрымцы таленавітай моладзі, якая дзейнічае ў Беларусі не адзін год, прыносіць свае вынікі: больш за 250 спецыялістаў, якія займаюць кіруючыя пасады ў розных арганізацыях, былі стыпендыятамі і лаўрэатамі спецфондаў Прэзідэнта. За апошнія тры гады прадстаўнікі таленавітай моладзі абаранілі 114 кандыдацкіх і 6 доктарскіх дысертацый. «На ўсю краіну вядомыя імёны тых, хто звярнуў на сябе ўвагу неардынарным талентам і велізарнай працавітасцю, — адзначыў кіраўнік дзяржавы. — Сёння ўсе яны працуюць на карысць Беларусі. Гэта людзі годныя, але яны не спачываюць на лаўрах, бо перад імі стаяць адказныя задачы, таму і попыт з іх асаблівы — яны служаць прыкладам і арыенцірам для тых, хто ідзе ўслед за імі».

«І вам яшчэ шмат чаго трэба зрабіць: завяршыць адукацыю, вызначыцца з выбарам прафесіі. Але я ўпэўнены, што ўжо ў недалёкай будучыні вы будзеце прадстаўляць нашу навуку, умела і аператыўна ўвасабляць перадавыя ідэі і тэхналогіі ў практыку, узнімаць на новыя вышыні нашу нацыянальную культуру», — сказаў Прэзідэнт, звяртаючыся да ўдзельнікаў сустрэчы.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што ў Беларусі дзяржава робіць усё, каб можна было шчасліва жыць пад мірным небам і развіваць свае таленты, не ведаючы жахаў вайны. Пры гэтым Прэзідэнт заклікаў не забываць урокаў гісторыі. «Бо ўсё, што мы маем цяпер, і ўсё тое добрае, што створым у будучыні, аплачана дарагой цаной», — сказаў ён.

«Любіце Беларусь, цаніце яе і ганарыцеся ёю, беражыце яе незалежнасць і суверэнітэт, — пажадаў маладым людзям Прэзідэнт. — Яна перадаецца ў вашыя рукі. Вучыцеся прыкмячаць тое добрае, што ёсць вакол вас. Гэта паслужыць вам крыніцай натхнення для новых адкрыццяў і перамог. І няхай побач з вамі заўсёды будуць надзейныя сябры, клапатлівыя настаўнікі і бацькі, цікавыя і разумныя кнігі».

Асобныя словы ўдзячнасці за поспехі моладзі Прэзідэнт адрасаваў педагогам. «Менавіта асоба настаўніка фарміруе жаданне вучыцца і ствараць», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка ўручыў пасведчанні, нагрудныя знакі і дыпломы навучэнцам і студэнтам — лаўрэатам спецыяльных фондаў Прэзідэнта Беларусі, уладальнікам залатых медалёў міжнародных алімпіяд, першых месцаў міжнародных конкурсаў і фестываляў, фіналістам дзіцячага тэлевізійнага конкурсу «Я спяваю!».

# СВОЙ СЯРОД СВАІХ



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Жыхар Шаркаўшчыны Валерый Кавалёнак (на фота) гадаваўся ў вёсцы на ўскраіне самага вялікага ў Еўропе балотнага масіва Ельня. Мужчына прызнаецца, што матухна-прырода была амаль што яго калыскай. Таямнічы свет жывёл і птушак ён спазнаваў з самага маленства.**

**Ён і цяпер застаецца «сваім» сярод насельнікаў дзікай прыроды, чым, уласна кажучы, і карыстаецца як фатограф-натураліст і адзін з удзельнікаў прыродаахоўных акцый па кальцаванні птушак. Некалькі гадоў таму Валерый Кавалёнак атрымаў ганаровы статус захавальніка тэрыторыі, важнай для птушак, — балота Ельні.**

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Анатоль ТОЗІК, намеснік прэм'ер-міністра:**

***«Навучэнцы ПТВ і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў паказалі на конкурсе WorldSkills International высокі клас. Больш чым па 20 намінацыях яны атрымалі залатыя і сярэбраныя медалі за майстэрства ў прафесіі. Для перамогі ім трэба было прадэманстраваць веданне сучаснай тэхнікі, уменне працаваць на вытворчасці з інавацыйнымі тэхналагічнымі працэсамі, валодаць праграмным кіраваннем, наогул быць суперкампетэнтнымі ў сваёй прафесіі. Мы плануем паказаць на міжнародных спаборніцтвах у Бразіліі, якія пройдуць у 2015 годзе, найлепшы вынік. Нашы хлопцы і дзяўчаты дакажуць, што для таго, каб насіць пачэснае імя рабочага, трэба мець розум, сэрца і залатыя рукі».***

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 24.05.2014 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 10060,00 | ▲ |
| Еўра | 13730,00 | ■ |
| Рас. руб. | 293,00 | ■ |
| Укр. грыўня | 843,96 | ▲ |

■ Жыллё

# СТАЛІЧНЫЯ ПАКУПНІКІ ЧАКАЮЦЬ ЗНІЖАК

## Паводле прагнозаў спецыялістаў, да жніўня мінская жыллёвая нерухомасць патаннее яшчэ на 3-5%

**Практычна штогод у апошні месяц сезона ўдзельнікі другаснага рынку сталічнага жылля пасля доўгіх ваганняў пачынаюць набываць уласныя «куточкі». Так было ў мінулыя гады. Сёлета такі алгарытм актыўнага «варушэння» патэнцыяльных пакупнікоў ужо не працуе. Чаму? Зрабіць аналіз сітуацыі ў жыллёвай сферы сталіцы карэспандэнту «Звязды» дапамагае наш пастаянны эксперт — кіраўнік агенцтва «БепЦТН», старшыня рады Беларускай асацыяцыі «Нерухомасць» Мікалай ПРАСТАЛУПАЎ.**



### КЛІЕНТЫ ЗАСТАЮЦЦА «НА НІЗКІМ СТАРЦЕ»

Спадар Прасталупаў адзначае, што за апошнія тры месяцы на рынку працягваецца пастаяннае павелічэнне колькасці прапаноў усіх відаў кватэр. Так здарылася, што сёння прапанова перавышае рэальны попыт у некалькі разоў. Гэта і не дзіўна, бо ў сталічных каталогах па продажы жылля налічваецца ўжо больш як 8300 кватэр. Такой вялікай колькасці прапаноў не было ў Мінску на працягу 5-7 гадоў. І апошнім часам сітуацыя тут не мяняецца. Нельга казаць, што другасны рынак увогуле спыніўся — не, асобныя здзелкі ажыццяўляюцца ў тым ці іншым сегменце жыллёвай нерухомасці, а вось агульнай хвалі сапраўднай актывізацыі пакупнікоў няма.

СТАР. 5

■ Узровень

# МНЕ НЕ БАЛЮЧА!..

**У медыкаў Мінскай абласной дзіцячай клінічнай бальніцы свая спецыфіка дапамогі маленькім пацыентам, сярод якіх шмат нованароджаных, немаўлят. Тут вельмі важна своечасова паставіць дакладны дыягназ, прызначыць правільнае лячэнне.**



Фота Любові БЯЛЯЕВАЙ.

Пяцігадовую Кацю з Пухавіцкага раёна даставілі ў Мінскую абласную дзіцячую клінічную бальніцу ў цяжкім стане: перытаніт. Дзяўчынка перанесла дзве аперацыі.

— Цяпер гэтая прыгажуня праходзіць у нас рэабілітацыю і абследаванне на магчымае развіццё спаечнай хваробы, — гаворыць **загадчык хірургічнага аддзялення Аляксандр НІКУЛЕНКАЎ.** — Самае страшнае мінула, дзяўчынка ідзе на папраўку.

Сапраўды, Каця — бялявая, кучаравая дзяўчынка — весела гуляе з сябрамі па палаце, разглядвае з мамай малюнкі ў кніжках, вучыцца чытаць. Дзякуючы ўрачам яна пойдзе ў школу здаровай і не ўспомніць пра ўсе непрыемнасці, што перанесла.

У двухпакаёвай палаце ляжаць два хлопчыкі: малодшы Арцём з Чэрвеньскага раёна і сямікласнік Улад з Лагойшчыны.

— У мяне «лопнуў» апендыцыт, было вельмі балюча. Цяпер значна лепш, але ўрач не дазваляе есці ўсё без разбору. Толькі паравое, дыетычнае, бярозавы сок, — кажа Арцём.

— Наш пацыент ідзе на папраўку, нават дадому просіцца. Але ранавата яму яшчэ выпісвацца, — смяецца ў адказ Аляксандр Уладзіміравіч і працягвае: — А вось ва Улада хранічнае захворванне вялікай правай галёначнай косткі. Хвароба сур'ёзная, звычайна яна характэрная для падлеткаў. Хлопец ужо ў другі раз у нашым аддзяленні: у 2012 годзе перанёс аперацыю. Цяпер жа шпіталізаваны планава, праходзіць комплекснае лячэнне.

— За апошнія гады шмат змянілася ў лячэнні дзяцей. Перш за ўсё — рэспубліканская канцэпцыя аказання дапамогі, — расказвае Аляксандр Нікуленкаў. — Цяпер аперацыі дзецям імкнуцца праводзіць не на ўзроўні раёнаў, а ў спецыялізаваных установах. Напрыклад, у нашым аддзяленні пры апендыцыце каля 85% аперацый, у тым ліку з ускладненнямі, робяцца з дапамогай лапараскапіі, без разрэзаў. Гэта дазваляе дзіцяці лягчэй перанесці пасляаперацыйны перыяд і болевы сіндром. Пры такім метадзе меншая верагоднасць нагнаенняў і спаек брушной поласці.

СТАР. 2

# ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

## РАСІЯ НЕ ПАШЛЕ НАЗІРАЛЬНІКАЎ НА ВЫБАРЫ ВА УКРАІНУ

Расія не будзе адпраўляць афіцыйных назіральнікаў на выбары прэзідэнта Украіны, заявіў журналістам кіраўнік адміністрацыі расійскага прэзідэнта Сяргей Іваноў.

Адказваючы на пытанне аб прызнанні вынікаў галасавання з боку Расіі, Іваноў адказаў, што гэта будзе залежаць ад таго, як і дзе яны пройдуць. «Галоўнае — не выбары, не каго абяруць, а што далей будзе, якая будзе канстытуцыйная рэформа. Па логіцы, вядома, спачатку лепш зрабіць так, што ўсе людзі, якія ідуць да выбарчых урнаў, разумелі, што іх чакае далей. Не хто будзе ўзначальваць, а што будзе з краінай далей», — сказаў Сяргей Іваноў.

Раней кіраўнік камітэта Дзярждумы па справах СНД Леанід Слуцкі паведаміў, што ў Маскве да гэтых выбараў «вельмі своеасаблівае стаўленне». На яго думку, складана назваць выбарамі «мерапрыемства, у якім не ўдзельнічаюць многія рэгіёны краіны».

Прэзідэнцкія выбары ва Украіне прызначаны на 25 мая. Сярод кандыдатаў у лідары краіны, па апошніх сацыялагічных апытанняў, лідзіруе Пятро Парашэнка. З вялікім адрывам за ім ідзе Юлія Цімашэнка.

## ЭКС-ПРЭМ'ЕР ТАЙЛАНДА ІНГЛАК ЧЫНАВАТ ЗАТРЫМАНА. МЕСЦА ЯЕ ЗНАХОДЖАННЯ ПАКУЛЬ НЕВЯДОМА



Тайландскія ваенныя, якія напярэдадні ўзялі на сябе кіраванне дзяржавай, у пятніцу затрымалі былога прэм'ер-міністра краіны Інглак Чынават, паведамляе брытанская тэлерадыёкарпарацыя Бі-бі-сі.

Таксама былі затрыманы і некаторыя члены сям'і экс-прэм'ера, гаворыцца ў паведамленні. Пра месцазнаходжанне затрыманых асоб пакуль не паведамляецца, адзначае Бі-бі-сі. Раней у пятніцу тайландскія ваенныя склікалі членаў звергнутага кабінета міністраў, а таксама лідараў раней кіруючай партыі «Пхыа Тхаі». Акрамя ключавых фігур былога ўрада Тайланда, былі таксама скліканы прадстаўнікі апазіцыйных партый. Ваеннае камандаванне Тайланда абвясціла ў чацвер аб увядзенні каменданцкай гадзіны на ўсёй тэрыторыі краіны, а таксама аб прыпыненні дзеяння канстытуцыі Тайланда. Ваенны ўрад узначаліў камандуючы сухапутнымі войскамі Прают Чан-Оча, які абвясціў сваёй задачай вяртанне да стабільнасці ў краіне.

ISSN 1990 - 763X
14095>
9 771990 763008

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

## АНДЖЭЛІНА ДЖОЛІ МОЖА ПАЙСЦІ Ў ПАЛІТЫКУ



Адна з самых прыгожых актрыс Галівуда Анджэліна Джолі паведаміла, што не супраць зрабіць яшчэ і кар'еру палітыка, паведамляюць інфармагенцтвы.

38-гадовая актрыса, якая таксама вядомая сваёй дабрачыннай дзейнасцю, заявіла ў нядаўнім інтэрв'ю, што магла б паспрабаваць сябе на палітычнай ніве. Галоўнае, каб яе праца прыносіла карысць і была эфектыўнай. Аднак Джолі не ўпэўнена ў тым, наколькі сур'ёзна яе будуць успрымаць у ролі «жалезнай лэдзі».

Анджэліна Джолі і раней выказвалася аб магчымасці ўдзелу ў палітычным жыцці. Аднак пры гэтым адзначала, што яе мінулае недастаткова чыстае для палітычнай фігуры. Джолі таксама прыадкрыла таямніцу маючага адбыцца вяселля з Брэдам Пітам. Актрыса не назвала дату ўрачыстасці, але паведаміла, што гасцям будзе прапанавана згуляць у пейнтбол.

## КОРАТКА

Юбілейным медалём у гонар 70-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне ў Беларусі ўзнагародзяць амаль 70 тыс. чалавек. Адпаведны ўказ кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка падпісаў 22 мая. Адзіны юбілейны медаль «70 год Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне 1941—1945 гг.» зацверджаны рашэннем Савета кіраўнікоў дзяржаў СНД ад 25 кастрычніка 2013 года.

Forbes паставіў Мінск на першае месца ў рэйтынгу гарадоў былога СССР, камфортных для вядзення бізнесу. На другім знаходзіцца Талін, на трэцім — Вільнюс. Алматы і Астана размясціліся на чацвёртым і пятым месцах, адпаведна.

У Беларусі з пачатку 2014 года на рэалізацыю паступіла 125 транспартных сродкаў, канфіскаваных за паўторнае на працягу года кіраванне ў стане ап'янення. Сярод іх — 105 легкавых аўтамабіляў, 3 грузавікі, 4 трактары, 4 мапеды, 3 матацыклы, 2 мотаблокі, 1 пагрузчык, 1 матаролер, 1 снегаход, 1 веласіпед з падвесным рухавіком.

# ПЕРАМОГА ЧЭХАЎ І ФІЯСКА РОДАПАЧЫНАЛЬНІКАЎ ХАКЕЯ

IIHF 2014 WORLD CHAMPIONSHIP BELARUS Minsk

## У паўфіналах чэмпіянату свету не будзе прадстаўнікоў Паўночнай Амерыкі

**Чвэрцьфіналы на сёлетнім чэмпіянаце не прынеслі буйных сенсацый. Зборная Францыі, напэўна, выканала сваю праграму максімум на турніры і не здолела на роўных змагацца з расіянамі. Упершыню ў гэтым матчы хлопцы Алега Знарка закінулі ўжо на 4-й хвіліне, а яшчэ дзве шайбы закідвалі па чарзе ў другім і трэцім перыядах. Матч на «Чыжоўка-Арэне» паміж ЗША і Чэхіяй аказаўся больш напружаным. Амерыканцы наогул мелі перавагу ў ліку, але прапусцілі чатыры разы запар. Праўда, не здаліся і на апошніх хвілінах скарацілі адставанне да адной шайбы. Але чэхі вытрымалі, перамаглі 4:3 і прайшлі далей.**



— Гэта была хуткая гульня, і нам дапамагло тое, што мы здолелі тройчы рэалізаваць кольнасную перавагу, — прызнаўся карэспандэнту «Звязды» **легендарны Ярамір ЯГР, нападаючы зборнай Чэхіі.** — Напрыканцы лік стаў 4:1 на нашу карысць. Каманда крыху расслабілася і ў выніку прапусціла. Гэта хакей. Ён за гэта наказвае. Гэта ўрок для маладых. Трэба заўжды гуляць да фінальнай сірэны. Так, нам прыйшлося пахваляцца на апошняй хвіліне. Мы самі дазволілі саперніку закінуць.

***— Як вам, дарэчы, чэмпіянат у беларускай сталіцы?***

— Ведаеце, я дакладна і не скажу, колькі разоў гуляў на чэмпіянатах свету. Магчыма, разоў 10. І лепшымі чэмпіянатамі на маёй памяці былі хакейныя турніры ў Браціславе і Мінску. У вашай сталіцы чыста. Тут жывуць добразычлівыя людзі. Хакейныя палацы вельмі прыгожыя. Для гульцоў створаны таксама добрыя ўмовы. Я рад, што прыехаў у Мінск.

Апошняя чвэрцьфінальная сустрэча з нашага пераліку Канада — Фінляндыя падарыла балельшчыкам інтрыгу, якая вырашылася на 56-й хвіліне сустрэчы дзякуючы трапнаму кідку фінскага хакеіста. 2:3 — лік на карысць Фінляндыі. У паўфінал трапілі дзве скандынаўскія дружыны.

**Тарас ШЧЫРЫ.**

СТАР. 2

**ВЫНІКІ ЧВЭРЦЬФІНАЛЬНЫХ ПАЯДЫНКАЎ**

ЗША — Чэхія — 3:4, Расія — Францыя — 3:0, Канада — Фінляндыя — 2:3, Швецыя — Беларусь — 3:2.

**ПАЎФІНАЛЫ**

24 мая. Расія — Швецыя (14:45, «Мінск-Арэна»)

Чэхія — Фінляндыя (18:45, «Мінск-Арэна»)

**Галоўныя паядынкі пройдуць у нядзелю, 25 мая, на «Мінск-Арэне». Матч за трэцяе месца адбудзецца ў 16:30. Фінал пачнецца ў 21:00.**

## ВІНШАВАННЕ ПАТРЫЯРХУ

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка павіншаваў Патрыярха Маскоўскага і ўсяе Русі Кірыла з днём тэзаіменінаў, паведамілі ў прэс-службе Прэзідэнта.**

«Народы Беларусі і Расіі звязвае больш чым тысячагадовая культура, у аснове якой ляжаць вечныя хрысціянскія ідэалы. Менавіта Праваслаўе стала для многіх пакаленняў жыватворнай крыніцай веры, духоўнасці і гераізму», — гаворыцца ў віншаванні.

«Сваёй актыўнай прапаведніцкай і грамадскай дзейнасцю Вы заслужылі аўтарытэт і прызнанне ў грамадстве. Няхай і надалей Ваша высакароднае служэнне прыносіць важкі плён», — пажадаў Прэзідэнт.

## ЗАПРАШАЮЦЦА ІНВЕСТАРЫ

Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка прапаноўвае прадстаўнікам еўрапейскіх дзелавых колаў рэалізацыю інвестпраектаў у Беларусі

**Гэтая прапанова ад кіраўніка дзяржавы прагучала на сустрэчы з прадстаўнікамі дзелавых колаў Швейцарыі, паведамляе БЕЛТА. У склад дэлегацыі ўваходзяць кіраўнікі буйных кампаній замежных дзяржаў, якія займаюць важнае месца на сусветнай арэне. Мэтай іх наведвання Беларусі з'яўляецца азнаямленне з умовамі вядзення бізнесу і інвеставання, пошук новых дзелавых партнёраў і магчымае прасоўванне прадукцыі, што выпрабляецца.**

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што прыцягненне замежных інвестыцый на базе самых сучасных тэхналогій — адзін з найважнейшых кірункаў эканамічнай палітыкі беларускай дзяржавы. «У нас ёсць шмат перспектыўных інвестыцыйных праектаў, якія мы зацікаўлены рэалізоўваць з удзелам замежнага капіталу. У першую чаргу гэта тычыцца фармацэўтычнай прамысловасці, хімічнай вытворчасці, іншых сфер дзейнасці, у тым ліку тых, якія вы тут прадстаўляеце», — сказаў кіраўнік дзяржавы, звяртаючыся да бізнесменаў.

Звяртаючыся да старшыні назіральнага савета, генеральнага дырэктара кампаніі «Штадлер Рэйл Груп» Петэра Шпулера, які ўзначальвае дэлегацыю прадстаўнікоў дзелавых колаў Швейцарыі, Аляксандр Лукашэнка выказаў надзею, што паспяховая работа «Штадлер Рэйл Груп» у Беларусі паслужыць добрым прыкладам для прыходу сюды буйных кампаній. Галоўным сведчаннем плённага супрацоўніцтва з гэтай кампаніяй з'яўляецца праект будаўніцтва завода па вытворчасці чыгуначнага і гарадскога электратранспарту, які рэалізуецца ў Фаніпалі. Паводле слоў Прэзідэнта, усяго каля двух гадоў спатрэбілася для таго, каб практычна з нуля пабудаваць адзін з самых сучасных заводаў па выпуску чыгуначнага пасажырскага транспарту на тэрыторыі СНД. Нядаўна быў падпісаны ўказ, у адпаведнасці з якім Фаніпалю надаецца статус горада-спадарожніка Мінска. Прэзідэнт выказаў упэўненасць, што гэта пазітыўна адаб'ецца на далейшым супрацоўніцтве са «Штадлер Рэйл Груп».

# ШВЕДСКАЯ ЎДАЧА

**Зборнай Беларусі не будзе ў паўфінале хакейнага першынства. У мужнай барацьбе гаспадары ўступілі зборнай Швецыі**

**На пасляматчавай прэс-канферэнцыі Глен Хэнлан выглядаў супакоена. Упэўнены, ён верыў у перамогу над сільнымі шведамі, спадзяваўся ўбачыць прыгожыя для ўсіх беларусаў лічбы на табло пад дахам «Мінск-Арэны», аднак, на жаль, не склалася, не атрымалася ў гэты раз.**

Помніцца, як падчас падрыхтоўкі да турніру хапала «спецыялістаў», якія не верылі ў зборную, крытыкавалі каманду за не вельмі ўдачныя вынікі ў праверачных матчах. Але за таварыскія сустрэчы ўзнагароды не даюць. На хатнім чэмпіянаце зборная Глена Хэнлана стрэліла. Пасля неверагоднага па розніцы шайбаў паражэння ад ЗША (1:6) беларуская дружына паўстала, сціскаючы кулакі білася ў кожнай гульні да апошняй секунды. У выніку мы атрымалі надзвычайна прыгожы паядынак у чвэрцьфінале са Швецыяй. Што тут казаць, беларусы без лідара Міхаіла Грабоўскага, які атрымаў пашкоджанне, вялі ў ліку і маглі праходзіць далей. Аднак нерэалізаваны беларусамі буліт і цуда-шайба Маціяса Экхальма ўпісалі ў пратакол непрыемны для нашых суайчыннікаў лік 2:3.

❍❍❍

Пасля матча ў мікст-зоне было сапраўднае змяшэнне эмоцый. Хтосьці з беларускіх гульцоў не ўтойваў слёз, хтосьці, наадварот, захоўваў пазітыўны настрой і з усмешкай прыгадваў самыя запамінальныя моманты турніру. Але абсалютна ўсе выказвалі адну і тую ж думку: беларускай камандзе ёсць чым ганарыцца!

**Андрэй СЦЯПАНАЎ, форвард беларускай зборнай:**



— У першым перыядзе мы проста не ўвайшлі ў матч. Пасля перапынку быў зусім іншы настрой. Усе хлопцы разумелі, што гэта звышадказны паядынак, таму выйшлі на пляцоўку з вялікім жаданнем змагацца і перамагаць. На жаль, гэтага не хапіла... Тым не менш увесь чэмпіянат застанецца ў маёй памяці адным яскравым успамінам. Кожная трэніроўка, кожны матч — гэта незабыўныя эмоцыі, якіх я ніколі не адчуваў раней. Гулялі дома, пры неверагоднай падтрымцы балельшчыкаў. Выступілі добра...маглі б — выдатна, але атрымалася проста добра. У нас фантастычная каманда! Мы настолькі з'ядналіся, што цяпер нават не хочацца ісці ў адпачынак.

**Уладзімір ДЗЯНІСАЎ, абаронца зборнай Беларусі:**



— Чаго не хапіла для перамогі? Напэўна, трэба было больш верыць у тое, што мы здольны абыграць шведаў і змагацца далей за медалі. Аднак пасля некалькіх правалаў на чэмпіянатах свету, калі мы былі на мяжы вылету з «вышкі», чвэрцьфінал — выдатны вынік. Але для стабільнасці трэба, каб маладзёжныя і юнацкія зборныя вярнуліся ў эліту сусветнага хакея. Бо, давайце казаць шчыра, гэта наша змена, «свежая кроў»... І вядома, трэба выпрацаваць адзіную сістэму падрыхтоўкі зборнай, каб не было частай змены трэнераў, бо гэта зусім не на карысць камандзе. Не ў маёй кампетэнцыі разважаць над планамі галоўнага трэнера адносна працы з беларускай зборнай, але скажу адно: калі ён здолеў сабраць наймацнейшых беларускіх хакеістаў, значыць, яго паважаюць, да яго прыслухоўваюцца. Акрамя гэтага, Глен — выдатны тактык і добры псіхолаг. Таму менавіта з ім мы і дабіваемся найлепшых вынікаў на чэмпіянатах свету.

***Дарэчы, паўфіналы і матчы за ўзнагароды можна будзе паглядзець на «Чыжоўка-Арэне». Падчас трансляцый на першым узроўні будуць працаваць пункты харчавання. З напоямі і ежай будуць пускаць на трыбуны. Набыць квіткі можна будзе ў касах лядовага стадыёна. Кошт білетаў на паўфінал — 30 тысяч рублёў, на фінал — 50 тысяч.***



Тым часам пасля сустрэчы сам **Глен Хэнлан** хваліў шведаў, дзякаваў сваім падапечным за выдатны турнір, а таксама жартаваў, што, нягледзячы на знешні спакой, сесці за руль пакуль не рызыкне:

— Шведы прадэманстравалі яркі хакей, — прызнаўся галоўны трэнер зборнай Беларусі. — Мы імкнуліся цягнуцца за супернікам, і я лічу, што ў нас атрымалася. Цяпер наша мэта — гуляць як зборная Швецыі, прывіваць беларускай камандзе атакуючы хакей. Бо задача спартсменаў не толькі перамагаць, але і забаўляць публіку. І тыя эмоцыі, якія можна было пабачыць на тварах балельшчыкаў «Мінск-Арэны», падказваюць, што мы на правільным шляху.

У першым перыядзе мы згулялі вельмі слаба. У перапынку мне прыйшлося пакрычаць на хлопцаў. Сказаў, што яны занадта шкадуюць шведаў. І ў другім перыядзе пайшла зусім іншая гульня. Змаглі закінуць дзве шайбы, але сапернік даволі хутка зраўняў лік, і гэта надало ім упэўненасці.

Не думаю, што нерэалізаваны буліт Калюжнага — ключавы момант, які мог бы кардынальна змяніць ход матча. Я не хачу быць суддзёй і даваць адзнаку эпізоду — гэта спорт, у якім бывае абсаютна ўсё.

Лічу, што сёлета выступаў мацнейшы склад беларускай зборнай у параўнані з папярэднімі гадамі. У каманды ёсць не толькі вопытныя лідары — Аляксей Калюжны, Міхаіл Грабоўскі, браты Касціцыны, але і маладыя таленавінтыя абаронцы — Алег Явенка, Кірыл Гатавец, Алег Гарошка. Усе яны развіваюцца, удасканальваюць сваё майстэрства, і я веру, што з іх дапамогай беларуская зборная атрымае яшчэ не адну гучную перамогу.

Тым не менш задуменны Хэнлан не адказаў на пытанне, ці будзе ён надалей працаваць з беларускай зборнай. Прычым яго аб гэтым мэтанакіравана прасілі двойчы. Але, куды ж мы без вас і гэтай мужнай каманды, Глен?



За шайбу змагаюцца Джымі Эрыксан і Андрэй Сцяпанаў.

Фотаздымкі Анатоля КЛЕШЧУКА.

## «Балельшчыкі шалелі, калі беларусы пераходзілі чырвоную лінію»

**Густаў НЮКВІСТ, нападаючы зборнай Швецыі:**



Фота БЕЛТА.

— Мы чакалі, што ў нас з беларусамі будзе цяжкі матч. Гульня была, як кажуць, на арэлях. Наша каманда пачала добра і кантралявала сітуацыю на пляцоўцы, але ў другім перыядзе мы далі ім два моманты, і яны іх паспяхова рэалізавалі. У апошняй частцы гульні наш варатар зрабіў выдатны сэйв і адбіў буліт. Хутка мы закінулі яшчэ адну шайбу. Аднак хто ведае, што было б тады, калі б беларусы рэалізавалі буліт.

***— У паўфінале вас чакае Расія.***

— Будзе складаны паядынак. Відавочна, што ў Расіі сабрана вельмі добрая каманда, у складзе якой ёсць некалькі суперзорак. У мяне няма сяброў у гэтай камандзе, але я гуляў супраць выдатных гульцоў — Малкіна і Авечкіна. У любым выпадку нам трэба сфакусавацца на сваёй гульні.

***— У групавым раўндзе вы ўсе матчы праводзілі на «Чыжоўка-Арэне», а цяпер пераехалі на «Мінск-Арэну».***

— Тут горача! Адчувалася цудоўная падтрымка балельшчыкаў на трыбунах. Яны заражалі энергіяй беларускіх хакеістаў. Як толькі беларусы пераходзілі чырвоную лінію, гледачы пачыналі шалець.

***— На трыбунах было вельмі мала шведскіх заўзятараў.***

— Не ведаю. Можа, у вас не прадавалі квіткі шведскім балельшчыкам? — пажартаваў Густаў. — У нас добрыя «фаны», але мы цяпер гулялі з гаспадарамі турніру, і мясцовыя балельшчыкі падтрымлівалі сваіх больш гучна. І я не думаю, што «фаны» пабаяліся ехаць у Беларусь. Шведы ёсць у Мінску, і я бачыў на трыбунах людзей у жоўтых кашулях. Але ў падтрымцы іх нельга параўноўваць з вашымі хлопцамі.

**Дарына ЗАПОЛЬСКАЯ, Тарас ШЧЫРЫ.**

# МНЕ НЕ БАЛЮЧА!..

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

Акрамя таго, дзякуючы поспехам акушэрства ўдаецца выхадзіць нованароджаных з масай цела ад 500 грамаў. У прыватнасці, нядаўна ў аддзяленні прааперыравалі дзяцей вагой, адпаведна, 750 і 950 грамаў. Гадоў 20 таму такія немаўляты практычна не выжывалі. Больш за тое, медыкі выяўляюць паталогію, якая можа запатрабаваць экстраннае хірургічнае лячэнне, нават з першых дзён жыцця. За апошні час, нягледзячы на тое, што колькасць ложкаў у хірургічным аддзяленні зменшылася з 60 да 40, яно працуе больш інтэнсіўна за кошт скарачэння знаходжання малых пацыентаў у стацыянары.

Многіх дзяцей даводзіцца выцягваць літаральна з таго свету. Але ў бальніцы працуюць сапраўдныя віртуозы, якія пастаянна павышаюць свой прафесійны ўзровень, чэрпаюць перадавыя ідэі як з Усходу, так і з Захаду.

— У нас вельмі знакаміты калектыў, мае шмат узнагарод рознага ўзроўню. І хоць клініка адносна маладая, але з вялікімі традыцыямі, — адзначае намеснік галоўнага ўрача па хірургіі Аляксандр Караневіч.

Аляксандр Іванавіч — хірург са стажам, ва ўстанове больш за 30 гадоў. Яго настаўнікам быў знакаміты прафесар Генрых Станіслававіч Кручынскі, які прывіў сваім вучням любоў да прафесіі.

— У нас вельмі моцная база, як лячэбная, так і навуковая, — кажа Аляксандр Караневіч. — Таму выкарыстоўваюцца перадавыя хірургічныя метады. Летась адкрыты Рэспубліканскі цэнтр сківічна-тварнай хірургіі. Тут лечацца ў асноўным дзеці з прыроджанай паталогіяй твару. Такія аперацыі выконваюцца з першых трох месяцаў жыцця маленькіх пацыентаў. Мы ўпершыню ў Беларусі ўвялі гэтую методыку. І як вынік, дзеці, што нарадзіліся з паталогіяй, пасля лячэння і рэабілітацыі нічым не адрозніваюцца ад сваіх аднагодкаў. Цяпер увогуле шырока прымяняем малатраўматычныя метады аператыўнага ўмяшання.

Для таго, каб вылечыць і паставіць дзяцей на ногі, грошай не лічаць. Ёсць цяжкія пацыенты, на якіх у дзень дзяржава траціць да 10 млн рублёў (з улікам харчавання, медыкаментаў, лячэння).

— Мінская абласная дзіцячая клінічная бальніца разлічана на 615 ложкамесцаў — гэта адна з самых буйных дзіцячых установаў у Беларусі, — падсумоўвае галоўны ўрач Дзмітрый Зайцаў. — У лячэбна-дыягнастычным працэсе выкарыстоўваюцца навейшыя методыкі і навуковыя распрацоўкі, складаная сучасная медыцынская тэхніка, эфектыўныя лекавыя сродкі, на набыццё якіх траціцца каля 1 млрд рублёў штогод. З калектывам бальніцы супрацоўнічае Беларуская медыцынская акадэмія паслядыпломнай адукацыі, 4 кафедры якой ажыццяўляюць навукова-даследчую і практычную дзейнасць непасрэдна ў аддзяленнях.



На працягу года ў бальніцы праходзяць курс стацыянарнага лячэння больш за 17 тысяч хворых з ускладненым дыягназам, сярод якіх у асноўным жыхары сельскай мясцовасці. Урачы-спецыялісты рэгулярна выязджаюць у сельскія раёны вобласці, каб аказаць практычную дапамогу хворым дзецям і мясцовым медработнікам.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

■ ЖКГ: затраты і аддача

## КАМУНАЛЬНІКІ «ЦЯГНУЦЬ» БЮДЖЭТНЫЯ ГРОШЫ

**Факты прыпісак выдаткаў па аказаных насельніцтву камунальных паслугах, безгаспадарчасці, незаконнага атрымання і неэфектыўнага выкарыстання бюджэтных сродкаў, нерацыянальнага выкарыстання матэрыяльных рэсурсаў і іншыя парушэнні заканадаўства выяўлены Камітэтам дзяржкантролю Гомельскай вобласці ў галіне жыллёва-камунальнай гаспадаркі. Выманточванне дзяржаўных датацый стала адным з папулярных прыёмаў камунальнікаў.**

Так, на працягу трох гадоў КЖУП «Гомельскі райжылкамгас», КУП «Камунальнік Калінкавіцкі» і КВУП «Лелькам», парушаючы заканадаўства, аднеслі на сабекошт жыллёва-камунальных паслуг выдаткі ў памеры звыш 751 млн руб. па амартызацыі асноўных сродкаў. Пры гэтым яны працяглы час не выкарыстоўваліся ў вытворчай дзейнасці, знаходзіліся ў нездавальняючым стане і па сутнасці валяліся пад плотам.

Напрыклад, у будынку мазутнай гаспадаркі Гомельскага райжылкамгаса абсталяванне паржавела і было часткова дэмантавана, трубаправоды пакрыты карозіяй, на сценах і столі меліся сляды цечы, цвілі, па фасадзе будынка цагляны мур месцамі разбураны. Кантралёры адзначаюць, што амартызацыя па гэтых асноўных сродках павінна была пакрыцца за кошт прыбытку прадпрыемстваў, аднак выдаткі былі ўключаны ў сабекошт камунальных паслуг і прад'яўлены бюджэту.

Акрамя таго, Гомельскі райжылкамгас летась неабгрунтавана аднёс на сабекошт паслуг па цеплазабеспячэнні насельніцтва кошт 1133 Гкал, якія адносяцца да тэхналагічнага выдатку цеплавой энергіі. У выніку выдаткі на аказанне насельніцтву паслуг па цеплазабеспячэнні былі неабгрунтавана завышаны амаль на 855 млн руб. і таксама прад'яўлены да пакрыцця з бюджэту. За кошт такіх прыпісак прадпрыемства незаконна атрымала звыш 450 млн рублёў бюджэтных субсідый. Толькі пасля ўмяшання кантралёраў неабгрунтавана атрыманыя сродкі ў поўным аб'ёме былі вернуты ў бюджэт.

Безгаспадарчасць дапушчана і КУП «Камунальнік Калінкавіцкі» пры аказанні паслуг па водазабеспячэнні і рэалізацыі мерапрыемстваў дзяржаўнай праграмы «Чыстая вада». Так, водазабор «Лясны» ў Калінкавічах быў уведзены ў эксплуатацыю з непрацуючым абсталяваннем, неабходным для прамывання фільтраў станцыі абезжалезвання. З прычыны такога падыходу «Камунальнік Калінкавіцкі» за тры гады дадаткова затраціла 2340 квт/ч электрычнай энергіі, у выніку чаго сабекошт паслуг водазабеспячэння ўзрос на 27 млн руб. Пасля ўмяшання Камітэта дзяржкантролю недахопы былі ліквідаваны і абсталяванне ўведзена ў эксплуатацыю.

За дапушчаныя парушэнні Камітэтам дзяржкантролю вобласці прадпрыемствы і службовыя асобы прыцягнуты да дысцыплінарнай і адміністрацыйнай адказнасці.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ**

■

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

## САЮЗНЫ ФОРУМ АДБУДЗЕЦЦА Ў МІНСКУ

**Навукова-практычная канферэнцыя «Актуальныя праблемы будаўніцтва і развіцця Саюзнай дзяржавы», прысвечаная 70-й гадавіне вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, адбудзецца 27—29 мая ў Мінску.**

У прадстаўнічым форуме, арганізаваным Парламенцкім сходам Саюза Беларусі і Расіі, возьмуць удзел беларускія і расійскія парламентарыі, кіраўнікі структур Саюзнай дзяржавы, міністэрстваў, ведамстваў, адказныя работнікі з рэгіёнаў Расіі і Беларусі, навукоўцы і журналісты.

На пленарным пасяджэнні канферэнцыі будзе абмеркавана тэма «Роля і значэнне вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў у гістарычных лёсах Беларусі і Расіі».

Тэматыка трох секцый — «Вялікая Айчынная вайна як адна са старонак агульнага гістарычнага мінулага Беларусі і Расіі», «Гуманітарныя аспекты захавання ў Рэспубліцы Беларусь і Расійскай Федэрацыі гістарычнай памяці аб падзеях Вялікай Айчыннай вайны», «70-годдзе вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў — найважнейшая інфармацыйная падзея Саюзнай дзяржавы».

## ПЕРШЫ БЕЛАРУСКІ МЮЗІКЛ — ЛЯ СЦЕН ГАЛЬШАНСКАГА ЗАМКА

**Сёння ў Гальшанах праходзіць юбілейны фестываль сярэднявечнай культуры «Гальшанскі замак». Чым на гэты раз арганізатары здзівяць наведнікаў, мы пацікавіліся ў старшыні Ашмянскага райвыканкама Міраслава Сарасека.**

— Фестываль ля сцен замка магнацкага роду Сапегаў тут ладзіцца ўжо пяты год запар. Сёлета своеасаблівай «разыначкай» свята стане першы нацыяльны беларускі мюзікл «Соф'я Гальшанская» вядомага беларускага кампазітара Уладзіміра Кандрусевіча, які ўпершыню гучыць ля сцен Гальшанскага замка. Прэм'ера гэтага мюзікла, галоўная гераіня якога вядомая ў гісторыі як апошняя жонка польскага караля Ягайлы, адбылася восенню мінулага года на сцэне Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага музычнага тэатра. Мы знайшлі разуменне з кіраўніцтвам тэатра, і сёлета, што вельмі сімвалічна, пастаноўка прыехала на радзіму Соф'і Гальшанскай.

Таксама ўпершыню на фестывалі будуць бегаць навыперадкі прусакі (!). Госці фестывалю змогуць не толькі назіраць за гонкай вусатых удзельнікаў, але і нават рабіць стаўкі на самых хуткіх. Жартаўлівы забег ладзіць экстрым-тэатр «Берсерк».

Гурт «Фламея» дапоўніць сярэднявечную атмасферу свята майстар-класам па сярэднявечных танцах. Таксама ўсіх ахвотных навучаць каваць, фехтаваць ды хадзіць на хадулях. Гледачы station назіраюць за старадаўняй гульнёй «Сэрса», за перацягваннем каната на «хітрых» пнях, за кіданнем нажоў і сякер, конна-тэатралізаваным прадстаўленнем «Чатыры эпохі беларускай кавалерыі».

Не абыдзецца і без такіх традыцыйных фішак свята, як Горад майстроў, рыцарскія турніры, паказныя выступленні клуба баявых мастацтваў, агнявога шоу. Удзел у свяце прымае і Выдавецкі дом «Звязда».

**Надзея ДРЫЛА.**

## ЧАЛАВЕК ГОДА МІНШЧЫНЫ

**Губернатар Мінскай вобласці Сямён Шапіра ўручыў спецыяльныя дыпломы Мінаблвыканкама «Чалавек года Міншчыны» лепшым працаўнікам. Сімвалічна, што ўрачыстая цырымонія адбылася ў горадзе Узда ў нядаўна адкрытым новым Палацы культуры і стала своеасаблівым падвядзеннем вынікаў сацыяльна-эканамічнага развіцця цэнтральнага рэгіёна ў мінулым годзе.**

Пераможцаў выбралі ў трох намінацыях: «Вытворчая дзейнасць», «Невытворчая сфера» і «Грамадска-палітычная дзейнасць». Гэта кіраўнікі прамысловых і сельскагаспадарчых прадпрыемстваў і арганізацый, будаўнікі, жывёлаводы, педагогі, медыкі, міліцыянеры, выратавальнікі, энергетыкі, камунальнікі, святары. Сярод іх епіскап Барысаўскі, вікарый Мінскай епархіі Беларускай праваслаўнай царквы Веньямін (Віталь Тупека), стараста вёскі Гарадзішча Бокшыцкага сельскага Савета дэпутатаў Слуцкага раёна Яўгенія Сыцько, трэнер-выкладчык па грэблі на байдарках і каноэ спецыялізаванай дзіцяча-юнацкай школы алімпійскага рэзерву Людміла Казлоўская, дырэктар Пухавіцкага псіханеўралагічнага дома-інтэрната Аляксандр Ляшэнка, кіраўнік сялянскай гаспадаркі «Алімп-Агра» Уздзенскага раёна Юрый Лойка, апаратар машыннага даення адкрытага акцыянернага таварыства «Морач» Клецкага раёна Настасся Станкевіч. Усяго ж ганаровага звання ўдастоены 20 чалавек. Акрамя дыпломаў, віноўнікі ўрачыстасці атрымалі грашовыя прэміі, памятныя стужкі і кветкі.

Будучыня Мінскай вобласці ў прыватнасці і краіны ў цэлым залежыць ад кожнага з нас, канкрэтнага ўнёску ў эканоміку, культуру, сацыяльную сферу. І людзі, якія заслужылі ганаровае званне «Чалавек года», шмат зрабілі, каб цэнтральны рэгіён стабільна развіваўся.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ**

■ Геапалітыка

# СТУПЕНЬ ДАВЕРУ

Што пакажуць выбары ў Еўрапарламент?



**22—25 мая жыхары 28 дзяржаў — членаў Еўрапейскага саюза выбіраюць дэпутатаў Еўрапейскага парламента восьмага склікання.**

Еўрапарламент з'яўляецца адным з ключавых наднацыянальных інстытутаў улады Еўрапейскага саюза, выбіраемых еўрапейцамі. Гэты аднапалатны орган, які складаецца ў адпаведнасці з дагаворам аб Еўрапейскім саюзе «з прадстаўнікоў народаў дзяржаў-членаў», што істотна адрознівае Еўрапейскі парламент ад падобных наднацыянальных структур, якія звычайна фарміруюцца з прадстаўнікоў, дэлегаваных нацыянальнымі парламентамі. Напрыклад, у парламенцкія асамблеі Савета Еўропы, АБСЕ і НАТА, Міжпарламенцкую асамблею ЕўрАзЭС, якія звычайна фарміруюцца з дэпутатаў нацыянальных парламентаў.

Тэрмін паўнамоцтваў дэпутатаў Еўрапарламента — пяць гадоў. Сёння ў Еўрапарламенце працуе 751 дэпутат. На папярэдніх выбарах у Еўрапарламент 2009 года былі абраны 736 дэпутатаў. Пасля ўступлення ў сілу Лісабонскага дагавора колькасць мандатаў было павялічана, таму некаторыя краіны даслалі дадатковых парламентарыяў. У 2013 годзе Харватыя стала новым удзельнікам ЕС і атрымала квоту на 12 месцаў у Еўрапарламенце. Такім чынам, колькасць дэпутатаў павялічылася да 763. Каб прывесці колькасць еўрадэпутацкіх мандатаў да ўзроўню, устаноўленага Лісабонскім дагаворам — 751, на выбарах 2014 года некаторым краінам давялося пазбавіцца часткі мандатаў. Сярод іх сама Харватыя (з 12 да 11), Румынія (з 33 да 32), Бельгія, Венгрыя, Грэцыя, Партугалія, Чэхія (усе з 22 да 21), Швецыя (з 20 да 19), Балгарыя (з 18 да 17), Ірландыя, Літва (абедзве з 12 да 11) і Латвія (з 9 да 8). Гэтае пераразмеркаванне галасоў паміж краінамі таксама ўлічвала дэмаграфічныя змены, якія адбыліся ў краінах ЕС за апошнія 5 гадоў.

Перадвыбарная кампанія афіцыйна стартавала яшчэ 10 верасня 2013 года, калі Еўрапарламент распачаў кампанію, якая інфармавала насельніцтва пра гэтую падзею. Яна складаецца з чатырох фаз, а яе лозунгам стаў выраз «Дзейнічаць, рэагаваць, дасягаць». Падчас першай фазы грамадзянам распавядалі аб новых паўнамоцтвах парламента і іх магчымае прымяненне на карысць кожнага еўрапейскага грамадзяніна. Другая фаза, якая прайшла ў перыяд з кастрычніка 2013 года па люты 2014 года ў выглядзе шэрагу акцый у еўрапейскіх гарадах, была сканцэнтравана на пяці ключавых пытаннях: эканоміцы, працоўных месцах, якасці жыцця, грошах і ролі ЕС у свеце. Трэцяя фаза, якая пачалася ў лютым, была прысвечана даце выбараў, дням галасавання. У выніку было вызначана, што выбары ў Еўрапарламент пройдуць 22—25 мая. Гэта звязана з рознымі днямі для галасавання ў некаторых дзяржавах ЕС (даты вызначаны паводле традыцый у кожнай краіне). Пасля выбараў апошняя фаза кампаніі будзе прысвечана новаму скліканню парламента, абранню старшыні Еўракамісіі і фармаванню яе складу.

Звычайна выбары ў Еўрапарламент праходзяць летам, але гэтыя выбары былі перанесены на канец мая для павелічэння яўкі выбаршчыкаў і часу паміж выбарамі ў парламент і намечанымі на ліпень выбарамі старшыні Еўракамісіі.

Эксперты фіксуюць істотнае зніжэнне цікавасці еўрапейскіх грамадзян да палітыкі. Крызіс еўразоны, рост беспрацоўя, узмацненне еўрапейскіх жорсткіх мер эканоміі паменшыў узровень грамадскага адабрэння палітыкі, якая праводзіцца кіраўніцтвам ЕС. У цэлым сёння толькі ў 4 краінах ЕС узровень падтрымкі кіраўніцтва саюза перавышае 50%. У еўрапейцаў узмацняецца адчуванне, што яны не могуць уплываць на прыняцце рашэнняў. Паводле апытанняў, 66% з іх лічаць, што іх галасы ў ЕС не адыгрываюць аніякай ролі. Ва ўсіх краінах, акрамя Даніі, такіх людзей большасць.

На думку аналітыкаў, гэта стварае небяспеку пранікнення ў Еўрапарламент радыкальных правых і левых сіл, якія традыцыйна характарызуюцца еўраскептычнымі настроямі. Паводле ацэнак The Economist, зробленых у студзені 2014 года, экстрэмісты левага і правага флангаў змогуць атрымаць ад 16 да 25%. Праўда, апошнія сацыялагічныя апытанні сведчаць аб крыху больш нізкім працэнце падтрымкі — 12—13%.

З гэтага года таксама пачынае дзейнічаць палажэнне Лісабонскага дагавора, згодна з якім Еўрапейскі парламент будзе абіраць кіраўніка выканаўчай улады ЕС — старшыню Еўрапейскай камісіі з кандыдатур, прапанаваных Еўрапейскім саветам, які, у сваю чаргу, павінен улічваць вынікі выбараў у Еўрапарламент. Але гэта толькі ў тэорыі. Нягледзячы на тое, што Еўрапарламент будзе зацвярджаць кандыдатуру старшыні Еўрапейскай камісіі, эксперты мяркуюць, што вырашальным стане не голас жыхароў Еўропы, а пазіцыя лідараў буйных краін ЕС — у першую чаргу Германіі і Францыі. Дарэчы, менавіта выбарам была прысвечана нядаўняя нефармальная сустрэча прэзідэнта Францыі Франсуа Аланда і канцлера Германіі Ангелы Меркель на востраве Руген. Безумоўна, лідары дзвюх краін не маглі абысці сваёй увагай пытанне ўзгаднення кандыдатуры на пасаду кіраўніка Еўракамісіі. А пакуль што за гэтую пасаду спаборнічаюць лідары вядучых фракцый Еўрапарламента — Марцін Шульц (Прагрэсіўны альянс сацыялістаў і дэмакратаў), Жан-Клод Юнкер (Еўрапейская народная партыя), Гі Вэрхофштат (Альянс лібералаў і дэмакратаў за Еўропу), Ска Келер (Зялёныя — Еўрапейскі свабодны альянс) і Алексіс Цыпрас (Еўрапейскія аб'яднаныя левыя/ Лева-зялёныя Поўначы).

Тым часам, па даных сацыялагічных апытанняў праекта Pollwatch ад 20 мая, галасы паміж фракцыямі Еўрапарламента размяркоўвацца наступным чынам:

Еўрапейская народная партыя — 217 (28,9%);

Прагрэсіўны альянс сацыялістаў і дэмакратаў — 201 (26,8%);

Альянс лібералаў і дэмакратаў за Еўропу — 59 (7,9%);

Зялёныя — Еўрапейскі свабодны альянс — 44 (5,9%);

Еўрапейскія кансерватары і рэфармісты — 42 (5,6%);

Еўрапейскія аб'яднаныя левыя / Лева-зялёныя Поўначы — 53 (7,1%);

Еўропа за свабоду і дэмакратыю — 40 (5,3%);

Незалежныя дэпутаты — 95 (12,6%).

Гэтыя даныя сведчаць пра тое, што пасля выбараў, як і раней, у дзейнасці Еўрапейскага парламента чакаюцца нязначныя змены: сацыял-дэмакраты і еўрапейскія «народнікі», якія пераважна галасуюць за адно і тое ж, захаваюць большасць і будуць далей адыгрываць вырашальную ролю ў прыняцці найважнейшых для ЕС палітычных рашэнняў.

**Арсен СІВІЦКІ, кіраўнік Цэнтра стратэгічных і знешнепалітычных даследаванняў**

■

■ Культурны брэнд

# У ПАЎЛІНКІ — ПРАЗ КОНКУРС

## ГЕРАІНЯ КУПАЛАЎСКАЙ П'ЕСЫ ЗАЎСЁДЫ МАЛАДАЯ, НЯГЛЕДЗЯЧЫ НА ТОЕ, ШТО СПЕКТАКЛЮ 70 ГАДОЎ



Тэатральныя спектаклі маюць сваю лінію жыцця. Думка паставіць п'есу звычайна бывае абумоўлена шэрагам прычын, матываў і актуальных момантаў. І калі ўсё гэта праходзіць альбо губляе актуальнасць, калі публіка паглядзела (і па некалькі разоў), то знікае з афішы і спектакль. Але бываюць спектаклі, для якіх не існуе часу, і публіка іх ведае на памяць, але ўсё роўна глядзіць, ды і новыя гледачы падрастаюць і ходзяць. У Купалаўскім тэатры ёсць спекталь-брэнд. Спектакль-візітоўка. Спектакль, лінія жыцця якога, напэўна не прыпыніцца, пакуль існуе нацыянальная культура. «Паўлінка» Янкі Купалы ідзе ў тэатры ўжо 70 гадоў. Менавіта гэтай пастаноўкай кожны год тэатр адкрывае тэатральны сезон.

Яна наскрозь беларуская: у словах, гумары, героях. Нават вонкава родная: адчуваеш каларыт сялянскай хаты, чуеш мелодыі, якія надта кладуцца на слых (падобныя на народныя), ручнікі, строі герояў і нават танцы, якія яны дэманструюць. Усё кране чалавека, які ведае, у чым адметнасць беларускага, і нават госця, які хоча гэта адчуць.

### Нараджэнне

Нацыянальны тэатр павінен быў мець адметную пастаноўку, дзе былі б свае, зразумелыя і пазнавальныя характары і калізіі. Закаханая кемлівая беларуская дзяўчына па імені Паўлінка, якая вызначае свой лёс насуперак волі бацькоў, — здаецца, самы культавы персанаж у айчыннай культуры.

Па-першае, яе прыдумаў народны паэт Янка Купала. У 1912 годзе ў фальварку Акопы паэт напісаў п'есу, калі прыязджаў да маці на канікулы. Спачатку задумаў апавяданне «А вербы шумелі». «Паводле ўспамінаў грамадскага дзеяча і публіцыста Антона Луцкевіча, Купала не вельмі любіў пісаць апавяданні, гэта быў не яго жанр, можа, таму твор і стаў камедыяй», — патлумачыла Алена Ляшковіч, дырэктар Дзяржаўнага літаратурнага музея імя Янкі Купалы.

Па-другое, п'еса «Паўлінка» адразу прыцягнула ўвагу беларускай культурнай эліты: у 1913-м яна была паказана ў Вільні ўдзельнікамі Беларускага музычна-драматычнага гуртка, на прэм'еры прысутнічаў сам аўтар. Другі паказ быў у той жа год у Пецярбургу — аўтар вельмі ўважліва ставіўся да пастаноўкі. Ролю Паўлінкі тады выканала Паўліна Мядзёлка.

Па-трэцяе, п'есу «Паўлінка» паказалі ўпершыню ў Мінску ў 1917 годзе артысты «Першага беларускага таварыства драмы і камедыі», на базе якога ў 1920-м быў заснаваны Беларускі дзяржаўны тэатр, дзе таксама паказалі пастаноўку паводле Купалы. Па волі Еўсцігнея Міровіча да «Паўлінкі» звярнуліся ў 1927 годзе: яна прагучала больш сацыяльна скіраванай.

Што там казаць: у тэатра была на той час галоўная задача — дэманстраваць перавагі новага ладу жыцця і магчымасці, якія ён нясе беларускаму мастацтву. Ставіліся іншыя творы, з іншымі героямі. Нездарма Беларускаму дзяржаўнаму тэатру выпала адказная місія: прадстаўляць рэспубліку на Дэкадзе беларускага мастацтва ў Маскве — перад самай вайной.

У 1941 годзе тэатр едзе на гастролі ў Адэсу. Там яго напаткала вайна. Вяртацца ў Мінск не было магчымасці, беларускую трупу накіравалі ў эвакуацыю ў Томск. У Томску ў 1942 годзе артысты атрымалі вестку аб смерці Янкі Купалы. Каб увекавечыць памяць вялікага паэта, творчы калектыў звярнуўся з просьбай да савецкага ўрада аб наданні тэатру яго імя.

І вось там, у Томску, 23 мая 1944 года была створана «Паўлінка» рэжысёрам Львом Літвінавым, які прызнаваўся: «…Марай нашай было зрабіць спектакль так, каб ён быў варты светлай памяці народнага паэта… Мы ж будзем працягваць шліфоўку спектакля і з хваляваннем чакаць яго сустрэчы з беларускім народам, якому ён прысвечаны».

Менавіта гэтую пастаноўку беларускія гледачы бачаць на сцэне нацыянальнага тэатра ўжо 70 гадоў. У гонар 70-годдзя спектакля ўзгадвалі ўсе акалічнасці яго існавання на сцэне.

Напрыклад, у мемуарах народны артыст БССР Сцяпан Бірыла (ён доўгі час чытаў уступ да спектакля), пісаў, што ў вызваленую Беларусь хацелася вярнуцца з нейкім дарагім і памятным падарункам. Вырашылі, што ім будзе «Паўлінка». Над спектаклем разам з рэжысёрам з натхненнем працавалі лепшыя сілы тэатра: вядучыя акцёры Глеб Глебаў, Барыс Платонаў, Лідзія Ржэцкая і іншыя. Поспех перасягнуў чаканні. Па вяртанні тэатра ў Мінск у той жа год тэатр атрымаў права насіць імя Янкі Купалы.

У 1952 годзе на кінастудыі Аляксандрам Зархі паводле Купалаўскай «Паўлінкі» быў пастаўлены фільм, ролі ў якім выконвалі акцёры-купалаўцы з легендарнага саставу.

### Увасабленні

Гэты спектакль сыгралі ўжо больш за 2000 разоў. На сённяшні дзень «Паўлінку» іграе чацвёртае пакаленне артыстаў, а некаторым пашчасціла выканаць нават 2 ролі.

Актрыса Ала Доўгая, якая выконвала ролю Паўлінкі з 1965 па 1983 год, успамінае:

— Я працавала ў тэатры ўжо год. Тады Паўлінку іграла Бірута Дакальская. А я прыйшла на ролю Паўлінкі па конкурсе. Трэба было сыграць першую сцэну з Якімам і паспяваць. Скажу, што ўвайсці ў гэтую ролю было страшна і адказна: на мяне глядзелі іншыя Паўлінкі. Была яшчэ жывая Паўліна Мядзёлка. Яна прыходзіла на спектакль і потым сказала: «Я цябе прызнаю». Гэта быў самы вялікі падарунак. За доўгія гады ў мяне было шмат Якімаў. У нас былі выязныя паказы, бо спектакль карыстаўся вялікім поспехам. І вось аднойчы сыгралі спектакль, да мяне падыходзяць са словамі: «У цябе ж быў іншы Якім. Чаму ж ты яго кінула?..» Людзі па некалькі разоў глядзелі. А то бывала, што пасля заканчэння пытаюцца: «Чаму вы не даігралі спектакль?» — «Як не даігралі?» — «А вяселле дзе? Павінна быць вяселле…» Не магу сказаць, што канец вельмі шчаслівы. Таму што Паўлінка, якая вельмі кахае Якіма, але ў той жа час паважае і любіць бацькоў, ідзе на такі крок. Для яе гэта складаны выбар. Але ў той жа час гэта перамога кахання, якое рухае чалавецтвам.

Сярод легендарных Паўлінак актрыса Зоя Белахвосцік, якая выходзіла на сцэну ў гэтай ролі на працягу 18 гадоў. У нашы дні Паўлінку іграюць актрысы Марта Голубева і Кацярына Алейнік.

Кацярына Алейнік таксама кажа пра адказнасць: выконваючы гэтую ролю, трэба шмат спяваць і ўмець узяць высокую ноту — соль другой актавы. І яна на вечарыне гэта дэманструе — пад аркестрык. Музыку «Паўлінкі» стварыў кампазітар Яўген Цікоцкі, і акцёры самі спявалі пад аркестр. Але ў адзін момант, калі тэатр ехаў на гастролі ў Балгарыю, на музыкантах вырашылі сэканоміць. Музыку запісалі на фанаграму.

Загадчык музычнай часткі Уладзімір Кур'ян тлумачыць:

— Яўген Карлавіч Цікоцкі напісаў партытуру для 24 чалавек. Яны ўсе ўмяшчаліся ў старым тэатры ў яму. Потым яму скарацілі — засталося 12 музыкантаў. Я прыйшоў у тэатр 30 гадоў таму, у спадчыну ад Уладзіміра Будніка мне дастаўся аркестр з 7 чалавек. Я быў самы малодшы ў штаце, хацелася аптымізму, але ўвесь час чуў, што аркестр трэба скарачаць, бо з фанаграмай усё проста. Я на той час ужываюся ў калектыў, актыўна іграю творчыя вечарыны, набіраю каманду. Цяпер я ўжо самы стары. І зараз нас ужо 8. Для «Паўлінкі» я паставіў мэту аднавіць каларыт, які закладзены ў партытуры Цікоцкага. У 2000 годзе ў спектакль вярнулася жывая музыка.

За 70 гадоў існавання спектакль, які паставіў Леў Літвінаў, перажыў некалькі рэстаўрацый. Пасля нядаўняга рамонту тэатра, напрыклад, трэба было адаптаваць спектакль для аднаўленай сцэны. Рэстаўрацыі — гэта свайго роду «пластычныя аперацыі» для «Паўлінкі», каб яна заўсёды выглядала сучаснай. Прычым не толькі для нас. У верасні «Паўлінка» паедзе ў Томск, дзе калісьці нарадзіўся гэты спектакль.

**Ларыса ЦІМОШЫК**

■ Дзеля памяці

# Ён не адзін

## Кветкі ў «Вянок» Багдановіча

У далёкай Ялце, калі ўсё навокал буяла і клікала да жыцця, у адзіноце паміраў малады беларускі паэт Максім Багдановіч. У ноч на 25 мая 1917 года яго не стала. Але ён быў не адзін.

Побач была кніга — першы прыжыццёвы зборнік «Вянок». А гэта значыць, разам з паэтам у той момант былі ўсе тыя, хто чытаў і ўпадабаў яго вершы. На адлегласці — але думкі існуюць адначасова ў розных прасторах. Яны адчувальныя. Яны знітоўваюць людзей. Калі ты з некім аднолькава пра нешта думаеш, то заўсёды ёсць адчуванне паяднанасці.

Да моманту сыходу Багдановіча ў іншую прастору яго кнігу ўжо добра ведалі: яна выйшла ў 1913-м, сам паэт пабачыў зборнік у 1914-м. З подпісам аўтара «Вянок» атрымалі блізкія паэту людзі.

Сёлета ў дзень памяці Багдановіча прапаноўваюць узгадаць яго вершы з «Вянка». Зборнік убачыў свет 100 гадоў таму, а гэта значыць, што ўжо не адно пакаленне нашчадкаў першых чытачоў сталі духоўна блізкімі Багдановічу. Усіх іх Літаратурны музей Максіма Багдановіча запрашае на сустрэчы. На першую сустрэчу варта прыйсці з кветкамі да помніка паэту (25 мая ў 11.30). Памоляцца за яго ў 13.00 у Свята-Петра-Паўлаўскім саборы. У наступны дзень, а 18.00, у музеі адбудзецца літаратурная імпрэза «Першая кніга паэта». Пра яе раскажуць сучасныя беларускія паэты Аксана Данільчык, Зміцер Вішнёў, Марыя Мартысевіч, Віка Трэнас, Аксана Спрынчан, Андрэй Адамовіч, Каця Глухоўская.

■ Выстава

# КРОКІ ПА ЦІХАЙ ВАДЗЕ

## Жывапіс як спосаб пераканаць іншых у прыгажосці роднай краіны

**Сямён Дамарад — мастак-манументаліст. Але так бывае, што пасля манументальнасці вельмі хочацца чагосьці камернага. Ціхага. Амаль інтымнага. Вось так і ўзнікла ў яго жаданне заняцца жывапісам. Былі акварэлі. Цяпер алей на палатне — выстава твораў адкрылася ў Галерэі «Мастацтва» ў Мінску. Назва яе — «Па ціхай вадзе» — адлюстроўвае аўтарскі настрой. І разумееш: ён гэта пісаў дзеля цішыні і спакою, дзеля прыгажосці і замілаванасці, якая ўзнікала пасля таго, калі сам пабываў на прыродзе і паглядзеў на нешта. Ціхі беларускі пейзаж. Праз улюбёныя беларускія колеры.**



**Адна з ранейшых акварэляў С. Дамарада.**

І гэта натуральна: Сямён Дамарад нарадзіўся на Магілёўшчыне, у Бабруйску. Колеры роднай зямлі ўвабраў з дзяцінства. Але іх сутнасць у мастацтве дала магчымасць зразумець адукацыя: ён скончыў мінскую мастацкую вучэльню імя Глебава, вучыўся ў Беларускім дзяржаўным тэатральна-мастацкім інстытуце (яго настаўнікамі былі, у прыватнасці, Гаўрыла Вашчанка і Уладзімір Стальмашонак). Выстаўляцца пачаў у 70-х гадах мінулага стагоддзя. Прычым працаваў менавіта як мастак-манументаліст.

**Старшыня секцыі манументальнага мастацтва Беларускага саюза мастакоў Алесь СУША** адзначыў:

— Сямён Уладзіміравіч — член нашай секцыі. Як чалавека і творцу я яго ведаю даўно. А вось як жывапісца — нядаўна. Але калі я да яго ў майстэрню заходзіў, то ён паказваў свае работы, асабліва тады ўразілі акварэлі: ён аказаўся тонкім лірыкам, пры тым, што займаецца манументальнай работай, пры тым, што рабіў цудоўныя працы, але гэта было неяк напружана. А вось ягоны жывапіс іншы. Ён пачаў у жывапісе працаваць гадоў 10–15 таму. Здавалася, што ўжо позна пачынаць. Але адчуваецца, што гэта ягонае: у чалавека быццам адкрылася другое дыханне. Яго жывапіс летуценны, тонкі.

Можа, таму, што пра беларускую прыроду. Гэта ж святое… Але Сямён Дамарад да прыроды мае асаблівыя сантыменты: ён сам рыбак, адчувае змены неба, вады, зямлі. І вось адкуль цішыня — каб не спалохаць чаканае. І ўсё так па-добраму, па-беларуску душэўна…

**Старшыня Беларускага саюза мастакоў Рыгор СІТНІЦА** падкрэслівае:

— Я гадоў 7–9 як звярнуў увагу на жывапісца Сямёна Дамарада. Першую работу я ўбачыў у альбоме. І так бывае, што першы раз нешта здзіўляе, а другі раз і трэці пераконваешся, што гэта невыпадкова. І сённяшняя выстава пераконвае, што перад намі вельмі тонкі жывапісец. Важна зазначыць, што ёсць мастацкая традыцыя. І ёсць такія пачуцці, як смутак і радасць, якія выказваюцца праз твор. Дык вось смутак у беларусаў — беларускі, і радасць у беларусаў — беларуская. Мы нават самі таго не заўважаем. Той жа матыў будуць пісаць людзі розных нацыянальнасцяў, і ў іх будзе іншая танальнасць, іншы каларыт. Гэта не мінус ці плюс камусьці. Так дадзена Госпадам Богам. Жывучы на гэтай зямлі, мы так бачым яе, так бачым неба. Так бачыў Бялыніцкі-Біруля і пасля яго шмат якія мастакі. Адчуваецца абсалютна нацыянальная, тонкая, пранізлівая танальнасць.

Сам аўтар быў крануты тым, што яго эмоцыю адчулі іншыя людзі, бо «калі пішаш, то ведаеш, што ўкладваеш у работу». Сёмён Дамарад стаў працаваць у пейзажы ў сталым узросце. Але ён меў шэраг персанальных выстаў, у тым ліку за мяжой (у Германіі і Аўстрыі). Ён адзначыў: «Я рады, што мае працы вярнуліся на радзіму, я пасля гэтага шмат напісаў. Яны мне дапамагаюць па-свойму».

**Ларыса ЦІМОШЫК**

■ Кінакрокі

# Нашы ў Канах

## Нацыянальны беларускі павільён у Канах прэзентуе калегам кінапрадукцыю сваёй краіны

У асноўным конкурсе фестывалю ўдзельнічае 18 карцін з 11 краін свету. Расійскі рэжысёр Андрэй Звягінцаў дае справаздачу за братоў-славян у конкурснай праграме з фільмам «Левіяфан». У пазаконкурснай праграме кінафестывалю быў паказаны фільм сумеснай вытворчасці Расіі, Фінляндыі, Эстоніі і Беларусі «Я не вярнуся», прэм'ера якога адбылася на кінафестывалі Tribeca ў Нью-Ёрку (адным з заснавальнікаў фестывалю з'яўляецца Роберт дэ Ніра). У катэгорыі «Пункты гледжання» ў Нью-Ёрку карціна ўдастоена ўзнагароды «Special Jury Mention» («Спецыяльнае згадванне журы»). Асобнай падзеяй, вяртаючыся да Канаў, стала прэм'ера стужкі «Майдан» Сяргея Лазніцы.

Беларускі павільён працуе на Канскім кінафестывалі ўжо чацвёрты раз. Міністэрства культуры пачало фінансаваць праект у 2011 годзе, калі на Блакітны бераг адправіліся прадстаўнікі дэпартамента па кінематаграфіі Міністэрства культуры, кінастудыі «Беларусьфільм», Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі і пасольства Беларусі ў Францыі. З тых часоў мы штогод што-небудзь ды вязём паказваць прадстаўнікам кінафестываляў і пракатных арганізацый, кінапрадзюсарам, журналістам і проста калегам.

Сёлета нацыянальны павільён сярод гульнявых фільмаў анансуе карціны сумеснай вытворчасці «Я не вярнуся» (пра яе згадвалася), «Воўчае сонца» Сяргея Гінзбурга, «Павятовая драма» Алега Базілава і «З 8 сакавіка, мужчыны!» Арцёма Анісенкі. Таксама беларуская дэлегацыя паказвае тэлефільмы «Дзяржаўная мяжа» Ігара Чацверыкова, «Ой, ма-мач-кі!..» Івана Паўлава, дзіцячыя карціны «Кіндар-Вілейскі прывід» Алены Туравай, «Цуда-востраў, або Палескія рабінзоны» Сяргея Сычова, «Неверагоднае перамяшчэнне» Аляксандра Анісімава».

Прайшла прэм'ера карціны «Белыя росы. Вяртанне». Ад студыі дакументальнага кіно «Летапіс» прадстаўлены стужкі «Андрэй Такінданг. Спынюся ў сярэдзіне» Ігара Чышчэні і «Шамбала» Галіны Адамовіч. Свае фільмы таксама паказаў і Белвідэацэнтр, а менавіта стужкі «Рускі» Віктара Аслюка, «Волга-Гарона» Уладзіміра Казлова і «Уладзімір Цэслер. Чыз!» Генадзя Рабцава. Паказана шмат анімацыйных работ кінастудыі — працы Ігара Волчака, Ірыны Тарасавай, Аляксандра Ленкіна і іншых рэжысёраў анімацыйнага кіно.

Варта згадаць пра прэзентацыю трэйлера фільма «Мы браты», які абмяркоўваецца пад умоўнай назвай «Авель» — пераможцы адкрытага конкурсу нацыянальнага кінапраекта Міністэрства культуры. У Канах 18 мая яго прэзентавала кінакампанія Nonstop MEDIA, якая ажыццяўляе праект. У сюжэце фільма фігуруюць падзеі снежня 2010 года. Яшчэ адной інтрыгай, якую доўга трымалі ў сакрэце, падаграваючы цікавасць да фільма, стала абвяшчэнне імя магчымай зоркі класа «А» (акрамя Эрыка Робертса). Ёй стала Наталля Шыманчук, ой, прабачце, — Алам. Прыгажуня-актрыса серыялаў, баевікоў і «хорараў». І гэта пасля чутак аб магчымых Шэран Стоўн або Сандры Булак… Яшчэ ў актыве — абсмоктванне ў СМІ кожнага кроку прадзюсараў. Спадзяюся, што канчатковы вынік дасць больш падстаў для разваг аб праекце, чым яго піяр-кампанія.

**Ірэна КАЦЯЛОВІЧ**

■ Прэм'ера

# СПАКУСЫ АД ПАНА-ЧАРНАКНІЖНІКА

## ЗАСТАЦЦА ЖЫВЫМІ — МЭТА ГЕРОЯЎ ФІЛЬМА «ЦУДА-ВОСТРАЎ, АБО ПАЛЕСКІЯ РАБІНЗОНЫ»

**Мірон і Віктар прыплылі на бязлюдны востраў сярод палескіх балот і ўпусцілі свой човен. Так, з акрайцам хлеба, без магчымасці вярнуцца дадому хлопцы сталі выкарыстоўваць кемлівасць і веды, каб прыстасавацца да жыцця на востраве, а затым яшчэ і мужнасць, каб затрымаць небяспечных бандытаў.**

У Дзень піянерыі — 19 мая — у Доме кіно адбылася прэм'ера дзіцячага прыгодніцкага фільма кінастудыі «Беларусьфільм» «Цуда-востраў, або Палескія рабінзоны». У сцэнар, заснаваны на вядомай аповесці Янкі Маўра «Палескія рабінзоны», былі дададзены сюжэтныя лініі, якія прывялі дзіцячую карціну да цікавай трансфармацыі. Прэм'ера прайшла пры поўнай зале з пераважна дзіцячай аўдыторыяй.

Перад гледачом дзіцячая карціна беларускай вытворчасці. Без захапляльных трукаў і спецэфектаў, але тут ёсць цікавая праца са святлом і ручны мядзведзь; без містычных персанажаў, якія ўражваюць уяўленне (хоць у фільме дзейнічае настолькі ж нерэальны, але ў чалавечым вобразе чарадзей), без экспрэсіі і жахаў — але з ідэяй.

У фільме «Цуда-востраў, або Палескія рабінзоны» будуць развівацца тры сюжэтныя лініі, а аповесць Янкі Маўра будзе ўзноўлена толькі ў адной з іх. Пачатак трох сюжэтаў падаецца паралельным мантажом і ствараe інтрыгу. У кінатэатры дзеці вакол мяне былі захопленыя і наперабой каментавалі тое, што адбываецца на экране.

Паводле сюжэту, сучасныя школьнікі Ілья, Мірон і яго сястра Юля сумуюць у вёсцы Баброўка ў дзядулі Сямёна Уладленавіча. Ілья чытае кнігу «Палескія рабінзоны» і выяўляе, што востраў, на якім згубіліся героі аповесці, павінен быць недзе побач. Не доўга думаючы, ён прапануе Мірону і Юлі прайсці па слядах персанажаў кнігі. У вёсцы востраў мае дрэнную містычную славу, аднак гэта не палохае дзяцей, і яны крадуць у дзядулі човен і плывуць на выспу.

У аповесці ў Мірона і Віктара перакуліўся човен, яны апынуліся на палескім востраве без магчымасці вярнуцца дадому. Яны сушаць адзенне, выяўляюць беднасць сваіх запасаў, ноччу хаваюцца пад галінкамі дрэў, а на наступны дзень спрабуюць здабыць агонь і знайсці нешта вострае для замены зніклага нажа. Прыгоды персанажаў Мірона і Віктара падаюцца праз аповед



сучаснага героя Ілы аб падзеях у кнізе.

Трэцяй сюжэтнай лініяй стаў паход дзядулі Сямёна Уладленавіча (ў выкананні Генадзя Аўсяннікава) і журналіста з горада на той жа востраў. Журналіст гэты аказаўся зусім не журналістам, а фанатычным археолагам, які марыць адкрыць сваю Трою і скарбы (як некалі Генрых Шліман), а пакуль адкопвае зброю, што засталася з часоў вайны.

У кожнай сюжэтнай лініі свае героі, аднак сустрэцца ўсім будзе наканавана ў адным і тым жа месцы. Дзіцячы прыгодніцкі фільм пра выжыванне на палескім востраве ператворыцца ў філасофскую прыпавесць. Дзіўна, што дасягаецца гэта зваротам да містычнага элемента. Сцэнарысты дадалі ў карціну тагасветныя неспазнавальныя з'явы, прасцей — цуд, спрадвеку ўласцівы казкам. У карціне «Палескія рабінзоны» героям давядзецца перамясціцца ў часе і апынуцца ў валадарстве Пана — чараўніка і чарнакніжніка, ролю якога выканаў Аляксандр Ткачонак. Гэта ўладанне (эпізоды здымаліся ў Нясвіжскім і Мірскім замках) знаходзіцца ў іншым вымярэнні, у якім дзейнічаюць іншыя законы. У гэтым свеце нішто не прыходзіць у заняпад, ніхто не старэе, грошы і каштоўнасці не маюць значэння.

Тут у свой час (па сюжэце фільма) апынуліся і засталіся дагэтуль персанажы аповесці Янкі Маўра Мірон і Віктар, туды выпадкова перамясціліся дзед Уладленавіч з журналістам-археолагам, а ўслед за дзедам паспяшаліся і Юля з Міронам і Ільём.

Месца дзеяння мяняецца. З гэтага моманту карціна перастае быць дзіцячым прыгодніцкім фільмам. Тут Пан-чарнакніжнік ператварае Юлю ў прынцэсу і прапануе ёй спяваць для яго і мяняць уборы кожны дзень, Мірона ён прываблівае вечным жыццём без сталення (як Пітэр Пэн), разумніка Ілью — вялікай бібліятэкай і магчымасцю дасягнуць найвышэйшай ступені магіі.

**У карціне няма героя, які змог бы зрабіць уражанне на сучаснага школьніка. Такога героя, за якім хацелася б пайсці, на якога можна раўняцца.**

Паводзіны герояў у гэтых умовах расстаўляць усё па сваіх месцах. Маўляў, не патрэбна нам вечнае жыццё, бацькі без нас сумуюць, на тым баку засталося шмат спраў, а Юля наогул не можа спяваць без публікі. Пан, які сабраў у сваёй свіце генералаў, імператараў і простых салдат, пазмагаецца яшчэ за ўвагу новых прышэльцаў, але, расчараваўшыся, стане разважаць аб прычынах такога імкнення ў сапраўдны свет. Там жа хваробы, пакуты, страты! Няўжо толькі смяротны ведае сапраўдную цану жыцця?

Сцэна яго разважання пасля ўцёкаў дзеда з унукамі вельмі цікавая: вяльможны Пан шпацырным крокам ідзе ўдалячынь разам з вялізным мядзведзем (які да гэтага перагароджваў шлях ахвотнікам уцячы), разважае пра жыццё, а мядзведзь з разуменнем бурчыць яму ў адказ. Камера аддаляецца. Стоп.

Мабыць, галоўнае, чаго не хапае карціне, названай прыгодніцкай, — дынамікі. Перанасычанае сучаснай кінапрадукцыяй дзіця адчуе гэта з першых эпізодаў, яму будзе не хапаць інтрыгі, напружанасці, чакання. Але музычны матыў у карціне — дэтэктыўны, напружаны. Гэта нараджае дысананс з дзеяннем фільма, музыка часта не адпавядае эпізоду.

Акрамя таго, у карціне няма героя, які змог бы зрабіць уражанне на сучаснага школьніка. Такога героя, за якім хацелася б пайсці, на якога можна раўняцца.

Асноўная частка фільма здымалася ў Бярэзінскім запаведніку. Вялікая ўвага ў карціне была нададзена прыродзе: яе адлюстраванне можна назваць ужо тэндэнцыяй у беларускім кіно. У «Цуда-востраве...» гэта не толькі натурныя здымкі і «зялёны» антураж сцэн, але і перыядычнае з'яўленне птушак у сваім натуральным асяроддзі.



«Цуда-востраў, або Палескія рабінзоны» зняты ў фармаце тэлевізійнага двухсерыйнага фільма. Ці будзе глядач чакаць другой серыі? Цікавы арыгінальны сцэнар, на жаль, зняты павольна і неэмацыйна, а ў сучаснага дзіцяці шмат кінаальтэрнатыў. Яго складана затрымаць ля экрана, сама па сабе фатаграфія, якая рухаецца, не з'яўляецца цудам, а кінапаказ — не падзея, як было для мінулых пакаленняў. Глядзець беларускі фільм толькі таму, што ён беларускі — недастатковая матывацыя, а прырода — не навінка для гледача.

Аднак гэты фільм стаў адной з трох дзіцячых карцін, створаных «Беларусьфільмам» за перыяд 2013–2014 гадоў. Акрамя яго, на кінастудыі знятыя «Кіндар-Вілейскі прывід» Алены Туравай па навеле Оскара Уайльда «Кентэрвільскі прывід» і дэбют Аляксандра Анісімава ў іграввым кіно «Неверагоднае перамяшчэнне». Усе тры карціны паказаныя калегам беларускім прадстаўніцтвам у Канах. Неўзабаве фільм «Цуда-востраў, або Палескія рабінзоны» павінен будзе ўдзельнічаць у конкурснай праграме дзіцячага кіно на кінафестывалі «Залаты Віцязь» у Томску, а рэжысёру Сяргею Сычову прапанавана стаць членам журы ігравых фільмаў.

**Ірэна КАЦЯЛОВІЧ**

■ Акцыя

# САЛОДКІ СТОЛ — СА ЗНІЖКАМІ

**У маі ў гандлёвых арганізацыях сталіцы прадпрыемствы перапрацоўчай прамысловасці праводзяць для ўсіх пакупнікоў акцыі па зніжэнні цэн, паведамілі ў галоўным упраўленні спажывецкага рынку Мінгарвыканкама.**

Мінскі малочны завод № 1 знізіў адпускную цану на прадукцыю на 10 працэнтаў. У шэрагу гандлёвых сетак і гандлёвых арганізацый цэны зніжаны на шырокі асартымент малочнай прадукцыі — маянэз, ёгурты, глазураваныя сыркі, стэрылізаванае дзіцячае малако, смятану, маянэзныя соусы і іншае. Кандытарская фабрыка «Слодыч» праводзіць агульнарэспубліканскую акцыю па зніжэнні адпускной цаны на 15 працэнтаў па 16 пазіцыях печыва. «Камунарка» ў сетцы крам «Алмі» праводзіць акцыю па зніжэнні цаны на 15 працэнтаў на цёмны дэсертны шакалад «Залатая пяцёрка», які быў выпушчаны спецыяльна да чэмпіянату свету па хакеі. Апроч гэтага, у шэрагу гандлёвых сетак і гандлёвых арганізацый зніжкі ў памеры ад 10 да 20 працэнтаў будуць дзейнічаць прыкладна на 40 найменняў цукерак («Чырвоны каптурок», «Любімая Алёнка», «Мішка на паляне», «Беларускія», «Чарнаморачка», «Мінскі грыльяж» і іншыя).

**Сяргей РАСОЛЬКА**

■

УНП 100896485

## ИЗМЕНЕНИЯ В ПРОСПЕКТ ЭМИССИИ ЖИЛИЩНЫХ ОБЛИГАЦИЙ ЧЕТВЕРТОГО ВЫПУСКА

Закрытого акционерного общества «ТОПЗАПЭЛЕКТРО» (ЗАО «ТОПЗАПЭЛЕКТРО»)

**1. Пункт 1.4. изложить в следующей редакции:**

**«1.4. Номер расчетного счета эмитента, на который будут зачисляться средства, поступающие при проведении открытой продажи, наименование обслуживающего банка**

Денежные средства при проведении открытой продажи жилищных облигаций четвертого выпуска эмитента (далее по тексту – облигации) будут поступать на расчетные счета эмитента:

№ 3012004261000 в ЗАО «Идея Банк», код 755 (г. Минск, ул. К. Маркса, д. 25, УНП 807000122);

№ 3012132420016 в ЗАО «МТБанк», код 117 (г. Минск, Партизанский пр-т, 6А, УНП 100394906).»

**2. Пункт 1.14. изложить в следующей редакции:**

**«1.14. Сотрудники эмитента, имеющие квалификационный аттестат на право деятельности на рынке ценных бумаг**

Лиля Евгения Васильевна, квалификационный аттестат 3-й категории № 5200-3-16786 от 23.04.2014, телефон: 8 (017) 363-16-15.»

От эмитента:

Генеральный директор — В.Н. Косило.

Главный бухгалтер — М.Л. Гришилова.

*Уважаемые акционеры ОАО «Рапс»*

**04 июня 2014 года**

**СОСТОИТСЯ ВНЕОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ**

## ОАО «Рапс»,

*расположенного по адресу: Минская обл., Минский район, 223014, аг. Крупица. Собрание пройдет по адресу: Минская обл., Минский район, аг. Крупица, ул. Садовая, д. 20, административное здание ОАО «Рапс», первый этаж, актовый зал.*

**ПОВЕСТКА ДНЯ СОБРАНИЯ:**

1. Об увеличении размера уставного фонда путем увеличения номинальной стоимости акций.
2. Об утверждении новой редакции Устава ОАО «Рапс».
3. О продаже жилых домов (квартир), построенных (реконструированных, приобретенных) с привлечением льготных кредитов, полученных в открытом акционерном общества «Белагропромбанк».

С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться по адресу: Минская обл., Минский район, аг. Крупица, ул. Садовая, д. 20, ОАО «Рапс» (бухгалтерия) с 28 мая по 03 июня 2014 года (время работы с 14.00 до 16.00) либо 04 июня 2014 г. по месту проведения собрания.

Регистрация участников собрания с 10.00 до 11.00 по месту проведения собрания.

**Начало работы собрания — 04 июня 2014 г., в 11.00.**

Список акционеров для участия в собрании будет составлен по состоянию реестра на 28 мая 2014 года.

**Для регистрации при себе иметь следующие документы: акционеру общества — паспорт, представителю акционера — паспорт и доверенность, заверенную в установленном порядке!**

Справки по тел.: 8 (017) 506 92 11, 8(017) 506 93 41.

УНП 600068480

# ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

**Государственное производственное объединение**

## «Минскстрой»

220050, г. Минск, ул. К. Маркса, 13А

режим работы: с 8.30 до 17.45, перерыв – 13.00–14.00, тел. 327-52-36, 226-03-01

Зарегистрировано решением Мингорисполкома от 18 января 2007 г. № 140 в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей № 100071325.

Сведения о жилых домах, в строительстве которых, выполняя функции заказчика, принимал участие застройщик в течение 3-х лет, предшествующих опубликованию настоящей декларации, с указанием фактических сроков строительства:

- ул. Чичурина, д. 6 – 10 мес., ул. Чичурина, д. 12 – 11 мес., ул. Чичурина, д. 14 – 18 мес., ул. Чичурина, д. 18 – 17 мес., ул. Чичурина, д. 20 – 27 мес., пр-т газеты «Правда», д. 3 – 24 мес., ул. Панченко, д. 10 – 11 мес., ул. Панченко, д. 10А – 12 мес., ул. Матусевича, д. 56 – 23 мес.

**Объединение осуществляет строительство объекта «Многоквартирные жилые дома №№ 11, 12 по генплану в квартале жилой застройки пр. Дзержинского – ул. Алибегова – пр. Газеты «Правда». Жилой дом № 11 (по генплану) со встроенными помещениями и подземной автостоянкой.**

Свидетельство (удостоверение) № 500/938-4356 о государственной регистрации создания земельного участка и возникновения права пользования на него от 29 декабря 2011 года.

Земельный участок площадью 0,1891 га. Проектом предусмотрено устройство подъездов, пешеходных связей, установка малых архитектурных форм, озеленение, организация детских игровых, спортивных, хозяйственных площадок.

Жилой дом запроектирован 9-этажным, состоит из 2 секций, имеет техническое подполье и теплый чердак. Количество квартир – 88. На первом этаже запроектированы блоки офисных помещений № 1, № 2, № 3 и помещение товарищества собственников.

Начало строительства жилого дома – август 2013 года.

Предполагаемый срок ввода в эксплуатацию в соответствии с ПОС – ноябрь 2014 года.

Проектно-сметная документация прошла в установленном порядке государственную экспертизу от 27.07.2011 № 512-15/11.

Договоры создания объекта долевого строительства будут заключаться на строительство блока офисных помещений № 1.

Предметом договора будет являться строительство нежилого помещения.

Стоимость строительства 1 кв. метра площади по экспликации помещений без выполнения внутренних отделочных работ в текущих ценах составляет 3100 долларов США.

Стоимость 1 кв. метра площади фиксируется в долларовом США эквиваленте и остается неизменной в долларовом США эквиваленте до окончания действия договора создания объекта долевого строительства. Оплата производится в белорусских рублях по курсу Национального банка Республики Беларусь на дату зачисления денежных средств на специальный и расчетный счет застройщика.

В состав общего имущества в многоквартирном жилом доме, которое подлежит передаче в долевую собственность, входят: межквартирные лестничные клетки, лестницы, лифты, лифтовые и иные шахты, коридоры, крыша, технические этажи и подвал, другие места общественного пользования, несущие, ограждающие ненесущие конструкции, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование, находящееся за пределами или внутри жилых и нежилых помещений.

Договор строительного подряда от 03.05.2013 № 123С-05-13, генподрядчик – ОАО «Стройтрест № 35».

Заявления о долевом строительстве нежилых помещений будут приниматься (регистрироваться) через 5 календарных дней, а договоры создания объекта долевого строительства будут заключаться через 7 календарных дней после опубликования настоящей декларации в кабинете 105 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 13А непосредственно с гражданами, подавшими заявления, либо с их представителями, действующими на основании доверенности, оформленной в установленном законодательством порядке, юридическими лицами и индивидуальными предпринимателями.

Если гражданин либо иной претендент на участие в долевом строительстве в течение 5 (пяти) календарных дней с момента регистрации его заявления не явился для заключения договора и не сообщил об уважительных причинах своей неявки, его заявление на участие в долевом строительстве утрачивает силу и ГПО «Минскстрой» оставляет за собой право заключить договор на заявленную квартиру с другим претендентом.

*Генеральный директор — Н.В. Милошевский*

Судом **Ленинского района города Минска** по заявлению РУП «Белпочта» разыскивается РАСОЛЬКО Александр Александрович, 26 августа 1964 года рождения, проживавший в г. Минске по ул. Кульман, 21. Просьба гражданам и юридическим лицам, имеющим любые сведения, сообщить суду Ленинского района г. Минска в двухмесячный срок со дня публикации.

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ В ЧАСТНУЮ СОБСТВЕННОСТЬ ДЛЯ СТРОИТЕЛЬСТВА И ОБСЛУЖИВАНИЯ ЖИЛЫХ ДОМОВ

## Организатор: Круглицкий сельский исполнительный комитет Чашникского района Витебской области

| № лота | Местоположение земельного участка, его площадь и кадастровый номер | Целевое назначение | Условия и ограничения | Расходы по подготовке и изготовлению документации, руб. | Начальная цена, руб. | Сумма залога, руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Д. Хотлино, ул. Набережная, д. 5А, площадь — 0,2292 га, кадастровый номер 225182312101000022 | Для строительства и обслуживания жилого дома | Водоохранная зона озера Хотлинское | 8 019 470 | 3 663 533 | 366 350 |
| 2 | Д. Хотлино. ул. Набережная, д. 5Б, площадь — 0,2106 га, кадастровый номер 225182312101000021 | Для строительства и обслуживания жилого дома | Водоохранная зона озера Хотлинское | 7 344 316 | 3 366 230 | 336 650 |

1. **Аукцион состоится 24 июня 2014 года в 15.00 по адресу: д. Круглица, д. 15, сельисполком.**

2. Заявления от граждан Республики Беларусь на участие в торгах принимаются по рабочим дням с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по адресу: Витебская область, Чашникский район, деревня Круглица, д. 15, сельисполком. **Последний день приема заявлений 18 июня 2014 года до 17.00.**

3. Для участия в аукционе необходимо представить копию паспорта гражданина (без нотариального засвидетельствования); представителю гражданина — нотариально удостоверенную доверенность, а также копию паспорта доверенного лица; копию платежного документа, подтверждающего уплату налога на расчетный счет 3641326042200 ЦБУ № 222 филиала № 215 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Орша, код 647, УНП 300986823, код платежа 04901, получатель Круглицкий сельский исполнительный комитет.

4. Аукцион состоится при наличии не менее двух участников.

5. Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с документами и земельными участками в натуре.

**Контактные телефоны: 8 (02133) 2-58-35, 8 (02133) 2-58-45.**

## РУП «Институт недвижимости и оценки»

► **ОЦЕНКА ИМУЩЕСТВА**
(недвижимость, транспорт, оборудование, бизнес, интеллектуальная собственность)
► **ОРГАНИЗАЦИЯ И ПРОВЕДЕНИЕ АУКЦИОНОВ**

## извещает о проведении открытого аукциона по продаже имущества ОАО «Белдортехника»

| Лот № 1 | Адрес: Минская обл., Смолевичский р-н, г. Смолевичи, ул. Торговая, д. 14Б | Начальная цена с НДС, руб. | Задаток с НДС, руб. | Шаг аукциона, % |
|---|---|---|---|---|
| | | 2 748 105 600 | 274 810 560 | 5 |

1. Производственный корпус «Арочник» с инв. № 614/С-1827. Назначение – производственный корпус «Арочник». Год постройки – 1991. Этажей – 1. Площадь застройки / общая – 1355 м² / 1311,9 м². Фундамент – бутобетон. Стены – к/панели. Перегородки – кирпичные. Крыша – металлопрофиль. Полы – бетонные. Проемы оконные, дверные – простой работы. Отопление, водопровод – металлические трубы. Электроснабжение – скрытая проводка. Канализация – чугунные трубы. Вентиляция – естественная. Составные части и принадлежности: пристройка.
2. Заглубсклад светлых нефтепродуктов № 2 с инв. № 614/С-20767. Назначение – заглубсклад светлых нефтепродуктов № 2. Год постройки – 1991. Этажей – 1. Площадь застройки / общая – 57 м² / 44,5 м². Фундамент – бетон. Стены – кирпичные. Перегородки – блоки. Перекрытия чердачные – бетонные. Крыша – шиферная. Полы – бетонные. Проемы оконные – простые, стеклоблоки. Проемы дверные – простые, металлические. Вентиляция – естественная.
3. Склад пропана с инв. №614/С-22690. Назначение – склад пропана. Этажей – 1. Площадь застройки / общая – 19 м² / 18,6 м². Фундамент, полы – бетон. Стены – металлический каркас, огражден металлической сеткой. Крыша – шиферная. Проемы дверные – металлические.

**ОБРЕМЕНЕНИЯ**

Производственный корпус «Арочник» с инв. № 614/С-1827 сдается по договору аренды на срок по 15.01.2017 (арендуемая площадь 1311,9 м²).

**ЗЕМЕЛЬНЫЙ УЧАСТОК**

Земельный участок площадью 6,8032 га с кадастровым номером 624850100002000086. Целевое назначение – земельный участок для обслуживания зданий и сооружений по ул. Торговой, 14б, в г. Смолевичи. На земельном участке расположены иные объекты, которые не выставляются на аукцион. Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь.

**УСЛОВИЯ**

Победитель аукциона либо в случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано только одним участником и он согласен приобрести Объект по начальной цене, увеличенной на 5% (пять процентов) - Претендент на покупку, должен заключить с Продавцом договор купли-продажи Объекта в течение 5 (пяти) банковских дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.

Условия оплаты приобретенного на аукционе Объекта согласовываются Победителем аукциона (Претендентом на покупку) и Продавцом при заключении договора купли-продажи Объекта.

Победитель аукциона (Претендент на покупку) оплачивает организатору аукциона вознаграждение в размере 3% (трех процентов) от цены продажи Объекта в течение 3 (трех) банковских дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.

На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя аукциона.

**Цель использования Объекта согласно целевому назначению не ограничивается.**

**Аукцион состоится 26.06.2014 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3 этаж, каб. 4.**

Для участия в аукционе приглашаются граждане, юр. лица и индивидуальные предприниматели Республики Беларусь, иностранные инвесторы, подавшие заявление на участие в аукционе (по форме, установленной Организатором аукциона); предоставившие заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка, заявление об ознакомлении с документами, продаваемым Объектом (по форме, установленной Организатором аукциона) и заключившие с Организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (по форме, установленной Организатором аукциона), а также прилагаются следующие документы: юр. лица – доверенность, выданную представителю юр. лица, копии учредительных документов, свидетельства о гос. регистрации и извещения о присвоении УНП; индивидуальные предприниматели – копию свидетельства о гос. регистрации и извещения о присвоении УНП; физ. лица – паспорт, представители физ. лиц – паспорт и доверенность, удостоверенную нотариально; организациям и физ. лицам (нерезидентам РБ) – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть проведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о состоятельности, выданный обслуживающим его банком или иной кредитно-финансовой организацией, с заверенным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык; представители юр. и физ. лиц (нерезиденты РБ) – легализованную в установленном порядке доверенность. При подаче документов заявитель (представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юр. лица – документ, подтверждающий полномочия. Подача документов по почте не допускается. Сведения об участниках аукциона не подлежат разглашению.

Задаток перечисляется на р/с 3012154337010 в ОАО «БПС-Сбербанк» ЦБУ № 703, 220004, г. Минск, ул. Кальварийская, д. 4а, код 369. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже имущества ОАО «Белдортехника», **проводимом 26 июня 2014 г.**

Задаток, уплаченный участником аукциона, ставшим Победителем (Претендентом на покупку), будет засчитан в счет окончательной стоимости Объекта. Задаток, уплаченный участниками аукциона, не ставшими Победителем аукциона, Организатор аукциона возвращает безналичным платежом на их счета в течение 5 (пяти) банковских дней со дня проведения аукциона (назначенной даты его проведения в случае признания аукциона несостоявшимся) или с момента регистрации Организатором аукциона отказа от участия в аукционе.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 2. Окончание приема заявлений **24.06.2014 в 12.00.**

Заключительная регистрация участников **26.06.2014 с 10.30 до 11.00** по месту проведения аукциона.

Все желающие могут предварительно ознакомиться с Объектом аукциона. Контактное лицо для осмотра Объекта: Конюшик Наталья Владимировна, 8 (029) 3345442, Павленко Юрий Владимирович, 8 (029) 758-15-84.

Организатор аукциона или Продавец вправе снять Объект (лот) с торгов до объявления его проданным без объяснения причин снятия.

**☎ Организатор: 8 (017) 306-00-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: 5538325@mail.ru**

## ЯНУШКОВИЧСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ

**проводит аукцион по продаже земельных участков в частную собственность гражданам Республики Беларусь для обслуживания одноквартирных жилых домов 26.06.2014 г. в 10.00 по адресу: Логойский район, д. Янушковичи, ул. Центральная, д. 36.**

| № п/п | Адрес земельного участка | Площадь земельного участка | Наименование инженерных сетей | Начальная цена (бел. рублей) | Задаток (бел. рублей) | Расходы по документации |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Аскрышино, участок № 1, кадастровый № 623288000601000028 | 0,2500 га | Электроснабжение | 17 113 000 | 3 422 600 | 4 194 600 |
| 2 | Серпищено, участок № 1, кадастровый № 623288014101000036 | 0,1958 га | Электроснабжение | 13 596 400 | 2 719 300 | 4 194 000 |
| 3 | д. Жабичи, участок № 3, кадастровый № 623288005101000022 | 0,2427 га | Электроснабжение | 18 057 000 | 3 611 400 | 4 194 600 |
| 4 | д. Серпищено, участок № 2, кадастровый № 623288014101000037 | 0,2129 га | Электроснабжение | 14 784 000 | 2 956 800 | 4 194 000 |

Задаток перечисляется на р/счет № 3600619171100 в ЦБУ 611ф-ла 500 Минское управление АСБ «Беларусбанк», МФО 153001601, УНП 600181536, Янушковичский сельский исполнительный комитет, код платежа 04901

Победитель аукциона обязан в течение 10 (десяти) рабочих дней после утверждения протокола о результатах аукциона внести плату за земельный участок и возместить расходы, связанные с подготовкой документации. Аукцион состоится **26.06.2014 г. в 10.00** по адресу: Логойский район, д. Янушковичи, ул. Центральная, д. 36.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются до 20.06.2014 г. (последний день подачи заявления **20.06.2014 г. до 17.00**) по адресу: Логойский район, д. Янушковичи, ул. Центральная, д. 36.

Контактные телефоны: (801774) 57-4-35, 57-4-99.

Белгазпромбанк
Энергия твоего будущего!

## Совместное белорусско-российское ОАО «Белгазпромбанк»

220121, г. Минск, ул. Притыцкого, 60/2. Телефон для справок: 120

### БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС ПО СОСТОЯНИЮ НА 31 ДЕКАБРЯ 2013 ГОДА

(в миллионах белорусских рублей)

| | 31 декабря 2013 года | 31 декабря 2012 года |
|---|---|---|
| **АКТИВЫ:** | | |
| Денежные средства и их эквиваленты | 2,207,376 | 2,434,256 |
| Драгоценные металлы | 9,373 | 16,345 |
| Ценные бумаги, отражаемые по справедливой стоимости через прибыли или убытки | 664,295 | 561,188 |
| Производные финансовые инструменты, активы | 1,480,897 | 1,468,040 |
| Средства в Национальном банке Республики Беларусь, банках и иных финансовых учреждениях | 351,417 | 451,173 |
| Кредиты, предоставленные клиентам | 9,242,660 | 7,191,010 |
| Инвестиции, имеющиеся в наличии для продажи | 649,258 | 154,464 |
| Основные средства и нематериальные активы | 487,469 | 396,974 |
| Внеоборотные активы, предназначенные для продажи | 16,318 | 40,537 |
| Инвестиционная недвижимость | 4,055 | - |
| Прочие активы | 144,354 | 107,065 |
| **ИТОГО АКТИВЫ** | **15,257,472** | **12,821,052** |
| **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА И КАПИТАЛ** | | |
| **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА:** | | |
| Производные финансовые инструменты, обязательства | 501 | 4,299 |
| Средства банков и иных финансовых учреждений | 4,406,831 | 2,831,300 |
| Счета клиентов | 7,337,527 | 6,654,972 |
| Выпущенные долговые ценные бумаги | 620,083 | 415,283 |
| Обязательства по текущему налогу на прибыль | 45,848 | 18,190 |
| Обязательства по отложенному налогу на прибыль | 67,178 | 86,552 |
| Прочие обязательства | 69,947 | 67,425 |
| Итого обязательства | 12,547,915 | 10,078,021 |
| **КАПИТАЛ:** | | |
| Уставный капитал | 2,694,339 | 2,694,339 |
| Фонд переоценки по справедливой стоимости инвестиций, имеющихся в наличии для продажи | (10,415) | 9,986 |
| Нераспределенная прибыль | 25,633 | 38,706 |
| Итого капитал | 2,709,557 | 2,743,031 |
| **ИТОГО ОБЯЗАТЕЛЬСТВА И КАПИТАЛ** | **15,257,472** | **12,821,052** |

### ОТЧЕТ О ПРИБЫЛИ И УБЫТКАХ ЗА ГОД, ЗАКОНЧИВШИЙСЯ 31 ДЕКАБРЯ 2013 ГОДА

(в миллионах белорусских рублей)

| | Год, закончившийся 31 декабря 2013 года | Год, закончившийся 31 декабря 2012 года |
|---|---|---|
| Процентные доходы | 1,589,172 | 1,571,735 |
| Процентные расходы | (794,345) | (856,001) |
| ЧИСТЫЙ ПРОЦЕНТНЫЙ ДОХОД ДО ФОРМИРОВАНИЯ РЕЗЕРВОВ ПОД ОБЕСЦЕНЕНИЕ АКТИВОВ, ПО КОТОРЫМ НАЧИСЛЯЮТСЯ ПРОЦЕНТЫ | 794,827 | 715,734 |
| Формирование резервов под обесценение активов, по которым начисляются проценты | (110,443) | (82,111) |
| Восстановление ранее списанных активов | 15,153 | 26,280 |
| ЧИСТЫЙ ПРОЦЕНТНЫЙ ДОХОД | 699,537 | 659,903 |
| Чистый (убыток)/ прибыль по операциям с иностранной валютой | (45,422) | 125,495 |
| Чистая прибыль по операциям с финансовыми инструментами, отражаемыми по справедливой стоимости через прибыли или убытки | 202,598 | 245,404 |
| Доходы по услугам и комиссии | 296,157 | 254,705 |
| Расходы по услугам и комиссии | (64,540) | (47,349) |
| Чистый (убыток)/ прибыль по операциям с драгоценными металлами | (193) | 5,843 |
| (Формирование)/ Восстановление резервов по прочим операциям | (2,936) | 7,261 |
| Прочие доходы | 22,331 | 21,216 |
| ЧИСТЫЕ НЕПРОЦЕНТНЫЕ ДОХОДЫ | 407,995 | 612,575 |
| ОПЕРАЦИОННЫЕ ДОХОДЫ | 1,107,532 | 1,272,478 |
| ОПЕРАЦИОННЫЕ РАСХОДЫ | (579,377) | (472,515) |
| Убыток по чистой денежной позиции в связи с инфляцией | (340,120) | (369,509) |
| ПРИБЫЛЬ ДО НАЛОГООБЛОЖЕНИЯ | 188,035 | 430,454 |
| Расходы по налогу на прибыль | (81,701) | (103,089) |
| ЧИСТАЯ ПРИБЫЛЬ | 106,334 | 327,365 |

### ОТЧЕТ ОБ ИЗМЕНЕНИИ КАПИТАЛА ЗА ГОД, ЗАКОНЧИВШИЙСЯ 31 ДЕКАБРЯ 2013 ГОДА

(в миллионах белорусских рублей)

| | Уставный капитал | Фонд переоценки по справедливой стоимости инвестиций, имеющихся в наличии для продажи | (Непокрытый убыток)/ нераспределенная прибыль | Итого капитал |
|---|---|---|---|---|
| 31 декабря 2011 года | 1,611,398 | (3,350) | (217,621) | 1,390,427 |
| Дополнительные взносы в уставный капитал | 1,082,941 | - | - | 1,082,941 |
| Итого совокупный доход за год | | 13,336 | 327,365 | 340,701 |
| Дивиденды объявленные | - | - | (71,038) | (71,038) |
| 31 декабря 2012 года | 2,694,339 | 9,986 | 38,706 | 2,743,031 |
| Итого совокупный доход за год | - | (20,401) | 106,334 | 85,933 |
| Дивиденды объявленные | - | - | (119,407) | (119,407) |
| 31 декабря 2013 года | 2,694,339 | (10,415) | 25,633 | 2,709,557 |

### ОТЧЕТ О СОВОКУПНОМ ДОХОДЕ ЗА ГОД, ЗАКОНЧИВШИЙСЯ 31 ДЕКАБРЯ 2013 ГОДА

(в миллионах белорусских рублей)

| | Год, закончившийся 31 декабря 2013 года | Год, закончившийся 31 декабря 2012 года |
|---|---|---|
| ЧИСТАЯ ПРИБЫЛЬ | 106,334 | 327,365 |
| ПРОЧИЙ СОВОКУПНЫЙ (УБЫТОК)/ДОХОД | | |
| Статьи, которые впоследствии могут быть реклассифицированы в состав прибылей или убытков: | | |
| Совокупный убыток перенесенный в отчет о прибыли и убытках при выбытии инвестиций, имеющихся в наличии для продажи | 55 | 23 |
| Изменение справедливой стоимости инвестиций, имеющихся в наличии для продажи | (20,456) | 13,313 |
| ИТОГО ПРОЧИЙ СОВОКУПНЫЙ (УБЫТОК)/ДОХОД | (20,401) | 13,336 |
| ИТОГО СОВОКУПНЫЙ ДОХОД | 85,933 | 340,701 |

### ОТЧЕТ О ДВИЖЕНИИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ ЗА ГОД, ЗАКОНЧИВШИЙСЯ 31 ДЕКАБРЯ 2013 ГОДА

(в миллионах белорусских рублей)

| | Год, закончившийся 31 декабря 2013 года | Год, закончившийся 31 декабря 2012 года |
|---|---|---|
| **ДВИЖЕНИЕ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ ОТ ОПЕРАЦИОННОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ:** | | |
| Прибыль до налогообложения и отражения убытка по чистой денежной позиции | 528,155 | 799,963 |
| Корректировки: | | |
| Формирование резервов под обесценение активов, по которым начисляются проценты | 110,443 | 82,111 |
| Формирование/ (восстановление) резервов по прочим операциям | 2,936 | (7,261) |
| Чистое изменение справедливой стоимости производных финансовых инструментов | (238,675) | (179,741) |
| Чистое изменение справедливой стоимости драгоценных металлов | 1,017 | 164 |
| Чистое изменение справедливой стоимости ценных бумаг, отражаемых по справедливой стоимости через прибыли или убытки | 4,473 | (79,999) |
| Эффект от признания активов по нерыночной ставке | 2,673 | 1,895 |
| Амортизация основных средств и нематериальных активов | 45,238 | 36,359 |
| Доход от реализации основных средств и внеоборотных активов, предназначенных для продажи | (5,180) | (11,545) |
| Формирование обязательств по оплате труда | 6,084 | 8,627 |
| Чистое изменение начисленных процентных доходов и расходов | (82,724) | (65,095) |
| Чистое изменение начисленных комиссионных доходов и неустойки | (5,425) | (1,845) |
| Убыток от продажи инвестиций, имеющихся в наличии для продажи | 55 | 23 |
| Курсовые разницы, нетто | 115,583 | (59,092) |
| Движение денежных средств от операционной деятельности до изменения операционных активов и обязательств | 484,653 | 524,564 |
| Изменение операционных активов и обязательств | | |
| (Увеличение)/ уменьшение операционных активов: | | |
| Минимальные обязательные резервы в Национальном банке Республики Беларусь | (27,077) | (46,098) |
| Средства в банках и иных финансовых учреждениях | 106,129 | (387,347) |
| Драгоценные металлы | 3,999 | 46,626 |
| Ценные бумаги, отражаемые по справедливой стоимости через прибыли или убытки | (126,835) | 231,214 |
| Кредиты, предоставленные клиентам | (2,633,300) | (2,588,774) |
| Прочие активы | (44,736) | (10,598) |
| Увеличение/(уменьшение) операционных обязательств: | | |
| Кредиты Национального банка Республики Беларусь | - | (2 420) |
| Средства банков и иных финансовых учреждений | 958,258 | 313,437 |
| Средства клиентов | 1,189,650 | 2,192,712 |
| Прочие обязательства | (6,170) | (3,264) |
| (Отток)/приток денежных средств от операционной деятельности до налогообложения | (95,429) | 270,052 |
| Налог на прибыль уплаченный | (68,412) | (45,454) |
| Чистый (отток)/приток денежных средств от операционной деятельности | (163,841) | 224,598 |
| **ДВИЖЕНИЕ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ ОТ ИНВЕСТИЦИОННОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ:** | | |
| Приобретение основных средств и нематериальных активов | (126,912) | (94,940) |
| Поступления от реализации объектов основных средств и нематериальных активов | 6,724 | 23,310 |
| Поступления от реализации внеоборотных активов, предназначенных для продажи | 21,333 | 1,385 |
| (Приобретение)/поступления от погашения инвестиций, имеющихся в наличии для продажи, нетто | (558,678) | (111,341) |
| Чистый отток денежных средств от инвестиционной деятельности | (657,533) | (181,586) |
| **ДВИЖЕНИЕ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ ОТ ФИНАНСОВОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ:** | | |
| Погашение субординированного займа | - | (490,606) |
| Взносы в уставный фонд | - | 1,082,941 |
| Поступления от выпуска долговых ценных бумаг, нетто | 219,730 | 88,853 |
| Погашение кредитов международных финансовых организаций | (395,479) | (421,323) |
| Привлечение кредитов международных финансовых организаций | 1,162,049 | 262,646 |
| Дивиденды уплаченные | (119,407) | (71,038) |
| Чистый приток денежных средств от финансовой деятельности | 866,893 | 451,473 |
| ЧИСТОЕ УВЕЛИЧЕНИЕ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ И ИХ ЭКВИВАЛЕНТОВ | 45,519 | 494,485 |
| Влияние изменения курсов иностранных валют на денежные средства и их эквиваленты | 76,791 | 69,933 |
| Влияние изменения инфляции на денежные средства и их эквиваленты | (349,190) | (480,710) |
| ДЕНЕЖНЫЕ СРЕДСТВА И ИХ ЭКВИВАЛЕНТЫ, на начало года | 2,434,256 | 2,350,548 |
| ДЕНЕЖНЫЕ СРЕДСТВА И ИХ ЭКВИВАЛЕНТЫ, на конец года | 2,207,376 | 2,434,256 |

Сумма процентов, уплаченных и полученных Банком в течение года, закончившегося 31 декабря 2013 года, составила 779,341 млн. руб. и 1,491,444 млн. руб., соответственно.

Сумма процентов, уплаченных и полученных Банком в течение года, закончившегося 31 декабря 2012 года, составила 863,799 млн. руб. и 1,514,438 млн. руб., соответственно.

В течение периодов, закончившихся 31 декабря 2013 и 2012 годов, Банк получил недвижимое имущество (административные и прочие нежилые помещения) в качестве отступного по кредитам на сумму 1,119 млн. руб. и 47,572 млн. руб., соответственно, что представляет собой неденежные операции.

От имени Правления Банка:

**Председатель правления**
**В.Д. Бабарико**
18 марта 2014 года
Минск

**Главный бухгалтер**
**Т.М. Пивовар**
18 марта 2014 года
Минск

*Лицензия на осуществление банковской деятельности № 8 выдана Национальным банком Республики Беларусь 24.05.2013. УНП 100429079*

Deloitte.

Иностранное унитарное предприятие «Делойт и Туш»
ул. Короля, 51
Минск, 220004
Республика Беларусь

Тел.: +375 (17) 200 03 53
Факс: +375 (17) 200 04 14
www.deloitte.by

### ОТЧЕТ НЕЗАВИСИМОГО АУДИТОРА ПО СОКРАЩЕННОЙ ФИНАНСОВОЙ ОТЧЕТНОСТИ

Совету директоров и акционерам Совместного белорусско-российского открытого акционерного общества «Белгазпромбанк»

Прилагаемая публикуемая сокращенная финансовая отчетность, которая включает бухгалтерский баланс по состоянию на 31 декабря 2013 года и соответствующие отчеты о прибыли и убытках, о совокупном доходе, об изменении капитала, о движении денежных средств за год, закончившийся 31 декабря 2013 года, составлена на основе аудированной финансовой отчетности ОАО «Белгазпромбанк», составленной в соответствии с требованиями Международных стандартов финансовой отчетности, за год, закончившийся 31 декабря 2013 года. Мы выразили безусловно положительное мнение в отношении финансовой отчетности ОАО «Белгазпромбанк» в аудиторском заключении от 3 марта 2014 года. Аудированная финансовая отчетность и публикуемая сокращенная финансовая отчетность не отражают влияния событий, произошедших после даты аудиторского заключения.

В данной публикуемой сокращенной финансовой отчетности не раскрывается вся информация, требуемая Международными стандартами финансовой отчетности. Поэтому ознакомление с сокращенной годовой финансовой отчетностью не заменяет ознакомления с аудированной финансовой отчетностью ОАО «Белгазпромбанк».

***Ответственность руководства за подготовку сокращенной финансовой отчетности***

Руководство Банка несет ответственность за подготовку данной публикуемой сокращенной финансовой отчетности на основе аудированной финансовой отчетности в соответствии с требованиями Инструкции о раскрытии информации о деятельности банка, небанковской кредитно-финансовой организации, банковской группы и банковского холдинга, утвержденной Постановлением Правления Национального банка Республики Беларусь № 19 от 11 января 2013 года.

***Ответственность аудитора***

Наша ответственность состоит в выражении мнения о данной публикуемой сокращенной финансовой отчетности на основе процедур, проведенных в соответствии с Международным стандартом аудита (МСА) 810 «Аудиторские задания по сокращенной финансовой отчетности».

**Мнение**

По нашему мнению, прилагаемая публикуемая сокращенная финансовая отчетность, подготовленная на основе аудированной финансовой отчетности ОАО «Белгазпромбанк» за год, закончившийся 31 декабря 2013 года, соответствует этой финансовой отчетности во всех существенных аспектах, в соответствии с требованиями Инструкции о раскрытии информации о деятельности банка, небанковской кредитно-финансовой организации, банковской группы и банковского холдинга, утвержденной Постановлением Правления Национального банка Республики Беларусь № 19 от 11 января 2013 года.

В целях более точного понимания финансового положения ОАО «Белгазпромбанк» по состоянию на 31 декабря 2013 года и результатов его деятельности и движения денежных средств за год, закончившийся на эту дату, публикуемую сокращенную годовую финансовую отчетность следует изучать вместе с аудированной финансовой отчетностью, которая была размещена в полном объеме на сайте Банка http://www.belgazprombank.by.

г. Минск, Беларусь
18 марта 2014 года

1944-2014
70 гадоў вызвалення

■ Героямі засталіся

# У БОЙ ІШЛІ МАЛАДЫЯ...

Сямнаццацігадовы хлопец кінуўся з бомбай пад фашысцкі цягнік, 25-гадовы — стаў камісарам атрада, 30-гадовы стварыў свой атрад

**«Звязда» працягвае расказваць пра ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны, якія былі прадстаўлены да звання Героя Савецкага Саюза, але так яго і не атрымалі. Былі іншыя прызнанні — не менш значныя. Усе яны — за асабістыя подзвігі. Сёння чытачы даведаюцца, як адзін чалавек вывеў са строю чыгунку на двое сутак, як партызаны перашкаджалі нямецкаму ворагу падчас найбуйнейшых аперацый на фронце; якую работу праводзілі для таго, каб атрады папаўняліся народнымі мсціўцамі, за пошук каго немцы абяцалі вялікія грошы. Звярніце ўвагу на ўзрост герояў. Ніводнаму не было і трыццаці пяці...**



## ПАД САСТАЎ — З ДЗЕСЯЦЦЮ КІЛАГРАМАМІ ТОЛУ

***Мікалай Васільевіч Гойшчык.*** З восені 1941 года — у няпоўныя пятнаццаць — Мікалай становіцца партызанскім сувязным. Выконваючы заданні камандавання атрада аб перамяшчэнні праціўніка, наяўнасці воінскіх часцей і іх колькасці, з'яўляўся праваднікам і наладжваў сувязі атрада з патрыётамі з ліку мясцовага насельніцтва. У лютым 1943 года з-за небяспекі быць арыштаваным Мікалай разам з бацькам і братам пайшлі ў партызанскі атрад. Правёў дзясяткі баёў з нямецкімі акупантамі, у якіх вызначаўся мужнасцю і гераізмам. За кароткі час асвоіў падрыўную справу і стаў адным з лепшых дыверсантаў у брыгадзе. На яго рахунку 7 падарваных эшалонаў, 3 замініраваныя аўтамашыны, трапным агнём з процітанкавага ружжа выведзена са строю 4 паравозы.

Яго апошняя баявая аперацыя стала і апошнім днём жыцця. 24 красавіка 1944 года група байцоў падышла да чыгункі Брэст — Масква на ўчастку Ніхачова — Івацэвічы. У гэты час з боку Брэста прыбліжаўся варожы эшалон з танкамі. Паставіць міну або закласці тол і адысці назад не было часу, а састаў мог прайсці беспакарана. Гойшчык крыкнуў таварышам: «Адыходзьце!», а сам кінуўся пад састаў з дзесяццю кілаграмамі толу. Прагрымеў страшны выбух, вагоны з танкамі пайшлі пад адхон, чыгунка была выведзена са строю на двое сутак.

Так здзейсніў бессмяротны подзвіг Мікалай Гойшчык, юны партызан атрада імя А.П. Чарткова брыгады імя Ф.Э. Дзяржынскага, якая дзейнічала ў Бярозаўскім і Івацэвіцкім раёнах Брэсцкай вобласці.

4 лістапада 1944 года па рашэнні Брэсцкага абкама КП(б)Б М.В. Гойшчык быў прадстаўлены да звання Героя Савецкага Саюза. Хадайніцтва абкама падтрымаў Беларускі штаб партызанскага руху. У выніку Мікалай Гойшчык узнагароджаны пасмяротна ордэнам Айчыннай вайны І-й ступені.

Героем Савецкага Саюза ён не стаў, але ў памяці народнай застаўся ім назаўсёды. У вёсцы Міхневічы Івацэвіцкага раёна ўсталяваны помнік, імя Гойшчыка носяць вуліцы ў Ганцавічах, Івацэвічах і Мінску.

## У КЮВЕЦЕ — 28 НЯМЕЦКІХ ВАГОНАЎ

***Барыс Уласавіч Кошчалеў.*** Камандзір аддзялення 1-га батальёна Расонскай партызанскай брыгады імя І.В. Сталіна Віцебскай вобласці Барыс Кошчалеў — адзін з першых беларускіх партызанаў, якія прадстаўляўся да звання Героя Савецкага Саюза ў 1942 годзе.

Ураджэнец вёскі Дзмітрава Расонскага раёна вызначаўся ўмелымі дзеяннямі падчас правядзення дыверсій на чыгуначных камунікацыях ворага. 19 верасня 1942 года з групай байцоў на чыгунцы Клясціцы — Дрэтунь выбухам міны спусціў пад адхон нямецкі эшалон. У выніку крушэння выведзены са строю паравоз, разбіта 11 крытых вагонаў, забіта пяцёра і паранены чатыры нямецкія салдаты. 23 верасня з гэтай жа групай Кошчалеў правёў крушэнне другога эшалона. На гэты раз выведзены са строю 33 вагоны, забіта 10 салдат праціўніка. 17 кастрычніка праведзена чарговая дыверсія на ўчастку чыгункі Полацк — Невель. У выніку ў кювеце апынуліся 28 вагонаў.

Варта мець на ўвазе, што, акрамя нанесенага ўрону, пасля кожнай аперацыі праціўнік доўгі час не мог адкрыць на гэтым участку рух цягнікоў, што затрымлівала дастаўку на фронт ваеннай тэхнікі, узбраення і жывой сілы. Асабліва адчувальныя аперацыі партызанаў на камунікацыях ворага былі ў перыяд Сталінградскай бітвы, бітвы пад Курскам і Белгарадам летам 1943 года і падчас правядзення Чырвонай Арміяй іншых наступальных аперацый.

За самаадданыя дзеянні ў барацьбе з нямецка-фашысцкімі захопнікамі Барыс Кошчалеў 30 кастрычніка 1942 года камандаваннем брыгады быў прадстаўлены да прысваення звання Героя Савецкага Саюза. Амаль праз год Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 16 верасня 1943 года ўдастоены высокай урадавай узнагароды — ордэна Леніна.

## АНТЫФАШЫСЦКІЯ ГРУПЫ І НОВЫЯ ПАРТЫЗАНСКІЯ АТРАДЫ

***Сяргей Аляксандравіч Пранько.*** Нарадзіўся ў 1917 годзе ў вёсцы Козічы Пастаўскага раёна Віцебскай вобласці. Як камсамольскі работнік, Сяргей Пранько быў пакінуты ў тыле ворага для арганізацыі партызанскага руху ў былой Вілейскай вобласці. У складаных умовах першых дзён акупацыі Пранько арганізаваў групу патрыётаў з жыхароў Пастаўскага раёна, якая адразу заявіла пра сябе як баявая адзінка падпольнага фронту. Першая аперацыя была праведзена ў жніўні 1941 года па вывадзе са строю тэлеграфнай сувязі Паставы — Варапаева і знішчэнні нямецкай аўтамашыны. Потым была цэлая серыя дыверсійных актаў: падарвана 8 мастоў, 2 склады ў Паставах, спалены 2 смолазаводы і 12 створаных акупантамі маёнткаў.

Баявыя дзеянні групы чаргаваліся з вялікай палітычнай работай сярод насельніцтва. На пішучай машынцы друкаваліся лістоўкі і звароты з заклікам уступаць у партызанскія атрады.

У кастрычніку 1941 года буйны карны атрад акружыў групу Сяргея Пранько. Бой доўжыўся больш за гадзіну, але сілы былі яўна не роўныя. Сяргей цяжка перажываў гібель дзесяці сваіх таварышаў. Яму самому і байцам, якія засталіся жывымі, удалося вырвацца з акружэння.

У жніўні 1942 года Пранько прызначаны камандзірам узвода партызанскага атрада імя А.В. Суворава, які ў снежні ўвайшоў у склад створанай брыгады імя К.Е. Варашылава. Адначасова выконвае абавязкі камісара атрада і становіцца членам Вілейскага падпольнага райкама камсамола.

За гэты перыяд Пранько арганізаваў некалькі падпольных антыфашысцкіх груп. У Мядзельскім, Пастаўскім і Дунілавіцкім раёнах былі створаны 52 камсамольскія арганізацыі, на базе якіх арганізаваны новыя партызанскія атрады.

Сяргей Пранько асабіста распрацаваў і кіраваў аперацыямі па разгроме гарнізонаў у вёсках Клешчаны, Груздава, Кабыльнікі і іншых. Усяго на асабістым баявым рахунку Сяргея — 32 знішчаныя гітлераўцы.

З верасня 1943 года Сяргей Пранько — начальнік асобага аддзела брыгады. На гэтай пасадзе правёў вялікую работу па згуртаванні партызанаў, павышэнні дысцыпліны, выкрыцці шпіёнаў-тэрарыстаў, якіх фашысты засылалі ў партызанскія фарміраванні.

Двойчы вылучаўся на прысваенне звання Героя Савецкага Саюза: 26 лістапада 1944 г. былым Маладзечанскім абкамам КП(б)Б і 3 мая 1965 г. Прэзідыумам ЦК КПБ.

Узнагароджаны Сяргей Пранько ордэнам Леніна, Чырвонай Зоркі, медалём «Партызану Айчыннай вайны» І-й ступені.

## ВЫЗВАЛЕННЕ ВАЕННАПАЛОННЫХ З-ПАД НЯМЕЦКАГА КАНВОЮ

***Міхаіл Мікітавіч Чарнак.*** Нарадзіўся ў 1911 годзе ў вёсцы Старое Сяло Жабінкаўскага раёна Брэсцкай вобласці. Да вайны працаваў старшынёй сельскага Савета ў Брэсцкай вобласці. З пачаткам Вялікай Айчыннай вайны ўжо ў ліпені 1941 года стварыў партызанскі атрад пад назвай «Старасельскі».

У жніўні 1941 года Міхаіл правёў рызыкоўную аперацыю: з нямецкага склада ў Брэсце на аўтамашыне даставіў у атрад 8 скрынак гранат, 13 скрынак патронаў, 50 кілаграмаў толу, 10 вінтовак і 1 кулямёт. Атрымаўшы ўзбраенне, атрад у верасні-кастрычніку ажыццявіў шэраг баявых аперацый на шашэйных дарогах і па разгроме невялікіх нямецкіх гарнізонаў у некалькіх вёсках.

Фашысты пачалі актыўны пошук бясстрашнага патрыёта, абяцалі вялікія грошы за звесткі аб яго месцазнаходжанні. Калі спробы злавіць Чарнака не мелі поспеху, гітлераўцы расстралялі яго маці, сястру, іншых сваякоў. Але і гэта не зменшыла яго волі да барацьбы, а выклікала яшчэ большую нянавісць да захопнікаў.

З'яўляючыся намеснікам камандзіра атрада па разведцы, Міхаіл стварыў шырокую сетку агентуры, здабываў своечасовыя і каштоўныя звесткі аб праціўніку, якія забяспечвалі паспяховае правядзенне баявых аперацый. Згодна з архіўнымі дакументамі, Міхаіл Чарнак з невялікай групай партызанаў правёў смелую аперацыю па вызваленні калоны савецкіх ваеннапалонных, якіх канваіравалі 20 чалавек нямецкай аховы. Арганізаваўшы засаду, разведчыкі Чарнака расстралялі канваіраў і вызвалілі палонных, у тым ліку і палкоўніка Чырвонай Арміі Чапыненку, якога ў далейшым адправілі за лінію фронту.

2 мая 1943 года ў няроўным баі з нямецкімі захопнікамі адважны камандзір, улюбёнец партызанаў і насельніцтва, загінуў смерцю героя. Пасля смерці Міхаіла Чарнака яго іменем названы атрад, які ён арганізаваў, у якім ваяваў і загінуў.

Рашэннем Брэсцкага абкама КП(б)Б ад 22 чэрвеня 1944 года Міхаіл Чарнак прадстаўлены да прысваення звання Героя Савецкага Саюза. Узнагароджаны медалём «Партызану Айчыннай вайны» І ступені і пасмяротна ордэнам Айчыннай вайны І-й ступені толькі ў 1948 годзе.

**Генадзь БАРКУН, гісторык**

■

# СТАЛІЧНЫЯ ПАКУПНІКІ ЧАКАЮЦЬ ЗНІЖАК

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

Больш за тое, эксперты адзначаюць, што цяпер у рэгістрах прапановы прыкладна 60-70% ад агульнай долі кватэр на продаж складаюць так званыя «вісякі». Падобныя жылыя памяшканні застаюцца ў спецыялізаваных каталогах па нязменных коштах на працягу 6-8 месяцаў. Такому жыллю адшукаць свайго пакупніка даволі праблематычна. Цяпер рэальныя здзелкі ажыццяўляюцца толькі ў тых выпадках, калі ўласнік нерухомасці выстаўляе сваю кватэру па рэальным рынкавым кошце і адначасова прапануе зніжкі ў памеры 3-5%.

## МІНІМАЛЬНЫ КОШТ АДНАПАКАЁВАК — 50-53 ТЫСЯЧЫ ДОЛАРАЎ

Адразу адзначу, што кватэры коштам ніжэй за 53 тысячы долараў уяўляюць сабой звычайна малагабарытныя жылыя памяшканні агульнай плошчай да 32 квадратных метраў, размешчаныя ў старых пяціпавярховых дамах. Аднак не вельмі якаснае жыллё на крайніх паверхах, нават па невялікім кошце, карыстаецца слабым попытам. Увогуле Мікалай Прасталупаў паведаміў нам, што стандартныя аднапакаёвыя кватэры сёння рэальна набываюцца тады, калі канчатковы цэннік складае да 55 тысяч долараў. Колькасць прапановы падобных кватэр на рынку складае больш за 50 варыянтаў. Наконт бюджэтных маленькіх кватэр нагадаю, што месяц таму самую простую аднапакаёвую кватэру магчыма было купіць не танней чым за 55 тысяч долараў.

Панэльныя аднапакаёўкі па кошце ад 55 да 60 тысяч долараў прадаюцца ўжо з пэўнымі цяжкасцямі. Даволі якасныя аднапакаёвыя кватэры палепшанай планіроўкі ў параўнальна новых дамах прадаюцца па кошце 60-75 тысяч долараў. Сярэдні кошт квадратнага метра бюджэтнага жылля невялікіх плошчаў складае ў рэальных здзелках ад 1600 да 1650 долараў. А вось пры продажы больш якасных аднапакаёвак «стаўка» такога квадрата агульнай плошчы будзе дасягаць ужо 1700-1750 долараў. Хапае цяпер на рынку і сапраўды шыкоўных аднапакаёвак плошчай ад 40 да 50 квадратных метраў. Кошт на іх вагаецца ад 75 да 100 тысяч долараў. Цэннікі такія ёсць, але рэальных пакупнікоў на дарагое жыллё звычайна няма.

## БЯРУЦЬ ДВУХПАКАЁЎКІ ДА 70 ТЫСЯЧ ДОЛАРАЎ

І ў гэтым сегменце жылля сустракаюцца ў каталогу прапановы зусім слабенькіх кватэр — коштам ад 58 да 62 тысяч долараў. Звычайна гэта маласямейкі ў двух-, трох- ці чатырохпавярховых дамах. Такое жыллё бяруць толькі сапраўды небагатыя кліенты. Устойлівы попыт пачынаецца на стандартныя двухпакаёвыя кватэры, цэннік на якія вагаецца ад 65 да 70 тысяч долараў. Прапанова на рынку кватэр па такім кошце дасягае цяпер 60-70 варыянтаў. Даволі вялікая колькасць двухпакаёвых кватэр прадаецца па кошце да 85 тысяч долараў. Цікавасць да падобнага жылля існуе, аднак на практыцы набываюць іх вельмі рэдка.

Спецыялісты агенцтваў нерухомасці адзначаюць, што сёння двухпакаёвая кватэра адшукае сабе новага гаспадара толькі ў тым выпадку, калі кошт квадратнага метра гэтага жылля будзе ў межах ад 1550 да 1650 долараў. Дзіўна, але па бюджэтных варыянтах двухпакаёвак сярэдні рэальны кошт «квадрата» агульнай плошчы часам бывае больш за падобнае аднапакаёвае жыллё.

Даволі істотна гэтымі днямі павялічыўся выбар сапраўды якасных і прасторных двухпакаёвых кватэр палепшанай планіроўкі. Самы распаўсюджаны кошт на падобнае жыллё цяпер складае ад 85 да 100 тысяч долараў. Па такім цэнніку жыллёвая нерухомасць цяпер увогуле не прадаецца. Адсутнічаюць у банкаў танныя крэдыты — зніклі пакупнікі дарагой маёмасці.

**Рэальныя здзелкі ажыццяўляюцца толькі ў тых выпадках, калі ўласнік нерухомасці выстаўляе сваю кватэру па рэальным рынкавым кошце і адначасова прапануе зніжкі ў памеры 3-5%.**

Самы малы цэннік на трохпакаёвыя памяшканні выстаўлены на кватэры агульнай плошчай каля ад 50 да 56 квадратных метраў. Падобнае жыллё прапануецца па кошце ад 75 да 85 тысяч долараў. Праўда такіх танных варыянтаў цяпер на рынку засталося не больш за 15. Стандартныя трохпакаёўкі агульнай плошчай да 70 «квадратаў» каштуюць да 95 тысяч долараў. Трохпакаёўкі ў дзевяціпавярховых дамах спальных раёнаў маюць самы распаўсюджаны цэннік ад 90 да 115 тысяч долараў.

## КАМЕРЦЫЙНАЕ БУДАЎНІЦТВА «БУКСУЕ», АЛЕ ЎПАРТА НЕ ЗНІЖАЕ ЦЭННІК

Другім істотным фактарам, які паўплывае на слабую актыўнасць удзельнікаў другаснага рынку, з'яўляецца працяглае зацішша ў структуры будаўніцтва камерцыйнага жылля. Цяпер на першасным рынку жыллёвай нерухомасці складваецца не зусім лагічная сітуацыя. Ужо на працягу каля трох месяцаў кліенты даволі слаба набываюць кватэры ў новабудоўлях. Аднак, нягледзячы на гэта, арганізатары долевага будаўніцтва працягваюць трымаць ранейшыя кошты. Асобныя спецыялісты тлумачаць падобнае новымі ўмовамі набыцця інвестарамі зямельных участкаў пад жыллёвае будаўніцтва. Такія зямельныя ўчасткі цяпер набываюцца толькі праз аўкцыёны, дзе за зямельку ў горадзе неабходна заплаціць даволі вялікія грошы. Зразумела, што камерсанты ад будаўніцтва не будуць займацца любой справай без атрымання сур'ёзнай долі прыбытку. Але, з другога боку, у перыяд мінімальнага попыту на жыллёвую нерухомасць яны будуць вымушаны памяншаць свае апетыты. Пакуль такога не адбываецца.

**На працягу трох месяцаў кліенты даволі слаба набываюць кватэры ў новабудоўлях. Аднак, нягледзячы на гэта, арганізатары долевага будаўніцтва працягваюць трымаць ранейшыя кошты.**

**ДАВЕДКА:**

*Сёння ў Мінску існуюць зямельныя ўчасткі для будаўніцтва жылля, на якіх магчыма ўзвесці каля 7 млн квадратных метраў жылля. Да 2017 года індустрыяльнае жыллё ў сталіцы будзе ажыццяўляцца ранейшымі тэмпамі: каля 1 млн «квадратаў» сёлета і прыкладна мільён — у наступным годзе. А вось пасля вызначанай даты «пік» штогадовыя аб'ёмы будаўніцтва жылых дамоў у Мінску плануюць паэтапна паменшыць да 500 тысяч квадратных метраў за год.*



Напрыклад, цяпер самыя танныя кватэры забудоўшчыкі прапануюць кліентам будаваць на стадыі катлавана. Лідарам тут па мінімальных коштах з'яўляецца жылы комплекс па вуліцы М. Багдановіча, дзе кватэры з тэрмінам здачы ў апошнім квартале 2016 года прапануецца будаваць па цэнніку ад 1200 долараў за квадратны метр агульнай плошчы. Існуюць у гэтым комплексе вялікія кватэры і са здачай дома ў трэцім квартале сёлета. Толькі квадратны метр жылля ў падобным доме каштуе ўжо ад 1450 долараў за «квадрат». Даволі якаснае жыллё прапануюць забудоўшчыкі кліентам у жылым комплексе «Грушаўскі Пасад». Там маналітны дом будзе здадзены сёлета ўжо ў верасні. Кошт квадратнага метра не такі і вялікі — ад 1400 долараў, але прадугледжаны значны першапачатковы ўзнос. Акрамя таго, у гэтым доме мінімальная плошча нават аднапакаёвых кватэр складае ад 46 квадратных метраў, а трохпакаёвак — ад 100 «квадратаў» і нават больш.

**Сур'ёзных цэнавых ваганняў у той ці іншы бок трэба чакаць пры з'яўленні на фінансавым рынку танных доўгатэрміновых крэдытаў або пры сапраўды істотных зніжках на першасным рынку жылля.**

Кватэры ў долевым будаўніцтве каркасна-блочных дамоў, размешчаных амаль у цэнтры горада (жылы комплекс «Ліра» па вуліцы Бяды), прапануюцца ўжо па іншых «тарыфах». Там мінімальны цэннік квадратнага метра пачынаецца ад 1650 долараў. Згадзіцеся, што ўжо на гэтым этапе азнаямлення з камерцыйнымі прапановамі пачынаеш сумаваць. Але і гэта яшчэ не канчатковыя выдаткі будучых навасёлаў. У структуры долевага будаўніцтва кватэры кліентам прапануюцца без адстройвання. А каб давесці такую кватэру да ладу, новаму гаспадару спатрэбіцца адшукаць яшчэ мінімум 10 тысяч долараў.

## ЛЕТАМ КОШТЫ КРЫХУ «ЎПАДУЦЬ»

Істотных змяненняў у цэнавым дыяпазоне на другасным рынку жылля на бліжэйшыя месяцы Мікалай Прасталупаў не чакае. Традыцыйна лічыцца, што з другой паловы чэрвеня па верасень на рынку пачынае гаспадарыць «мёртвы» сезон, калі актыўнасць пакупнікоў набліжаецца да нуля. Сёлета такога выразнага сезона не будзе, бо з вясны ў кліентаў захаваўся нерэалізаваны попыт: кватэрамі цікавіліся, але іх не куплялі.

Пачынаючы з сакавіка, патэнцыяльныя пакупнікі вырашылі ўзяць перапынак і пачакаць прымальных цэн і вялікай прапановы. Такая стратэгія часткова мае сваю рацыю, бо людзей з вялікімі заробкамі больш не стала. Яшчэ адным фактарам, які паўплываў на актыўнасць кліентаў, з'яўляецца праблема атрымання пазыковых грошай. Цяпер грошы на жыллё пачалі зноў даваць, але працэнты па іх застаюцца высокімі.

Попыт на жыллё зусім прападзе толькі недзе ў жніўні. Менавіта ў апошнім месяцы лета эксперты прагназуюць кропкавае патаненне кватэр прыкладна на 3-5%. У асобных выпадках зніжкі могуць дасягаць нават 10%, аднак яны будуць насіць выключна кароткачасовы характар. Наш суразмоўца ўпэўнены, што сур'ёзных цэнавых ваганняў у той ці іншы бок трэба чакаць пры з'яўленні на фінансавым рынку танных доўгатэрміновых крэдытаў або пры сапраўды істотных зніжках на першасным рынку жылля.

**Сяргей КУРКАЧ.**



■ Тэндэнцыі ў медыцыне

# НЕ ЗУСІМ СЯМЕЙНЫ...

**У большасці краін свету сістэма сямейнай медыцыны з'яўляецца асновай нацыянальнай аховы здароўя, а ва ўніверсітэтах актыўна ствараюцца праграмы або кафедры для падрыхтоўкі сямейных урачоў. Існуе нават Сусветны дзень сямейнага ўрача, які адзначаецца ў маі. У нашай краіне сямейны ўрач называецца ўрачом агульнай практыкі. Чаму гэта так і што гэта за практыка?**

Спачатку ў сярэдзіне 1990-х вопыт работы па прынцыпе ўрача агульнай практыкі апрабіравалі ва ўрачэбных амбулаторыях Гродна і Крупіцкай сельскай урачэбнай амбулаторыі Мінскага раёна. Далей да эксперыменту далучылася Віцебская вобласць, дзе былі арганізаваныя 3 амбулаторыі. Сёння ў краіне працуюць 687 урачоў агульнай практыкі. Па прынцыпе агульнай урачэбнай практыкі функцыянуе большасць урачэбных амбулаторый (іх крыху больш за 700). Наогул амбулаторыі працуюць у сельскай мясцовасці, аднак некалькі размяшчаецца ў гарадах, у тым ліку ёсць адна такая ўстанова і ў сталіцы. Некаторыя амбулаторыі знаходзяцца на базе бальніц сястрынскага догляду і ўчастковых бальніц.

— Мы пераканаліся, што ўрач агульнай практыкі — фігура запатрабаваная, і вырашылі ўкараніць такіх спецыялістаў ва ўсіх амбулаторыях, бо гэта лепшы варыянт аказання першай дапамогі ў сельскай мясцовасці, — кажа **начальнік аддзела першай медыка-санітарнай дапамогі галоўнага ўпраўлення арганізацыі медыцынскай дапамогі Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь Людміла ЖЫЛЕВІЧ.** — У раёнах, дзе працуюць урачы агульнай практыкі, назіраецца скарачэнне нагрузак на «вузкіх» спецыялістаў — скажам, афтальмолагаў, оталарынголагаў, неўролагаў. Зніжаецца патрэба ў аказанні хуткай меддапамогі, зніжаецца ўзровень шпіталізацыі. Міжнародны вопыт паказвае, што там, дзе ёсць сямейныя ўрачы, стан здароўя насельніцтва лепшы...

Як высвятляецца, частка ўрачоў агульнай практыкі сапраўды магла б звацца «сямейнымі ўрачамі», паколькі яны здольны дапамагаць, што называецца, усёй сям'і — і цяжарным, і дзецям, і пажылым. Прычым з самымі рознымі праблемамі — ад вядзення хранічна хворых да хірургічнага ўмяшання ў простых выпадках. Аднак некаторым такім спецыялістам дапамагаюць урачы-педыятры, а значыць, яны не з'яўляюцца ў поўнай меры сямейнымі. Такі расклад, пры якім педыятр з'яўляецца кансультантам урача агульнай практыкі, лічыцца аптымальным. І гэта ёсць першая меддапамога. Другая — гэта ўжо далейшае дзяленне на вузкіх спецыялістаў для дарослых і дзяцей. Такая структура аказання меддапамогі лічыцца прымальнай, як было сказана, у сельскай мясцовасці. У горадзе ўрачы агульнай практыкі будуць з'яўляцца хіба ў спецыяльных офісах жылых дамоў новых мікрараёнаў. Выключна каб пазбегнуць неверагодных перагрузак у паліклініках, не разлічаных на прыток новага насельніцтва. А ў цэлым аптымальны варыянт для горада ў гэтым сэнсе ўжо вынайдзены — паводле прынцыпу ўчастковасці, калі першы доктар гараджаніна — участковы тэрапеўт.

Цікавы праект удасканалення работы ўрачоў агульнай практыкі павінен завяршыцца да канца года ў Астравецкім раёне, дзе праходзіў актыўны працэс інфарматызацыі, асваення электронных амбулаторных картак, вядзення ў электронным варыянце шэрагу дакументаў, правядзення кансультацый на раённым і абласным узроўнях з дапамогай тэлекамунікацыйных тэхналогій. Урачы агульнай практыкі атрымалі ў межах праекта яшчэ і магчымасць звароту ў спецыяльна створаны кансультацыйны цэнтр Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі для праяснення складаных дыягнастычных выпадкаў.

Варта заўважыць, што ўсе 100 працэнтаў урачоў агульнай практыкі маюць магчымасць вядзення справаздач, атрымання новых дакументаў з дапамогай універсальнай аўтаматызаванай сістэмы. Аднак у Астравецкім раёне спрабуюць пайсці далей і забяспечыць, так бы мовіць, стабільную электронную сувязь з вузкімі спецыялістамі для атрымання кансультацый па розных пытаннях, пачынаючы з лабараторнай дыягностыкі. Гатовы комплексны варыянт будзе пасля завяршэння прапанаваны для выкарыстання ўсім раёнам краіны.

— Сёння мы яшчэ шукаем спонсараў, каб працягнуць памянёны праект у Астравецкім раёне ў напрамку работы з пажылымі, якім цяжка перасоўвацца, або яны наогул маюць інваліднасць, — тлумачыць Людміла Жылевіч. — Для такіх людзей важна атрымаць нейкую кансультацыю, не выходзячы з дому, — праз інтэрнэт, па скайпе...

**Святлана БАРЫСЕНКА**

■

■ 25 мая — Міжнародны дзень зніклых дзяцей

# ДАВАЙЦЕ ІХ АБАРОНІМ

**Гэты дзень дае магчымасць расказаць аб 8 мільёнах дзяцей, якія знікаюць штогод ва ўсім свеце і якім можна дапамагчы вярнуцца дадому. Міжнародны цэнтр зніклых і эксплуатуемых дзяцей праводзіць кампанію, накіраваную на абарону дзяцей ад выкрадання і сексуальнай эксплуатацыі. У міжнародную базу зніклых дзяцей сёння ўваходзяць 22 краіны на 5 кантынентах, паведамляе МГА «Разуменне».**



У Беларусі штогод у органы ўнутраных спраў паступае каля 2 тысяч заяў і зваротаў грамадзян аб знікненні дзяцей. Абсалютную большасць тых, хто сышоў з дому ці інтэрнатнай установы, знаходзяць на працягу 1-3 дзён. Аднак некаторых не ўдаецца знайсці на працягу некалькіх гадоў. Так, на пачатак гэтага года не ўдалося адшукаць 62 дзіцяці, 35 з якіх ва ўзросце пасля 5 гадоў, 5 — ад 3 да 5 гадоў і 10 — ад 1 да 3 гадоў.

## ЧАМУ СЫХОДЗЯЦЬ ДЗЕЦІ?

— у пошуку прыгод;
— пасля сваркі з бацькамі;
— з-за боязі быць пакаранымі (за ўчынак ці правапарушэнне);
— з-за насілля ў сям'і, невыносных умоў у інтэрнаце.

Як паказваюць даследаванні, прапаўшыя дзеці падвяргаюцца сур'ёзнай небяспецы стаць ахвярамі гандлю, фізічнага гвалту і іншых злачынстваў. Аказаўшыся на вуліцы, такое дзіця можа прасіць аб дапамозе. Варта дапамагчы яму вярнуцца дадому. Не варта забывацца на такіх дзяцей. Аб гэтым нагадвае і сімвал дня — незабудка.

**P.S.** *Дзень зніклых дзяцей упершыню адзначаўся ў 1984 годзе ў ЗША і быў прысвечаны як дзецям, якія ўсё яшчэ знаходзяцца ў вышуку, так і тым, хто быў уратаваны.*

**Святлана БАРЫСЕНКА**

■



■ Хто каго?

# «ХАЙ НЕ МОРА ТУТ, ВЯДОМА, — ДЫ НАЙЛЕПЕЙ МЫЦЦА ДОМА!»

**За што купіў, як той казаў… «Хуткая» дзядзьку аднаго на вуліцы падабрала, без памяці быў — ледзьве адратавалі. Спыталі, як прозвішча? Ён, хоць і слабым галаскам, але ж адказаў, як ёсць, паводле пашпарта:**

**— *Нятрэба*…**

**Доктарка, мусіць, гумарысткай была:**

**— Ну вам, можа, і сапраўды *не трэба*… Калі жыць не хочаце… А вось нам без вашага прозвішча — ну ніяк: лекі ж трэба «спісаць», справаздачу зрабіць…**

Акурат як нам, надрукаваўшы конкурсны здымак, потым выкласці ўсе прапановы подпісаў, пажадана па парадку. Такім чынам:

*Жыццё — яно нібыта кніга*
*(Ці ўсё ж зусім наадварот?),*
*І ў ім павінна быць інтрыга*
*І нечаканы паварот.*
*Дык хто ж каму тут спіну мые?*
*З чаго аповед распачаць?*
*Ну, а паколькі не нямы я,*
*Складана будзе прамаўчаць,—*

напісаў так **спадар Анатоль Гарачоў з вёскі Даўнары Іўеўскага раёна.** І, вядома ж, не толькі пра сябе: пытанне, хто і каму (канкрэтна) «спіну мые», даймала многіх. Многія, як звычайна, і адказы знайшлі. Ну, па-першае:

*Трохі смешна выглядае:*
*Бабця — унука абмывае…*
*А яму, трэба сказаць,*
*Без малога 25:*
*Жонка можа спіну мыць,*
*Як на шыю пасадзіць.*

Лічыць так с**падарыня Соф'я Кусянкова з вёскі Лучын Рагачоўскага раёна.** І пры гэтым сама ж сумняваецца, бо, хутчэй за ўсё, у маладога чалавека не тая шыя, каб некага на ёй трымаць:

*Песціць хлопца бабка Насця…*
*Во камусьці будзе «шчасце»:*
*Апроч лыжкі, анічога*
*Не трымаў у ручках Гога!*

Не будзем узгадваць крылатае: «Ён жа Гоша, ён жа Жора»… Не той выпадак. І мужчына, падобна, не той. **Спадар Мікалай Старых з Гомеля** ведае, чаму:

*Так заведзена ў людзей:*
*Трэ любіць сваіх дзяцей.*
*Ды замоцная любоў*
*«Лепіць» мамчыных сынкоў.*

Якраз ён, той сынок, трэба разумець, на здымку? Але з кім — з мамкай? Ці…

*Я пра гэтага хлапчыну*
*Думаў небагата:*
*Калі* тата *мые спіну,*
*Значыць, нежанаты,—*

піша **спадар Гарачоў.** Вы не паверыце, але, паводле сужэнцаў Астроўскіх з Мінска, з тым жа поспехам ён можа быць і… незамужнім:

*Мамка ходзіць за табой,*
*Дзеўцы мыліць шыю…*
*А сама сябе вадой*
*Хіба не абмыеш?!*
*Што ж не лезеш у раку?*
*Добрае надвор'е!*
*…Выйдзеш замуж — мужыку*
*Будзе костка ў горле!*

Цалкам магчыма. Вось і пазбаўляюцца…

Але ж мы цяпер не пра косткі і разводы. Стары анекдот (на новы лад): хлопец тэлефануе дзяўчыне. Пытае: «А што ты робіш?». Яна ў адказ: «Шыю мыю». Ён патыліцу пачухаў і думае: «Вартая дзеўка! Гэта ж трэба — усё ўмее: і шые, і мые. Добрая будзе жонка! Трэба жаніцца…»

Хто ведае, можа, якраз гэтай думкай (трэба… варта…) і кіраваўся маладзейшы з герояў здымка (глянулі яшчэ раз — на верхні? — **Аўт.**), калі… браў шлюб са старэйшай.

Так-так, асобныя з чытачоў прынялі жанчыну не за бабулю, не за матулю, нават не за татулю, а менавіта за жонку. **Спадарыня Любоў Чыгрынава з вёскі Забалацце Вілейскага раёна** так і піша:

*Гэта ж трэба — заўтра свята,*
*А вады няма ў хатах!*
*Дзе ж памыцца бедаку?..*
*Жонка Ліда з мужам Федзем*
*Падаліся на раку.*

Тут вельмі дарэчы будуць радкі **спадара Валерыя Гаўрыша з Чавусаў:**

*Шчасце, што ля вёскі*
*Ёсць такая лужа…*
*Дзе ж абмыеш косткі,*
*Калі прыйдзе сцюжа?*
*…Усім, хто чуе,*
*я нараю:*
*Пабудуйце лазню з краю!*

І тады…

Ну згадзіцеся, будзе рацыя ў радках **спадара Сцяпана Нефідовіча з вёскі Любань Лунінецкага раёна:**

*У калгасе робіць Якаў,*
*Аб курортах марыць,*
*А заробак — кот наплакаў,*
*Вось табе й Канары…*
*Жонка Якава без спрэчкі*
*Павяла яго да рэчкі:*
*— Хай не мора тут, вядома,—*
*Ды найлепей мыцца дома!*

А калі яшчэ і напару — з каханым ці каханай… Паводле **спадара Гарачова:**

*Алу сёння рана ўсперла:*
*Свайму Максу плечы церла…*
*Жонка Колі Баскава*
*Аж зубамі ляскала!*

Трэба разумець, ад зайздрасці: муж малады…

Зрэшты, мы адхіліліся. А яно ж трэба сказаць, што на здымку чытачы ўбачылі не толькі бабулю з унукам, матулю (татулю) з сынам (з дачкою), жонку з мужам, але і шмат каго яшчэ. Паводле **спадарынь Галіны Пятроўскай са Смаргоншчыны** і **Любові Чыгрынавай з Вілейшчыны)** — жаніха:

*Не глядзіце на мяне,*
*Што я брудnative,*
*Цераніце па спіне —*
*Тут жа дамся ў сваты!*

«Спявае» так Галіна Уладзіміраўна. Узгадвае песню і Любоў Міхайлаўна:

*Янка злавіў быў Аленчын ручнік,*
*Кінуў суседу на спіну.*
*Думаў, што дзядзька стары*
*як мужык,*
*Не зацікавіць дзяўчыну…*
*Калі сусед пры вялікіх грашах,*
*Можа ўсё разваліцца па швах.*

Хто папярэджаны, той, вядома ж, узброены, а хто не?

**Спадарыня Марыя Грышчанка з Дзяржынска** ўзгадвае: «Некалі ў нас на чыгунцы працаваў адзін мужчына. Васілём яго звалі. Добры быў слесар… Дык вось. Палез ён неяк пад вагон лодкі ставіць. Работа цяжкая, брудная, на дварэ спёка — пот, можна сказаць, градам… Васіль выціраў яго — з твару, з шыі, з грудзей, з галавы — то рукой, то брудным рукавом… Нарэшце ўсё зрабіў: з-пад вагона вынырвае, як той чорт з табакеркі… А тут якраз кабета ідзе — уся такая прывабная, прыбраная… Ад страху аж перахрысцілася, потым кажа: «…А я і не ведала, што ў нас на чыгунцы негры працуюць!».

Адсюль, з гэтага ўспаміну, відаць, і радкі:

*Ад мазуту-бруду цесць*
*Зяця адмывае —*
*Страшнавата, што таго*
*Жонка не пазнае.*

Але ж, можа, яе вочы бачылі, што куплялі? Паводле **спадарыні Пятроўскай:**

*Трактарыста пакахаць —*
*«Позна легчы, рана ўстаць»,*
*Тону мыла закупіць*
*І штодня ў рэчцы мыць.*

Скажаце, што зімой гэта негуманна? **Спадарыня Раіса Васільева з Гомеля** гэтаксама кажа:

*Праводзіць жонка загартоўку*
*(Такой не бачылі нідзе):*
*Сама прыбралася ў ватоўку,*
*Мужык жа — голы… І ў вадзе.*

Трэба разумець, нядобра гэта? На думку **спадарыні Клаўдзіі Дубовік з Вілейкі** — як паглядзець:

*Ранак. Мыюцца мужчыны…*
*Ёсць на тое тры прычыны:*
*З дому выгналі жанчыны,*
*Мо трыццаты раз за год*
*Адказаў водаправод,*
*Альбо мыцца ў цішы —*
*Асалода іх душы?*

Каторы з варыянтаў праўдзівы — ёсць пытанне. А вось выйсця часам няма, як прызнае **спадарыня Марыя Грышчанка,** бо сантэхніка можа быць якаснай, імпартнай, а вось сантэхнікі — толькі айчыннымі:

*ЖЭС даводзіць нам даўно:*
*Трубы саржавелі.*
*Месяц дайце на рамонт,*
*Можа, мы й паспеем?..*
*Вось дык штука!*
*Дзе ж цяпер*
*Нам знайсці вадзіцы?*
*Хоць не лета на дварэ —*
*Трэба ў рэчцы мыцца.*

Што праўда, тое праўда: і пра трубы, і пра іх замену, і пра адсутнасць вады (гарачай) — цёплая тады выручае:

*Шмат хто,*
*Хоць і пакрысе*
*Бруд у возера нясе,—*

заўважаюць **сужэнцы Астроўскія,** а **спадар Віктар Трайкоўскі з Мінска** ў такім мыцці нават перавагу бачыць:

*Мыйся, сынку мой, «дапятна»,*
*Тут — пакуль яшчэ бясплатна…*

У грошы, згадзіцеся, многае ўпіраецца. На думку **спадара Гарачова** —

*Калі быў у нас калгас,—*
*Лазня працавала.*
*І на піва, і на квас*
*Грошыкаў хапала.*
*А цяпер ёсць СВК,*
*Ды не лепей люду:*
*Толькі родная рака*
*Адмывае з бруду.*

Вось і атрымліваецца, што некалі, як зазначае **спадар Нефідовіч,** можна было піць ваду з канавы, а цяпер — страшна нават з Прыпяці, бо забруджаны рэкі… І таму так да месца тут заклік **сужэнцаў Астроўскіх:**

*Каб чыстай вадзіцы*
*Маглі мы напіцца,*
*Не трэба ў рэчках*
*З шампунямі мыцца!*

А зрэшты… Ёсць думка (у **спадара А. Міраговіча з Бабруйска**), што ў аб'ектыў нашага фотакарэспандэнта трапіла ну зусім не тое, што ўсе падумалі:

*Нехта скажа, што ў рацэ*
*Хлопец абмываецца?*
*Не, тут ролік для БТ*
*Трэці дзень здымаецца:*
*Той рэкламы ўжо замала,*
*Бо цяпер і мыла — «Мара»!*

Добрая, згадзіцеся, назва ў сродкаў для мыцця: хоць-нехаць купіш, каб дома была, каб жыць з марай (хоць такой, калі іншых няма). А дарэчы: Джон Ракфелер марыў зарабіць сто тысяч долараў і дажыць да 100 гадоў. Зарабіў — 318 мільярдаў і памёр у 97.

Адкуль, па-першае, вельмі важная выснова: не ўсе мары збываюцца, нават у Ракфелера. І адсюль жа — па-другое: хай прыкладна гэтак жа (як у Ракфелера) не збудуцца мары вашы.

Нам жа засталося падвесці вынікі. У прыватнасці, нагадаць, што на мінулым конкурсным здымку была маладзіца, якая з каляскай тэпала побач з ротай салдат… Ды аб'явіць, што найлепшыя радкі пра яе, пра іх (на думку вялікага чытацкага журы) напісалі **спадары Кусянкова з Рагачоўшчыны, Чыгрынава з Вілейшчыны, Грышчанка з Дзяржынска, Гаўрыш з Чавусаў, Нефідовіч з Лунінечыны, сужэнцы Астроўскія з Мінска, Гарачоў з Іўеўшчыны.**

Вось з гэтым, апошнім меркаваннем, пагадзілася і журы маленькае — рэдакцыйнае: пяць дарэформенных балаў за радкі:

*Вельмі многія з жанчын*
*Марылі аб цудзе:*
*Муж — салдат,*
*Дык, можа, сын*
*Генералам будзе?*
*Толькі, як здавён бывала,*
*Мары не збываюцца,*
*Бо ў пана генерала*
*Свае дзеці маюцца.*

А ў дадатак да гэтай адзнакі — заўсёдны прыз у выглядзе падпіскі на дарагую сэрцам «Звязду» на трэці квартал.

Хочаце, каб газета прыходзіла і да вас? Тады выпісвайце альбо ўважліва глядзіце на новы конкурсны здымак, прыдумляйце подпісы (можна некалькі, але не больш, чым па восем радкоў) і дасылайце ў рэдакцыю. Вам пашанцуе!

**Валянціна ДОЎНАР.**
**Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.**



■ Нефармат



# АСАБЛІВАСЦІ ЖАНОЧАГА ЎЗРОСТУ

Вы заўважылі, як памаладзелі людзі за апошнія сто гадоў? Асабліва жанчыны. Равеснік чалавека, што жыў раней, цяпер адчувае сябе значна маладзейшым. Задумацца аб гэтым прымусіў прачытаны нядаўна артыкул пра гераіню вайны Зою Касмадзям'янскую. Успамінамі падзяліўся таварыш Зоі па атрадзе Мікалай Разумцаў. Яму цяпер за 90. Ён згадаў, як у 1941-м дзяўчына марыла вярнуцца дадому пасля Перамогі, яна казала, што дома яе чакае старэнькая маці. Потым Мікалай Васільевіч вылічыў, што «старэнькай» маці на той час было 43 гады.

У рускіх народных казках можна сустрэць яшчэ маладзейшых «старых». Звычайна казка пачынаецца так: «Жылі-былі стары са старою. Гадавалі яны сына і дачку...» Пры ўважлівым прачытанні можна вылічыць, што «старыя» жылі на свеце які-небудзь 36-ы або 37-ы год.

У наш век мужчыны і жанчыны ўспрымаюць свой узрост зусім па-іншаму. І таму ёсць аб'ектыўныя прычыны. Працягласць жыцця вырасла, медыцына адчувальна прасунулася наперад. Людзі сталі працаваць значна менш, чым раней. З'явіўся вольны час, які можна патраціць на сябе, каб выглядаць маладзей і лепш. А якія арыенціры нашым жанчынам навязваюць сродкі інфармацыі? Свецкія львіцы, галівудскія дзівы, якія са скуры вылузваюцца, каб у 60 гадоў выглядаць гэткімі гуллівымі дзяўчаткамі. Ды і не толькі заакіянскія жанчыны вызначыліся на гэтым фронце. Значна бліжэйшыя да нас «зоркі» шакіруюць публіку шлюбамі з маладымі хлопцамі, заводзяць дзяцей пры наяўнасці дарослых унукаў.

Яно і зразумела. Нікому не хочацца старэць. Ад старасці ўцякаюць, хто як можа. Маладыя мужы і бойфрэнды, пластычныя аперацыі, комплекс дарагіх медыцынскіх працэдур, стылісты-візажысты плюс свае асабістыя сакрэты іміджу ствараюць ілюзію працягу маладосці. Нездарма ж кажуць: табе столькі гадоў, на колькі сябе адчуваеш. Пры гэтым біялагічны ўзрост выглядае не такім і важным. І здавалася б, на здароўе. Хай кожны вызначае свой узрост і адпаведны яму лад жыцця. Ды часам вось такое самавызначэнне ўступае ў супярэчнасць з успрыманнем жанчыны яе блізкімі.

У адной знаёмай сям'і павольна наспявае канфлікт. Хоць бакі з усіх сіл пакуль што стараюцца падтрымліваць дыстанцыю прыстойнасці. А яшчэ год таму гэтую сям'ю можна было ўспрымаць як узор сямейнай цеплыні і добразычлівасці. Дачка заўсёды была выдатніцай — у школе, ва ўніверсітэце. Стала добрай спецыялісткай на працы. Вось са стварэннем уласнай сям'і справа крыху зацягнулася, што заўсёды непакоіла маці. І калі нарэшце дачка выйшла замуж, нарадзіла першынца, Яўгенія Пятроўна стала самай шчаслівай на свеце бабуляй. Спяшалася з працы, каб пагуляць з унукам, магла адпусціць маладых бацькоў на цэлы выхадны дзень. А маладыя не сталі зацягваць з другім. Дачушка таксама з'явілася на свет жаданым і любімым дзіцем. Прайшло два гады. Таццяна стала рыхтавацца да выхаду на працу. Бабуля некалькі разоў пацікавілася ў маладых бацькоў, ці выбралі яны дзіцячы садок для малых, ці пачалі збіраць неабходныя дакументы, а яны неяк дзіўна пераглядваліся. Потым маладая маці стала заводзіць размовы пра тое, як часта хварэюць дзеці ў садку, наколькі карысным бывае хатняе выхаванне... І нарэшце дачка з зяцем перасталі гаварыць намёкамі, а зрабілі Яўгеніі Пятроўне афіцыйную прапанову звольніцца з працы і прысвяціць сябе выхаванню ўнукаў.

Для жанчыны гэта стала сапраўдным шокам. Яна ўжо тры гады атрымлівае пенсію, але на працы, у прыватнай фірме, застаецца паважаным чалавекам і добрым спецыялістам. І ў бліжэйшы час зусім не думала пакідаць любімую работу. Да таго ж Яўгенія Пятроўна — стройная, прывабная жанчына, ніхто ёй свой узрост не дае, і недзе глыбока ў душы такую прапанову яна ўспрыняла як сапраўдную крыўду. Пасля той непрыемнай размовы яна пачала яшчэ лепш сачыць за сабой, абнавіла што-кольвечы з гардэроба, стала затрымлівацца пасля працы, тым самым падкрэсліваючы, што ў яе можа быць асабістае жыццё. (Яўгенія Пятроўна паўтара дзясятка гадоў жыве адна.)

Дачка ў сваю чаргу таксама пакрыўдзілася. Яна стараецца лішні раз напомніць маці пра яе ўзрост, згадвае гісторыі сваіх сяброўак і знаёмых, якія даглядаюць старых і хворых бацькоў, пры гэтым не забывае зрабіць рэмарку, накшталт: бацькі пра дзяцей успамінаюць, толькі калі зусім расхварэюцца.

Цяпер маці і бабуля надта шкадуе, што адразу не размяняла кватэру, каб даць магчымасць маладым жыць асобна. Але да гэтай пары ўсё было так добра. І ўзаемаадносіны пакаленняў маглі служыць узорам для іншых. Яна раней жартавала: вопыт нашай сям'і можна абагульняць. А цяпер успамінае, з якімі цяжкасцямі даводзілася гадаваць дачку, калі працавала, вучылася завочна, бацькі жылі ў вёсцы, дапамагчы не было каму. І не разумее, чаму яе адзіная, любая дачушка вырасла эгаісткай, якая не лічыцца з інтарэсамі маці, а хоча пасадзіць яе за няньку. Зусім не старую жанчыну.

**Святлана ЯСКЕВІЧ**

■



■ Роздум пісьменніка

# НА ПАДВАКОННІ «АВЕРТОНА»

НЯДАЎНА 27 нобелеўскіх лаўрэатаў, у тым ліку па літаратуры, выступілі са зваротам адмяніць законы па забароне гей-прапаганды. Да месца будзе прыгадаць гістарычнае: адным з першых дэкрэтаў Савецкай улады, пасля бальшавіцкага перавароту 1917 года, з'явіўся дэкрэт аб грамадзянскіх шлюбах — у 1918 годзе. Ён адмяняў царкоўныя шлюбы і ў прыхаванай форме дазваляў гомасексуальныя адносіны. У новай уладзе прысутнічалі і прадстаўнікі секс-меншасці. У трыццатыя гады такія адносіны ўжо падпалі пад крымінальны артыкул.

Да нядаўняга часу гомасексуальныя адносіны былі ў нас і для нас даволі рэдкай і прыхаванай з'явай. Але час ішоў.

Неяк незаўважна грамадства многіх краін Старога свету, а таксама за акіянам, імкліва пакаціліся да маральнага краю, да радыкальнай адмовы ад традыцыйных каштоўнасцяў. Дык што: збываецца змрочнае прароцтва амерыканскага сацыёлага Джозефа Авертона? Ён загінуў на сорак трэцім годзе жыцця ў 2003 годзе.

Яго тэорыя — так званае «Акно Авертона» — раскрывае механізм паліттэхналогій па змене традыцыйных грамадскіх маральных стэрэатыпаў. Выказаная на рызыкоўнай мяжы славутай паліткарэктнасці, яна папярэджвае грамадства ад шляху ў бездань. Але ж ні яго тэорыя, ні самотныя галасы асобных маралізатараў не знаходзяць падтрымкі ў масавага чалавека, якім маніпулююць праз СМІ адпаведныя сілы. Чалавек з часам скараецца з усім. Мараль мутабельная? Цалкам верагодна, што надыходзіць час, калі так званыя «сексуальныя рэвалюцыі» 60-х гадоў мінулага стагоддзя, шматлікія наркаплыні, левыя рухі кшталту «хіпі» неўзабаве будуць успамінацца, як лёгкія праблемы са страўнікам у параўнанні з той глабальнай метафізічнай мутацыяй, што цяпер паўстае на даляглядзе.

Такія мутацыі рэдкія, але… усё можа быць. Тады і руйнуюцца ўсе магчымыя і немагчымыя перашкоды: палітычныя сістэмы, эстэтычныя і маральныя каноны.

ЦЯПЕР відаць, што ідзе менавіта да таго. Уздзеянне гомасексуальнай культуры, мыслення і паводзін на самыя розныя сферы спажывецкага соцыума пагрозліва ўзрастае. Шоу-бізнес з бясконцымі дураплясамі, «высокая мода», легітымізацыя аднаполых шлюбаў, апраўданне інцэсту, замахі на дзіцячую свядомасць, педафілія — гэта толькі пачатак! Можа здарыцца і такое: рана ці позна традыцыйныя формы шлюбу паміж мужчынамі і жанчынамі будуць проста забаронены! Адмова ж ад традыцыйных каштоўнасцяў між тым — спосаб калектыўнага самазабойства, пры якім той-сёй на нейкі час калі і выжывае ў нядоўгачасных абарончых рэзервацыях, дык народ проста вырадзіцца і загіне.

Скажаце — занадта змрочна?

Сёння надыходзіць канец антычнай цывілізацыі, хрысціянскім каштоўнасцям, канец Еўропе ўвогуле. І канец гэты — дурное пасмешышча. У баязлівых еўрапейцаў няма адказу на пагрозы. Яны нават не могуць вызначыць праблему ў адпаведных тэрмінах. А калі і вызначаць, то яе адразу гатовы забалбатаць левыя лібералы. Хіба што толькі ўльтраправыя здольныя на адказ — якія па сіле ўздзеяння на грамадства многім здаецца неадэкватным. Таму на іх увесь час рознымі спосабамі нацкоўваюць грамадскую думку.

У свеце ўвогуле ўзрастае ціск садамісцкага лобі. І ў прыватнасці, на культуру.

ВЯДОМЫЯ дураплясы і шансанье дэманструюць дзяцей, якія «вывяліся» з дапамогай прабірак, асобныя прадстаўнікі мастацтва не хаваюць сваіх заган, а выстаўляюць іх напаказ. Затое іх антыподы трапляюць пад уціск і цкаванне. Нават амерыканскі губернатар Арнольд Шварцэнегер, ён жа славуты «Тэрмінатар», кінаакцёр, які рэзка выказваўся супраць садаміі, у апошні час быў вымушаны ціха саступіць — нават даў дазвол на помнік нейкаму дзеячу, вядомаму сваёй нетрадыцыйнай сексуальнай арыентацыяй.

Варта было Алену Дэлону, аднаму з найпапулярнейшых французскіх кінаакцёраў усіх часоў, выступіць з гнеўнай прамовай у бок гомасексуалаў, як і ён трапіў пад нечуваны астракізм і цкаванне з боку левых сродкаў масавай інфармацыі.

Каралева Англіі праз 50 гадоў узнагароджвае вайсковага дэшыфроўшчыка-гомасексуала часоў вайны, які яшчэ ў пачатку 50-х адбываў тэрмін за педэрастыю.

Цкаваннем і пагрозамі ўжо не абмяжоўваюцца. Робяцца нават замахі на жыццё актыўных апанентаў — у першую чаргу некаторых прадстаўнікоў СМІ.

СТАН маралі імкліва дэградуе, апускаецца да цынічных выклікаў. Памятаю першыя музычныя еўра-шоу, якія праходзілі 20–30 гадоў таму. У Сан-Рэма, прыкладам, першае месца заняла сціпла адзетая італьянская дзяўчына, якая праспявала сваю славутую песню *Amore Romantica*. Песня адразу стала хітом.

Цяпер нагадайце, колькі хітовых песняў вы пачулі на Еўрабачанні ў апошні час?

Ніводнай.

Колькі выканаўцаў дэбютавала з далейшым творчым ростам?

Ніводнага.

Дзе песні на сваіх, нацыянальных мовах?

Няма.

Затое ўсе бачаць шоу трансвеститаў, фрыкаў, геяў і г. д. Вось і днямі еўрапейцы «ашчасліўленыя» — лепшая (ці лепшы?) выканаўца — гей, які ўяўляе барадатую жанчыну.

Дванаццаць краін Еўропы між тым адмовіліся ад удзелу ў гэтым сумнеўным шоу. Сярод іх Чэхія, Славакія, Турцыя, Балгарыя, Харватыя і іншыя.

Знаёмы літаратар з Барысава, які жыве цяпер за мяжой, нядаўна паскардзіўся ў размове:

— Педыкаў развялося зашмат. Шэсці свае ладзяць, парады, немаведама што.

— А як да гэтага царкоўнікі ставяцца? — цікаўлюся.

— Вядома, адмоўна.

— І што?

— Дык жа ж — дэмакратыя…

Гомасексуалізм стаў мінай замаруджанага ўздзеяння, своеасаблівым чарвяком, які падточвае чалавечы соцыум… Магчыма, адпаведна вядомаму трансгуманісту Ніку Бостраму, які сцвярджае, што мы, з вялікай доляй верагоднасці, знаходзімся ў камп'ютарнай сімуляцыі, у субматэрыі, што гэта нейкі збой у Праграме, у татальнай Матрыцы?

ГЕЙ-РУХ дыскрэдытуе і Захад, і Усход, бо ён па сваёй сутнасці — антычалавечны.

Але ж вяртаюся да тэмы, агучанай на пачатку: у якой ступені закрануў садамісцкі рух менавіта літаратуру, і не толькі сусветную, а і нашу — беларускую? Шматлікія творцы — за традыцыйныя каштоўнасці, на якіх трымаюцца дзяржава, народ, нацыя, сям'я. Вядомыя ў Еўропе, яны заклікаюць не даходзіць да краю. Так, Урсула Ле Гуін у сваім знакавым рамане «Левая рука цемры» малюе свет, у якім пражываюць генетычна мадыфікаваныя гермафрадыты — так званае бязгендарнае грамадства. Падзеяй стала некалькі гадоў таму антыўтопія Мішэля Уэльбека «Элементарныя часціцы» і г. д.

Але… Усё ж 17 нобелеўскіх лаўрэатаў падпісаліся пад лістом з просьбай адмяніць закон аб забароне гей-прапаганды сярод непаўналетніх. Сярод іх, на вялікае здзіўленне, такія імёны, як Дж. Кутзэе, Герта Мюлер і іншыя.

Дык што — «Акно Авертона»?

Некалькі гадоў таму Дж. Кутзэе, пісьменнік з ЮАР, надрукаваў раман «Ганьба» — («Бесчестье» — у расійскім перакладзе), пасля якога быў нават абвінавачаны левымі лібераламі ў расізме. Гэта цяжкі, змрочны і праўдзівы твор пра тое, якія бязмежныя злачынствы твораць у межах рэспублікі чорная большасць супраць нашчадкаў «бураў» — белага насельніцтва краіны. Няўжо ўціск левых цяпер аказаўся настолькі моцным, што пісьменнік паставіў свой подпіс пад сапраўды ганебным лістом?

Не менш таленавітая за яго і, безумоўна, вартая Нобелеўскай прэміі Герта Мюлер: нямецкая пісьменніца, якая спазнала часы дыктатуры ў Румыніі. Чаму і яна падпісалася? Мы, на жаль, можам толькі гадаць.

СПАКВАЛЯ смакуюць слізкую тэму і некаторыя нашы маладыя пісьменнікі. Але з часам яны могуць калі-нікалі зразумець, што так бы мовіць, «запляміліся» напоўніцу, але будзе ўжо позна. І нават талент, калі ён ёсць, ім не дапаможа. Кароткачасовы творчы эпатаж можа быць дасягнуты, нават ухвалены і ўзнагароджаны такімі-сякімі «гранта-грашыма». Але каб не адбылося так, што праз нейкі час аўтар кінецца па кнігарнях скупляць свае кнігі і паліць іх у печцы.

Вось, напрыклад, характэрны аповед маладога аўтара мужчынскага полу. Не хачу называць яго прозвішча. Бо, магчыма, ён яшчэ проста сам не разумее, што творыць, і яшчэ адумаецца.

Герой апавядання, нейкі Марцін, апынаецца недзе ў правінцыі — ці то ў пасёлку, ці ў вёсцы. З раніцы, пэўна, пасля «спайсу», у яго «праходзяць галюцынацыі», але «ў галаве адразу загудзела». Ён выходзіць на ганак, проста з яго «робіць сюсю» і думае пра тое, што «свабода і догмы — гэта супярэчнасць сама па сабе. І няма межаў на шляху ўнутранага вызвалення сваёй натуры — сацыяльнай, сексуальнай, ментальнай»… (!)

Мясцовыя мужыкі «у аблавухах», вядома ж, плююць і «смачна лаюцца, убачыўшы ў роднай вёсцы чалавека з залацістымі валасамі і вялізнай завушніцай».

А што б яны сказалі пра «танэлі» ў вушах ці «пелеле» ў роце? Урэшце, «блакітны» герой лічыць іх, вяскоўцаў, за «scheisse». Сам жа марыць пра нейкага Гюнтара, з якім расстаўся «з месяц таму». Той жа Гюнтар «часу не губляў ды неўзабаве павесіў на «Фэйсбуку» сваю фотку ў абдымках з нейкім дрэдзістым мулатам».

Герой жа не супакойваецца і «трызніць наяве». Яму здаецца, што ён ужо з нейкім Рудзі «адпачываюць на Мальце», дзе заадно «чытае даклад на канферэнцыі супраць дыскрымінацыі» (?!)

Потым зноў трызніць пра чарговага Штэфана, Гюнтара, Марціна. Гэты ўвішны і па тэксце даволі плюгавы карузлік надзявае чужую кашулю-вышыванку, якая яго «ўзбуджае», бо «прапахла прыемным водарам мужчынскага поту». Пра плюгавасць героя сведчыць тое, што «памер апранахі дазваляў выкарыстоўваць яе ў якасці паліто…» і г. д.

Прыклады можна было доўжыць, але… Мяркую, чытачы са здаровай грамадзянскай ментальнасцю не апусцяцца да ўспрыняцця такіх тэкстаў. Эпатажнасць ніколі не сведчыла пра наяўнасць літаратурных здольнасцяў. Тым больш у прапагандзе ўсялякіх вычварэнстваў.

**Юры СТАНКЕВІЧ**
**stankevichjury@tut.by**

■

# «ТОЛЬКІ З ТАБОЮ»

## Да 110-годдзя з дня нараджэння паэта-песенніка Адама Русака



**Па гарызанталі: 1.** Вёска на Капыльшчыне, малая радзіма паэта-песенніка Адама Герасімавіча Русака; у гэтай жа вёсцы нарадзіўся і паэт Анатоль Астрэйка. **4.** «О, як шчымліва і страсна ў маі\\пяе ... — адпявае\\чыёсь каханне». З верша Т. Дзям'янавай «На ўспамін». **7.** Старажытны металічны воінскі галаўны ўбор. **10.** «Па ваду дзяўчына ходзіць,\\... ў толк не дабярэ,\\Што калодзеж той з вадою\\У мілога на двары». З верша А. Русака «Па ваду дзяўчына ходзіць». **12.** Мужчына, які нядаўна ажаніўся. **13.** «Калі ... тваё\\Не палае агнём,\\Не кажы, не кажы». З песні «Не шукай» *(сл. А. Русака, муз. І. Любана).* **15.** Дзеўка на пары — ... на двары *(прык.).* **19.** Яда з дробна пасечанай агародніны, грыбоў. **20.** Рух на якім-небудзь транспарце. **22.** Птушка, вястун прыходу вясны. **23.** Страфа з дзевяці радкоў. **25.** «... Венера». Раманс М. Багдановіча. **26.** «Мая ...». Першы верш А. Русака, які ў 1927 годзе надрукавала газета «Чырвоны сейбіт». **32.** У мовазнаўстве наяўнасць у аднаго слова некалькіх значэнняў. **34.** Тлушч з насення раслін. **35.** Не чакай з ... дараванага хлеба (прык.). **36.** «Дзе ты, ... мая залацістая,\\На якой ты сцяжынцы згубілася?». З песні «Дзе ты, зорка мая?» *(сл. А. Русака, муз. І. Лучанка).* **37.** «І ..., і месяц май\\Я называю — квецень». З верша А. Астрэйкі «Квецень».

**Па вертыкалі: 2.** «Я ж казаў не для пацех,\\Эх, эх,\\Што люблю я не на ...,\\Эх, эх». З верша А. Русака «Як правёў мяне Цімох». **3.** «Закрасуйся, ...». Зборнік паэзіі А. Русака. **5.** «Ціха растрывожыла\\Думкаю — бяссонніцай\\Вечна неспакойная\\Ты, ... мая». З песні «Не за вочы чорныя» *(сл. А. Русака, муз. Ю. Семянякі).* **6.** «... любімы, мой родны,\\Ты на свеце свабодны». З песні «Лясная песня» *(сл. А. Русака, муз. Ул. Алоўнікава).* **7.** «Радасць і ... з табою дзяліць,\\Толькі з табою». З песні «Толькі з табою» *(сл. А. Русака, муз. І. Любана).* **8.** «Жыве, працуе мой народ,\\ці ў снежань, ці ў ...». З верша паэта «Мой край». **9.** Май — і пад кустом ... *(прык.).* 11. Цёмна-сіні колер. **14.** Тое, што і цукерка *(разм.).* **16.** Выдадзены твор. **17.** «Штодзень у капусце каб плавала скварка,\\А з ёй, калі трэба\\Знайшлася б і ...». З песні, якая стала амаль народнай — «Бывайце здаровы» *(сл. А. Русака, муз. І. Любана).* **18.** «Цеплынёй ... дыхнула -\\Засінелі кветкі». З верша «Вясёлка над полем» А. Бялевіча, якому 14 мая споўнілася б 100 гадоў з дня нараджэння. **21.** Тое, што і музыкант; выдатным ..., скрыпачом-самавукам, быў бацька паэта, Герасім Сямёнавіч, а Адам Русак быў ...-прафесіяналам. **24.** Беларуская газета, у якой друкаваліся раннія вершы паэта. **27.** «Пад ... баяна». Зборнік паэзіі А. Русака. **28.** Газета, у якой у 1932 годзе былі надрукаваны першыя вершы А. Русака *(абрэв.).* **29.** Бывае май, што коням сена дай, а сам на ... уцякай *(прык.).* **30.** Пры ўказанні на тэмпературу паветра абазначае: ніжэй нуля. **31.** Чужы кажух ... не грэе *(прык.).* **33.** Сельскагаспадарчая ручная прылада.

**Склаў Лявон ЦЕЛЕШ.**
*г. Дзяржынск.*

**ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ:**

**Па гарызанталі:** 1. Пясочнае. 4. Салоўка. 7. Шлем. 10. Маці. 12. Маладажон. 13. Сэрца. 15. Сваты. 19. Ікра. 20. Язда. 22. Грак. 23. Нона. 25. Зорка. 26. Песня. 32. Полісемія. 34. Алей. 35. Неба. 36. Радасць. 37. Лістапад.

**Па вертыкалі:** 2. Смех. 3. Нёман. 5. Любоў. 6. Край. 7. Шчасце. 8. Май. 9. Рай. 11. Індыга. 14. Цукерак. 16. Выданне. 17. Чарка. 18. Вясна. 21. Музыка. 24. «Звязда». 27. Голас. 28. «ЛіМ». 29. Печ. 30. Мінус. 31. Цела. 33. Серп.

## Усходні гараскоп на наступны тыдзень

**АВЕН.** Добры тыдзень для людзей творчых прафесій. Магчыма, давядзецца даказваць свой высокі прафесіяналізм. Будзьце больш разняволенымі, кантактнасць спатрэбіцца. Больш уважліва сачыце за навінамі, так вы не прапусціце важнай інфармацыі. Бурная прафесійная дзейнасць можа быць крыху парушаная ў перыяд з чацвярга па пятніцу бытавымі пытаннямі.

**ЦЯЛЕЦ.** У сферы прафесійнай дзейнасці і творчых пошукаў тыдзень павінен быць вельмі спрыяльным, але, перш чым што-небудзь прадпрымаць, неабходна многае прадумаць. Паспрабуйце быць асцярожнымі і прыслухоўвайцеся да голасу інтуіцыі. Вам прадставіцца магчымасць наладзіць карысныя сувязі і кантакты. У пачатку тыдня не варта кіравацца парадамі знаёмых, нават вельмі ўплывовых людзей, — вырашайце ўсе праблемы самі. Але ўжо ў пятніцу вы зможаце разлічваць на дапамогу сяброў.

**БЛІЗНЯТЫ.** Можа не пашанцаваць у рызыкоўных задумах, устрымайцеся ад іх. Паспрабуйце як мага больш быць дома, далей ад натоўпу, і пазбягайце масавых мерапрыемстваў, бо сярод людзей вы можаце прыцягваць да сябе небяспечных суседзяў. Чакаюцца цікавыя сустрэчы і прыемныя сюрпрызы, а праца будзе прыносіць чаканыя вынікі.

**РАК.** Прыйшоў час зрабіць над сабой намаганне і самаахвярна адпачыць. Без сумнення, бескарыслівае служэнне блізкім і каханым людзям — справа высакародная, але і ў ёй часам трэба рабіць перапынкі. Некаторыя ўжо на гэтым тыдні могуць заняцца маштабным пераўтварэннем у сваёй справе. Але не варта зацыклівацца на пытаннях матэрыяльных выгод, успомніце і пра духоўнае.

**ЛЕЎ.** Тыдзень удалы ва ўсіх адносінах. Пэўныя цяжкасці верагодныя ў аўторак, але яны лёгка пераадольваюцца. Прыслухоўвайцеся да голасу інтуіцыі, яна цяпер не падмане. Прызначаючы час для сустрэч, абавязкова ўлічыце верагоднасць форс-мажорных абставін. Калі не будзеце паспяваць да пэўнай гадзіны, то вашых тлумачэнняў ніхто асабліва слухаць не стане, так што ёсць сэнс паклапаціцца пра гэта загадзя.

**ДЗЕВА.** Верагодная нечаканая сітуацыя, якая адбярэ ў вас каштоўны вольны час і прымусіць перамяніць старанна прадуманыя планы. Не выключаны і некаторыя ўскладненні ў сяброўскіх стасунках — паспрабуйце растлумачыць непаразуменні, якія ўзніклі. Пажадана ўспомніць і аднавіць знаёмствы і старыя сувязі, якія напаўзабыліся па розных прычынах. Дазвольце сабе адцягнуцца ад прафесійнай дзейнасці, набудзьце што-небудзь новенькае з хатняй маёмасці, прадумайце да дробязяў вашу вопратку і аксесуары.

**ШАЛІ.** Магчыма, вам будзе здавацца, што свет не ацаніў вашы таленты і здольнасці па вартасці. Нават калі так яно і ёсць, то гэта яшчэ не падстава зацыклівацца на сваіх прэтэнзіях. Дэманстрацыя крыўды не дапаможа дамагчыся прызнання і павагі, з гэтым справяцца карэктнасць, цярпенне і тактоўнасць. Ігнаруйце другарадныя дробязі і засяродзьцеся на галоўным, інакш вы можаце ўпусціць залатую рыбку.

**СКАРПІЕН.** Вы зможаце дамагчыся шмат чаго, калі не станеце ленавацца і трохі паскорыце разумовы працэс, тым самым атрымаеце спрыяльную магчымасць змяніцца ў лепшы бок. Будзьце таварыскія і адкрытыя новым сустрэчам і знаёмствам. Не давярайце чуткам, інакш уласнаручна разбурыце адносіны са сваякамі. Усе цяжкасці, якія ўзнікаюць на шляху, вы павінны пераадолець самастойна. Будзьце маральна гатовыя атрымаць важную навіну, якая можа перавярнуць усё жыццё.

**СТРАЛЕЦ.** Часам зусім няма сэнсу супраціўляцца нейкім акалічнасцям і спрабаваць што-небудзь змяніць. Для вас надышоў той момант, калі лепш плыць па цячэнні, гэта сэканоміць сілы і час. У аўторак і чацвер пажадана ўстрымацца ад якіх бы то ні было рашучых дзеянняў. Блізкім людзям будзе неабходная падтрымка і дапамога, надайце ім больш увагі, але не дазваляйце грузіць на вас усе свае праблемы.

**КАЗЯРОГ.** Пажадана засяродзіцца на сваіх абавязках. Серада, як відаць, будзе клопатная: давядзецца ўладжваць праблемы на працы або звязаныя з людзьмі вашага асяроддзя і тэрмінова вырашаць важныя пытанні. У чацвер прасцей пагадзіцца на варыянт, які не вельмі задавальняе вас, і не ісці адкрыта супраць грамадскай думкі, бо даказаць большасці, што вы маеце рацыю, будзе амаль немагчыма. Ваша мэтанакіраванасць дазволіць дасягнуць значна большых вынікаў, чым вы разлічвалі. І майце на ўвазе, што нядзельны паход у госці ці на вечарыну можа аказацца стомным.

**ВАДАЛЕЙ.** Давядзецца шмат працаваць, але вынікі абавязкова парадуюць. Самымі напружанымі днямі могуць аказацца панядзелак і аўторак. У сераду не згаджайцеся ні з якімі авантурнымі прапановамі. У другой палове тыдня не пашкадуеце аб выдаткаваных сілах, а начальства будзе вамі вельмі задаволена. Выкарыстоўвайце свае аналітычныя здольнасці і выяўляйце паменш эмоцый.

**РЫБЫ.** Будзьце асцярожныя ў словах, інакш можа ўзнікнуць канфліктная сітуацыя з начальствам. Пераключыцеся на творчую працу, яна будзе станоўча ўплываць на настрой і працаздольнасць. У сераду, магчыма, давядзецца адстойваць перад навакольнымі новыя ідэі. Паспрабуйце быць мудрымі і выключыце з іх элемент авантурызму, нічога добрага ён вам не прынясе. На чацвер можна запланаваць рашучыя дзеянні ці пачатак новай справы, выкарыстоўвайце гэты спрыяльны час і не выпускайце свой шанц.

## ХАТНЯЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

### ШАШЛЫЧНЫЯ ТОНКАСЦІ

### Правілы марынавання

**Аматары пікнікоў выдатна ведаюць, што смачны шашлык можна прыгатаваць не толькі з бараніны, але і з свініны або ялавічыны. А шашлычкі з рыбы, курыных галёнак або крылцаў — хіба гэта не смаката? Каўбаскі, сасіскі і сардэлькі, свіныя і барановыя рабрынкі можна падсмажыць на вугалях, і будзе вельмі смачна. Марынаваць мяса можна ў пластыкавым, шкляным, керамічным або эмаліраваным посудзе і нельга ў алюмініевым, бо кіслата раз'ядае метал і псуе смак прадукту. Замарынаванае мяса можа захоўвацца ў халадзільніку даволі працяглы час.**

#### ВА ЎЛАСНЫМ СОКУ



Нарэзанае кавалачкамі мяса складаюць у ёмістасць, кожны слой засыпаючы кольцамі рэпчатай цыбулі, пасыпаюць трохі чорным перцам і апырскваюць вінным воцатам. Мяса марынуецца, так бы мовіць, ва ўласным соку і можа захоўвацца ў халадзільніку даволі працяглы час.

#### З ВОЦАТАМ

**Спатрэбіцца:** *па 1 шклянцы воцату і вады, 3-4 рэпчатыя цыбуліны, 1 ч. лыжка солі, 0,5 ч. лыжкі цукру, 1 лаўровы ліст, чорны перац гарошкам і чорны молаты перац на смак.*

Цыбулю ачысціць і нашаткаваць паўколцамі. Змяшаць мяса, нарэзанае кавалачкамі, з цыбуляй, перцам і лаўровым лістом. Соль і цукар развесці ў вадзе, дадаць воцат і заліць мяса.

#### ІНДЫЙСКІ МАРЫНАД

*(гэты марынад лепш за ўсё спалучаецца з мясам курыцы і баранінай).*

Змяшаць 250 г сметанковага ёгурту і 50 г алею, дадаць 1 ч. лыжку кары, 1 ч. лыжку кмену, чорны молаты перац і здробнены імбір на смак. Калі пад рукой няма свежага кораня імбіру, то падыдзе і сухі молаты.

#### УЗБЕКСКІ МАРЫНАД

Кефір развесці цёплай зялёнай гарбатай і замарынаваць у гэтай сумесі нарэзаныя кавалачкі мяса. А рэпчатую цыбулю нарэзаць тонкімі кольцамі, пасыпаць чорным молатым перчыкам і заліць воцатам. Гэта будзе дадаткам да шашлычка.

#### ХУТКІ

*(падыходзіць для любога мяса, курыцы, рыбы)*

Робіцца на месцы, пакуль рыхтуецца мангал. Нарэзанае мяса пасаліць, паперчыць чырвоным молатым перцам, змяшаць з нарэзаным зяленівам кінзы і базіліку.

### ХУТКАЯ ДАПАМОГА

### Джала і не толькі



**Наступствы ўкусу насякомага залежаць, па-першае, ад яго віду, а па-другое, ад індывідуальных асаблівасцяў арганізма пэўнага чалавека. Бо рэакцыю выклікае не сам факт укусу, а рэчывы, якія насякомыя ўводзяць падчас яго, у выніку чаго могуць праявіцца алергічныя рэакцыі рознай ступені цяжару.**

Пчолы, восы, шэршні джаляць у мэтах самаабароны. З укусам у арганізм чалавека трапляе яд, які складаецца з бялкоў і іншых кампанентаў, што з'яўляюцца моцнымі алергенамі, таму скура адказвае на ўвядзенне гэтых рэчываў пачырваненнем, болем і прыпухласцю. Прычым рэакцыя на пранікненне ядаў гэтых насякомых у арганізм вельмі хуткая (20 хвілін і менш).

**Першая дапамога.** *Адразу ж пасля ўкусу пчалы, асы, шэршня неабходна асцярожна, не спяшаючыся, выцягнуць джала, калі яно засталося ў ранцы. Затым для дэзінфекцыі накласці ватны тампон, змочаны настойкай календулы, перакісам вадароду ці спіртазмяшчальнай вадкасцю. Для здымання ацёку і прадухілення яго развіцця прыкласці да месца ўкусу лёд. Можна таксама выкарыстоўваць кавалак сырой, разрэзанай напалову бульбіны ці памідора або пакласці на месца ўкусу лісточкі здробненай пятрушкі — гэта дапаможа зняць боль і прыпухласць. Для прадухілення алергічнай рэакцыі лепш за ўсё прыняць антыгістамінны прэпарат. Падобным чынам можна рабіць і пры ўкусе мурашак.*

Аднак калі насякомае ўджаліла ў рот, твар ці галаву, аказаўшы першую дапамогу пацярпеламу, варта абавязкова выклікаць «хуткую дапамогу», бо такі ўкус можа стаць прычынай удушша. Таксама па кваліфікаваную дапамогу неабходна звярнуцца пры распаўсюдзе ацёку ці высыпкі на розныя часткі цела, апуханні твару, галавакружэнні ці галаўнога болю, млоснасці, ванітах, дыхавіцы і болі ў грудзях.

### ВАРТА ПРЫСЛУХАЦЦА



Для аздаблення лазні ўсярэдзіне лепш выкарыстоўваць матэрыял з такіх парод дрэў, як таполя, алешына ці асіна, бо яны валодаюць высокай вільгацятрываласцю і слабой цеплаправоднасцю. Рэкамендуецца падлогі рабіць таксама з дрэва, паколькі яно слаба награваецца. Але дрэва мае схільнасць да гніення, таму лепш зрабіць разборную падлогу і хоць бы раз на год яе ветрыць і прасушваць на сонцы.

## Даты | Падзеі | Людзі

*Дзень славянскага пісьменства і культуры. Адзначаецца ў гонар славянскіх асветнікаў і прапаведнікаў хрысціянства Кірылы і Мяфодзія, якія далі славянскаму свету кірыліцу (863 год) і заклалі падмурак многіх славянскіх літаратур.*

**1113** год — нарадзіўся Кірыла Тураўскі, вядомы ўсходнеславянскі царкоўны дзеяч і багаслоў. Быў добра адукаваным чалавекам свайго часу. Рана пастрыгся ў манахі. З'яўляючыся тураўскім епіскапам, праславіўся як выдатны прапаведнік. Нашы далёкія продкі называлі Кірыла Тураўскага «Златоуст, паче всех воссиявший нам на Руси». Да нас дайшло 70 яго твораў. Існуе гіпотэза, што славутае «Слова пра паход Ігараў» напісана таксама Кірылам Тураўскім. У канцы 1170-х гадоў адышоў ад спраў і прыняў вялікую схіму. Апошнія гады жыцця правёў у Барысаглебскім епіскапскім манастыры. Памёр пасля 1190 года. Кананізаваны Рускай Праваслаўнай Царквой. У 1984 г. прылічаны да Сабору беларускіх святых.

**1904** год — 110 гадоў таму нарадзіўся (вёска Пясочнае, цяпер Капыльскі раён) Адам Герасімавіч Русак, паэт, заслужаны дзеяч культуры Беларусі (1964). У 1930 годзе скончыў Беларускі музычны тэхнікум, у 1934-м — Ленінградскую кансерваторыю. Працаваў салістам аркестра Ленінградскага Малога опернага тэатра, Белдзяржфілармоніі. Аўтар кніг паэзіі «Песні і вершы», «На родных нівах», кніг вершаў для дзяцей «У Буслоўцы», «Добра ведаю ўрок». Шырока вядомыя песні на вершы Русака «Бывайце здаровы», «Лясная песня», «Толькі з табою» і многія іншыя. Памёр у 1987 годзе.



**1911** год — мінчане ўпершыню назіралі палёты аэраплана над горадам. Іх здзейсніў легендарны рускі лётчык С.І. Утачкін. Палёты былі зняты для кінематографа ўласным апаратам кінатэатра «Гігант», суправаджаліся такім ажыятажам сярод насельніцтва (які падаграваўся газетамі), што толькі дзякуючы салдатам аэраплан і сам авіятар не пацярпелі. Дарэчы, першае паспяховае авіяшоу ў Мінску аб'ядналася з адной таксама прэм'ернай для горада падзеяй. Гістарычная хроніка Мінскай гарадской станцыі хуткай медыцынскай дапамогі так паведамляе пра гэты факт: «20 мая 1911 года мінская суполка сясцёр міласэрнасці Чырвонага Крыжа атрымала з Вены першы аўтамабіль хуткай дапамогі» (у нашым горадзе спецыялізаваная санітарная аўтамашына з'явілася раней, чым у Пецярбургу, Маскве, Кіеве). А 24 мая ў мэтах папярэджання магчымай аварыйнай небяспекі палёту Утачкіна санітарны аўтамабіль зрабіў свой першы выезд на Камароўскае поле. У машыне дзяжурылі лекар Франц Станіслававіч Петрасевіч (вядомы ў горадзе спецыяліст па нервовых і душэўных хваробах) і дзве сястры міласэрнасці. На шчасце, палёты Утачкіна не запатрабавалі медыцынскай дапамогі».

**НАРОДЖАНЫЯ 24 мая**

**Гэтыя людзі маюць свой пункт гледжання на любое пытанне, аднак іх галоўны інтарэс — сфера грамадскага будаўніцтва. Яны валодаюць жывым розумам і вострым языком, апынуўшыся ў цэнтры грамадскай увагі, перавагу аддаюць разумнай стрыманасці. Яны добра валодаюць мовай і ўмеюць заваёўваць сімпатыі аўдыторыі. Ім неабходна пазбягаць ментарскага тону, імкнуцца максімальна разрадзіць напружаную атмасферу, утвораную побач. У гэтым сэнсе немалаважную ролю можа адыграць здаровае пачуццё гумару.**

**НАРОДЖАНЫЯ 25 мая**

**Па сваёй прыродзе гэта барацьбіты, якія могуць змагацца як за справу, так і за ідэю. Яны па-сапраўднаму цэняць грошы, дарагую вопратку і іншую мішуру жыцця, ніколі не ідуць на кампрамісы. Ім неабходна навучыцца цярплівасці і быць памяркоўнымі да іншых. Яны высока цэняць увагу і пяшчотныя адносіны, але самі з цяжкасцю выражаюць і прымаюць гэтыя пачуцці. Чым бы яны ні займаліся (мастацтва, спорт, работа), усё выконваецца прыгожа і прафесіянальна.**

Организация ЗАКУПИТ в больших объемах ОХЛАЖДЕННУЮ, ЗАМОРОЖЕННУЮ СВИНИНУ у ИП и юр.лиц по безналичному расчету ДОРОГО.
ООО "Евроторг" УНП 101168731
8 (044) 7888 503

## СЁННЯ

| Сонца | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 4.54 | 21.20 | 16.26 |
| Віцебск — | 4.36 | 21.17 | 16.41 |
| Магілёў — | 4.44 | 21.10 | 16.26 |
| Гомель — | 4.48 | 20.58 | 16.10 |
| Гродна — | 5.11 | 21.34 | 16.23 |
| Брэст — | 5.19 | 21.26 | 16.07 |

**Месяц**

***Апошняя квадра 21 мая. Месяц у сузор'і Авена.***

**Імяніны**

***Пр.*** *Аляксандра, Іосіфа, Кірылы, Мяфодзія, Расціслава.* ***К.*** *Жанны, Зузанны, Магдалены, Марыі, Вінцэнта.*



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

## ЗАЎТРА




### ...у суседзяў

| | | |
|---|---|---|
| ВАРШАВА +25..+27°С | КІЕЎ +25..+27°С | РЫГА +26..+28°С |
| ВІЛЬНЮС +25..+27°С | МАСКВА +26..+28°С | С.-ПЕЦЯРБУРГ +21..+23°С |

## УСМІХНЕМСЯ

Яна і ён.
— Калі станем мужам і жонкай, я буду даглядаць дом, а ты?
— Буду есці мяса!
— А з карыснага?
— Агародніну.

**Эканомны чалавек ніколі проста так не мые посуд. Ён мые яго, калі надышоў час мыць рукі.**

— Унучак, ідзі есці! Ежа на стале!
— Іду, бабуля...
Унук устае з-за камп'ютара і ідзе на кухню. Бабуля хутка садзіцца на яго месца:
— Паверыў, дурненькі!

**Напэўна, у кожнага ёсць сябар, які псуе фотаздымкі. Звычайна ён называе сябе фатографам.**




caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 38, 287 17 21, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Магілёве: 32 74 31, па Мінскай вобл.: (017) 292 21 03; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by,
(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень. Тыраж 20.746. Індэкс 63850. Зак. № 2059.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 23 мая 2014 года.